Янка Лялевіч Ігар Трусаў Андрэй Чарнякевіч

Ад Каложы да фартоў:
гістарычная спадчына Гродна



Янка Лялевіч Ігар Трусаў Андрэй Чарнякевіч

Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна

гісторыка-архітэктурны
энцыклапедычны даведнік

Мінск · Лімарыус · 2008

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
Л 97

На вокладцы выкарыстаны малюнкі *Напалеона Орды*

Лялевіч, Я.

Л 97 Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гісторыка-архітэктурны энцыклапедычны даведнік / Янка Лялевіч, Ігар Трусаў, Андрэй Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008. – 92 с.

ISBN 978-985-6740-80-3.

Гарадскія вуліцы — гэта найперш будынкі, якія гэтыя вуліцы і фармуюць. Таму ў нашым даведніку мы паспрабавалі згадаць усе больш-меньш цікавыя гістарычныя пабудовы Гродна.

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)

ISBN 978-985-6740-80-3

© Укладанне. Калектыў аўтараў, 2008

Ад аўтараў

Кніга, што шаноўны чытач трымае ў руках, з'яўляецца вынікам агульнай працы людзей зусім розных пакаленняў. У кожнага з нас свае інтарэсы, свой асабісты досвед і погляд на жыццё. Мы вельмі рэдка сустракаемся адзін з адным, а сустрэўшыся, бывае, — не заўсёды знаходзім агульную мову. Але ёсць нешта, што робіць нас аднадумцамі, прымушае забыцца на розніцу ва ўзросце і ўласныя штодзённыя клопаты. Гэта цікавасць да мінулага нашага Гродна, адчуванне «скурай» пульсу гэтага месца і пачуццё адказнасці за ягоны лёс.

Насамрэч, падобных людзей даволі шмат. Нашыя тэксты былі б не поўнымі альбо не з'явіліся б наогул, калі б не такая ж апантанасць у захоўванні гістарычнага факта з боку Ю. Гардзеева, А. Госцева, М. Ігнатовіча, В. Сабалеўскай, А. Краўцэвіча, С. Сяльверставай, С. Марозавай, В. Чарапіцы, В. Шведа, Т. Маліноўскай, А. Мілінкевіча, Ю. Кішыка, А. Вашкевіча, І. Лапехі, Ю. Гуменюка, У. Лісіцына, В. Карнелюка, С. Данскіх, Р. Акінчыца, П. Баровіка, Е. Мілеўскага, Е. Пашэнды ды шмат каго яшчэ. Мы зусім не першыя, а толькі працягваем працу, пачатую нашымі папярэднікамі — Е. Арлоўскім, Ю. Ядкоўскім, М. Вароніным, Е. Квітніцкай…

Яшчэ больш тых, каму проста цікава даведацца аб нейкім чарговым невядомым факце з мінулага гэтых старых камяніц і пляцаў, людзей, што адчуваюць надзвычайны сентымент і прывязанасць да гродзенскай брукаванкі, касцельных вежаў, Каложы, да гарадскіх сквераў і паркаў, проста да жыцця тут. Пералік таго, што прывязвае нашае сэрца да Гродна, сапраўды вялікі. Часамі нават падаецца, быццам багацце гэтага горада і сапраўды бясконцае, невычарпальнае.

На жаль, гэта не так. І зараз, можа, лепш чым калі небудзь, мы пачалі гэта адчуваць. З вялікім спазненнем, паволі да нас прыходзіць разуменне, што Гродна — гэта не толькі храмы і замкі, але і шараговыя камяніцы, дзе, магчыма, жылі зусім звычайныя людзі; што, губляючы па некалькі дзесяткаў гістарычных будынкаў у год няхай з пяціста ці нават тысячы, мы даволі хутка страцім усё. Нарэшце, адзінае, што нас усіх аб'ядноўвае — гэта ўласна вуліцы старога Гродна, на якіх мы часамі сустракаемся…

Гарадскія вуліцы — гэта найперш будынкі, якія гэтыя вуліцы і фармуюць. Таму ў нашым даведніку мы паспрабавалі згадаць усе больш-меньш

цікавыя гістарычныя пабудовы Гродна, частка з якіх, на жаль, паступова знікае не толькі з гарадскіх планаў, але і з памяці гараджан. А распавесці ёсць пра што, бо шмат з якімі гродзенскімі камяніцамі звязаны лёсавызначальныя падзеі беларускай гісторыі, іншыя з'яўляюцца часткай ідэнтычнасці нашага горада.

Гістарычныя звесткі пададзены ў альфабетычным парадку згодна з сённяшнімі назвамі вуліц і сучаснай нумарацыяй будынкаў на іх. Па магчымасці, падаецца і пералік папярэдніх назваў вуліц у парадку іх з'яўлення. На жаль, у большасці выпадкаў мы не маем дакладных даных аб часе пабудовы кожнага з дамоў, іх гаспадарах і установах, што там знаходзіліся. Таксама і стыль пабудовы шмат дзе можна вызначыць даволі ўмоўна, сыходзячы з суб'ектыўных крытэрыяў. Акрамя гэтага, аўтары палічылі патрэбным згадаць некаторыя помнікі, якія перасталі існаваць, лакалізуючы іх, дзе гэта ўдалося, па сучасных адрасах…

Галоўная мэта нашага выдання — паспрыяць актыўнаму ўзаемадзеянню грамадства, дзяржаўных структураў, бізнесу ў напрамку рацыянальнага і максімальна эфектыўнага выкарыстання гістарычнай прасторы гэткага унікальнага месца, якім з'яўляецца Гродна.

І ўсё ж такі гэты даведнік — усяго толькі пачатак вялікай працы, толькі спроба ацаніць нашае агульнае «месца памяці», тую спадчыну, што дасталася сённяшнім гродзенцам і пра якую мы ўсе павінны дбаць, каб не страціць свайго аблічча…

«...Кожная вулачка, амаль кожны дворык старога Гродна мае сваю гісторыю. Іх пачаткі сягаюць часам нават у вельмі далёкае мінулае. Разам з тым, як шоў час, з'яўляліся новыя будынкі, новыя плошчы і новыя вуліцы — адначасова старая постаць горада з кожным днём заціралася ўсё больш, пераходзячы з рэчаіснасці ва ўспаміны...»

J. Jodkowski «Grodno». Str. 76.

Ва ўзнікненні назваў гарадоў на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў X–XII стст. наглядаецца пэўная заканамернасць: у значнай колькасці яны паходзілі ад назвы малой ракі на месцы ўпадзення якой у больш вялікую і стаяў горад. Так на сутоцы Полаты і Дзвіны ўзнік Полацеск, цяпер Полацк; на месцы, дзе Віцьба ўпадае ў Дзвіну — Віцебск; на месцы сутокі Менкі са Свіслаччу, відавочна, знаходзілася першае пасяленне, якое ў будучым стала Менскам, а сёння Мінскам; там, дзе Ваўковыя ўпадае ў Рось, паўстаў Ваўкавыск. Дарэчы, на месцы ўпадзення ракі Вільня ў Нярыс (Вілія) узнік горад Вільня.

Існуе цэлы шэраг версіяў назвы «Гродна», дакладней, старажытных славянскіх варыянтаў, вядомых з летапісаў — Городзен і Горадня. Мы не збіраемся, у дадзеным выпадку, праводзіць дыскусію гістарычна-палітычнага характару, аспрэчваючы ўжо вядомыя версіі ўзнікнення назвы. Папросту мы хочам прапанаваць свой варыянт ўзнікнення назваў «Горадзен», «Горадня», які, на нашу думку, дастаткова праўдападобны, паколькі ён цалкам стасуецца з этымалогіяй узнікнення назваў іншых сярэднявечных беларускіх гарадоў.

Гідронімы наваколляў Гродна маюць розную моўную аснову: Котра — балцкую, Гожа, хутчэй за ўсё, таксама. Ласосна — фінаўгорскую. Раку, на месцы ўпадзення якой у Нёман і было заснавана Гродна, цяпер называюць Гараднічанкай. У XVIII ст. яе называлі Гарадніца, а ў XVI ст., відавочна, ад самага пачатку існавання паселішча, — Горадня.

Назва гэтая, безумоўна, славянская, якая, дарэчы, супадае з адным з летапісных варыянтаў. Тое, што не захавалася больш ранняя, балцкая ці фінаўгорская, назва ракі, можа, між іншым, азначаць, што тэрыторыя, на якой было заснавана сучаснае Гродна, адваяваная ў мясцовых балцкіх плямёнаў узброеным шляхам. Славянская назва — Горадня азначае, што рака была неаднаразова перагароджана «езамі» або «язамі» — стацыянарнымі рыбалоўнымі ўлоўкамі. Калі прыняць наш варыянт узнікнення

назвы Гродна, то горад на месцы ўпадзення ракі Горадні ў Нёман меў бы назву «Горадзенск» ці «Горадзен» — апошняя і фігуруе ў старажытнарускіх летапісах.

Новастварэныя ўсходнеславянскія гарады складаліся, як правіла, з умацаванага «горада» і неўмацаванага вакольнага горада непадалёку. У Гродне XII ст. «горад» размяшчаўся на тэрыторыі Старога замка, а вакольны горад — на месцы Новага замка. Пазней вакольны горад быў таксама абнесены мураванымі сценамі, а дзеля таго, каб адрозніваць два «горады», сталі ўжываць назвы «Верхні горад» і «Ніжні горад», якія ў XV ст. былі перайменаваны ў «Верхні замак» і «Ніжні замак». Тэрыторыя, якая знаходзілася ніжэй замкаў, называлася «Падзамча» і ў сваю чаргу ўваходзіла састаўною часткаю ў Падол — квартал горада, які размяшчаўся ўздоўж Нёмана на прыбярэжных тэрасах вышэй па цячэнні таго месца, дзе Гараднічанка ўпадала ў Нёман.

Вышэйпералічаныя старажытныя тапонімы Гродна зніклі з ужывання ў розны час, хіба што ў назве вуліцы Падольнай чытаюцца сляды тапоніма «Падол».

Магчыма, ужо ў XII ст. з'явіўся тапонім «Курган», які хутчэй за ўсё азначаў месца пахавання язычнікаў — жыхароў Гродна, якія доўгі час жылі разам з хрысціянамі. Яшчэ на пачатку XIX ст. існавала «Вулачка на Курган» — завулак у раёне вуліц Свярдлова і Парыжскай камуны, якая і сведчыла аб назве гэтага тапоніма. Цяпер гэтая тэрыторыя занята пасляваеннымі забудовамі.

Хутчэй за ўсё ў часы паміж панаваннем князёў Гедыміна і Вітаўта ўзнікла назва «Нямецкі рынак», аднак нельга выключаць і ранейшае ўзнікненне гэтай назвы, паколькі ў мове XII ст. «немцам» называлі кожнага неславяніна. Як бы там ні было, «Нямецкі рынак» існаваў у Гродне і ў XIV–XIX стст., напачатку XX меў назву «Казіны рынак». Месца гэта і сёння лёгка вызначыць — гэта заасфальтаваная пляцоўка ў раёне вуліц Вялікая і Малая Траецкая, праз дарогу ад вуліцы Дамініканскай.

Барысаглебскую царкву XII ст. жыхары Гродна больш ведаюць як Каложскую царкву. Існуе ўжо амаль легенда, згодна з якой пасля аднаго з паходаў на Пскоў, не заваяваўшы самога горада, князь Вітаўт прывёў з разрабаванага прыгарада Пскова — Каложы — практычна ўсіх ягоных жыхароў і пасяліў на велікакняскай зямлі насупраць замка. Так з'явілася прадмесце Каложа, а старажытная царква атрымала другую назву — Каложская.

Каложскае прадмесце ад другога, не менш старажытнага прадмесця — Сухога Сяла — аддзяляў роў, накіраваны ў бок Гараднічанкі, які і зараз «чытаецца» ў Новым парку на поўдзень ад Палаца піянераў. Сухое Сяло згадваецца ў дакументах напрыканцы XV–XVII стст. Месціласа яно ад згаданага рова ў Новым парку да сучаснай вуліцы Віленскай.

Як ужо было сказана вышэй, Гарадніцай называлі ў XVIII ст. раку Гараднічанку. Акрамя таго, прыкладна з канца XV ст. пад назвай «Гарадніца» ў дакументах згадваецца велікакняская вёска і двор каля Гродна. Менавіта на гэтай тэрыторыі Антоні Тызенгаўз і пабудаваў свой «ідэальны горад». Аднак тапонім «Гарадніца» больш старажытны і не выключана, што вёска Гарадніца ўзнікла ўжо ў XII ст. У XV–XVII стст. часта замест «двара» ў дакументах згадваецца драўляны «Замак на Гарадніцы», які даволі падрабязна апісаны ў інвентарах. Гэты аб'ект знаходзіўся, хутчэй за ўсё, на тэрыторыі сучаснага парку Жылібера недзе ў раёне старога фантана.

Шмат хто з гараджан, гуляючы ўздоўж набярэжнай, звярталі ўвагу на назву вуліцы Рыбацкая. Згодна з дакументамі пачатку XVI ст. гэтае месца называлася Рыбацкая слабада і знаходзілася на «замкавай юрыздзіцы», г. зн. па-за юрысдыкцыяй гарадскіх уладаў Гродна. Трэба думаць, што тапонім яшчэ больш старажытны, паколькі прывілеі пастаўшчыкам рыбы ў Гродзенскі замак называюцца ў дакументах пачатку XVI ст. як «даўнія».

Цэлы шэраг тапонімаў ўпершыню сустракаецца ў «У валочнай памеры гор. Гродна», у судовых дакументах першай паловы XVI ст., а таксама ў тэксце да гравюры М. Цюнта па малюнку Адэльгаўзера 1567 г.

Аднак гэтыя тапонімы адносяцца да больш старажытнага паходжання. Да іх, напрыклад, можна залічыць «Звярынец» — месца, дзе ў загонах утрымлівалася жывёла для палявання Вялікіх князёў. Даследчык архітэктуры Гродна Е. Квітніцкая трапна ўказвае, што ў 1560 г. ён знаходзіўся ў пойме тэрасы Нёмана — там, дзе сёння занёманская набярэжная, ніжэй францысканскага касцёла. У дакументах XVI ст. «звярынец» называецца «закінутым». Чаму? Дэталёвае вывучэнне картаграфічных матэрыялаў XVIII–XIX стст. дазволіла зрабіць выснову, што ў XII–XV стст. на Нёмане, насупраць Верхняга і Ніжняга горада, знаходзілася два востравы. На адным з іх, які ў XVI ст. злучыўся з берагам пад сучасным францысканскім касцёлам, і месціўся ў XIV–XV стст. «Звярынец». Другі востраў быў злучаны з берагам у XIX ст. штучна. Цяпер там затон рачнога пор-

та. На нашу думку, менавіта на гэтых двух астравах крыжакі і размясцілі ў канцы XIV ст. свае драўляныя замкі, якія гродзенскія воіны праз некалькі гадоў спалілі.

Даволі складана аказалася вызначыць, калі ўзнікла так званае Занёманскае прадмесце або Занёманскі фарштат. Ва ўсякім выпадку ў 1506 г. яно ўжо існавала. Аналіз магдэбургскіх прывілеяў Гродна дазваляе зрабіць выснову, што частка Занёманскага прадмесця ўвайшла ў межы горада ў 1496 г., нейкая яе частка засталася ў велікакняскай юрысдыкцыі. Відаць, у XV ст. і склаўся Занёманскі рынак як цэнтр беспадатковага гандлю. Справа ў тым, што пошліну — «мыта» збіралі, згодна з магдэбургскімі і іншымі прывілеямі Гродна, пры пераездзе па мосце цераз Нёман. Такім чынам, Занёманскі рынак, які знаходзіўся ў раёне сучаснага францысканскага касцёла, быў, кажучы сучаснай мовай, «свабоднай эканамічнай зонай Гродна XV–XVI стст.».

Гродзенскі рынак, пазней Рыначная плошча, Ратушная плошча і г. д. сфармаваўся, на нашу думку, не пазней XIV ст. на перакрыжаванні асноўных гродзенскіх магістраляў — дарогі з замкаў на Смаленск і дарогі з пераправы па Нёмане на Вільню. Пазней дарогі трансфармаваліся ў вуліцы — сучасная Замкавая, Савецкая, Карла Маркса, Маставая, Баторыя. Вялікі князь у канцы XIV ст. заклаў у Гродне прыхадскі касцёл, які, згодна з традыцыяй, заўсёды знаходзіўся на рыначнай плошчы. Такім чынам, па некаторых звестках, узнікненне Рынка ў Гродне можна аднесці, па меншай меры, да сярэдзіны XIV ст.

Амаль усе даследчыкі Гродна па розных прычынах згадваюць «Stabula Regiae», г. зн. каралеўскія канюшні — месца ў Гродне, якое ўпершыню называецца ў сувязі з фундацыяй касцёла і кляштара бернардзінцаў на пачатку XV ст., а таксама на вышэй згаданым малюнку Адэльгаўзера 1567 г. Розныя даследчыкі гісторыі горада, абапіраючыся на дакументы, звязаныя з фундацыяй касцёла, а таксама гравюры Цюнта супаставілі гэта месца з тэрыторыяй сучаснага бернадзінскага кляштара і касцёла. На нашу думку, яно знаходзіцца трошкі больш на ўсход, там, дзе зараз узвышаецца элітны дом па вуліцы Парыжскай камуны.

Цэлы шэраг храмаў, згаданых у XVI ст., даследчыкі адносяць да больш ранняга перыяду. Так, да 1982 г. Прачысценская царква «прывязвалася» гісторыкамі да канкрэтнага месца — тэрыторыі жаночага базыльянскага манастыра. Аднак час яе з'яўлення даследчыкі вызначылі па мінімуму звестак — XII–XVстст. Беларускі археолаг Ігар Чарняўскі не

толькі знайшоў фундаменты гэтага храма, але, выдатна прааналізаваўшы матэрыял, зрабіў гэты храм роднай сястрой Каложскай і Ніжняй цэркваў. Такім чынам навуковец засведчыў, што ў Гродне XII ст. знаходзілася не меней як тры царквы. На ўзроўні «кухонных размоваў» сучасныя гісторыкі Гродна далучаюць да храмаў «гродзенскай архітэктурнай школы» яшчэ і Васкрасенскую царкву, якая месцілася хутчэй за ўсё на тэрыторыі сучаснага Новага замка альбо, што менш верагодна, у раёне пажарнай каланчы. Так, як і ў выпадку з Прачысценскай царквой XII ст., кропку ў гэтым пытанні паставяць археолагі. Дарэчы, гэта будзе не складана зрабіць, калі месца, дзе пад зямлёю «ляжаць» руіны Васкрасенскай царквы, не было зруйнавана падчас будоўлі замка.

У тэксце да гравюры Адэльгаўзера-Цюнта згадваецца яшчэ і Малая царква (магчыма Васкрасенская), цэрквы Чэснахрэсцкая на Падоле і Сімяонаўская. Іншыя крыніцы XVI ст. дадаюць да спіса гродзенскіх храмаў касцёл св. Мікалая і Троіцкую царкву. «Касцёльчык» св. Мікалая пры двары Гарадніца існаваў, прычым дакладна ў XV ст., аднак размяшчэнне гэтага, безумоўна, каталіцкага ў XV–XVII стст. храма на пляцоўцы над Каралеўскай крыніцай, там, дзе зараз месцяцца карпусы медыцынскага інстытута на вуліцы Віленскай, навяло на думку, што раней на месцы касцёла магла быць праваслаўная царква ў гонар «Святога Міколы Мокрага», г. зн. храм, які ўсходнія славяне традыцыйна ўзводзілі ля святой для паганцаў крыніцы альбо ручая. Як бы там ні было, тапонім «касцёл св. Мікалая» знік з ужывання ў другой палове XVII ст., пасля таго, як храм быў развалены маскоўскай салдатнёй.

Троіцкую царкву спрабаваў адшукаць прыкладна дзесяць гадоў таму Рыгор Акінчыц у тым месцы, дзе бралі пачатак некалі Вялікая і Малая Траецкія вуліцы, г. зн. на месцы Нямецкага рынка. Рэшткі царквы знайсці не ўдалося, але падчас раскопак археолагу неверагодна пашэнціла: ён знайшоў выграбную яму гродзенскай ганчарна-кафельнай майстэрні, якая дзейнічала ў канцы XVI–XVII ст. Падобнай калекцыі матрыц для кафлі, саміх кафель, іншых ганчарных вырабаў, відаць, не знойдзена нідзе ў краінах Цэнтральнай Еўропы. На думку Р. Акінчыца, рэшткі Троіцкай царквы могуць знаходзіцца ў зямлі трохі далей па вуліцы Вялікая Траецкая.

Размяшчэнне Чэснахрэсцкай царквы (ратонды на Падоле на гравюры Цюнта-Адэльгаўзера 1567 г.) нам удалося ўстанавіць дастаткова дакладна — гэта месца знаходзіцца на тэрыторыі тонкасуконнага камбіната

каля Старога моста. Месца, дзе могуць знаходзіцца рэшткі гэтага храма, хутчэй за ўсё знішчана ў XVII–XVIII стст. падчас пабудовы «старога» драўлянага касцёла кармелітаў альбо палаца Мураўскага. Тапонім перастаў ужывацца ў канцы XVII ст.

Сімяонаўская царква або «Храм рускі ў горадзе» напэўна самы таямнічы аб'ект на гравюры Цюнта. Аб ім няма напамінкаў ні ў якай іншай крыніцы, а ўсе тыя месцы, дзе даследчыкі Гродна «садзяць» гэты храм, здаюцца нам сумнеўнымі. Калі і існаваў падобны храм у Гродне, то хутчэй за ўсё быў пабудаваны ў XVI ст. і да 1600 г. знік…

Гэта пакуль усё, што тычыцца старажытных тапонімаў нашага горада, а зараз нам бы вельмі хацелася распавесці пра найбольш цікавыя гістарычныя забудовы Гродна.

Агародная // Franciszkańska, am Kloster str.

Агародная № 2 — Касцёл Маці Боскай Анёльскай і манастыр францысканцаў. Заснаваны ў 1635 г. па фундацыі Сузанны і Яўстафія Курчаў. У сярэдзіне XVIII ст. пасля пажару кляштар адноўлены, касцёл кансэкраваны ў 1744 г. ў імя Дзевы Марыі Анёльскай. Скасаваны ў 1832 г. Кляштарны комплекс уключае касцёл, жылы корпус і браму з агароджай, што ўтвараюць замкнёны ўнутраны двор. Складаны рэльеф вызначыў асіметрычную кампазіцыю комплексу. З паўднёвага боку да касцёла далучаны двухпавярховы жылы корпус асіметрычны П-падобны ў плане, што ўтварае замкнёны ўнутраны дворык, у які выходзіць абхадная па келлях скляпеністая галерэя, злучаная з паўночнай сакрысцыяй храма. У паўднёва-заходнім кутку корпуса вялікая скляпеністая зала трапезнай. Касцёл — помнік архітэктуры барока.
У інтэр'еры сем алтароў першай паловы XVIII — канца XIX ст. У цэнтральны неф выходзіць разьбяны драўляны амбон першай паловы XVIII ст. Галоўная алтарная кампазіцыя «Ушанаванне Багародзіцы» займае трыумфальную арку чатырохкалоннага барочнага порціка. У цэнтры другога яруса карціна «Стышатызацыя св. Францыска». Завяршае алтарнае збудаванне гарэльефная выява «Усхваленне Марыі». У касцёле падпісны абраз Іосіфа Міховіча за 1872 г. «Антоній з дзіцем», абразы XVII–XVIII стст. «Маці Божая Анёльская» ў сярэбранай шаце, XVIII–XIX стст. «Маці Божая з дзіцем»; абраз «Маці Божая Чанстахоўская» ў шаце другой паловы XVIII ст.
На пачатак XX ст. сюды прысылалі ксяндзоў за благія паводзіны на пакуты. У 1909–1913 гг. у манастыры жылі вучні гродзенскай гімназіі — сябры Гуртка беларускай моладзі: Янка Ляўковіч, Адольф Зянюк і Баляслаў Грабінскі. Сярод святароў касцёла былі святы Максімілян Кольбе і а. Мельхіёр Юзаф Фардон.

Адзінаццатага ліпеня // **Архірэйскі завулак, Аляксандраўскі завулак, Szpitalny zaułek, zaułek Sw. Mikolaja, Zum Grund** — З XVI да канца XVIII ст. тэрыторыя вуліцы адносілася да фальварка Гарадніца. На 1560 г. тут былі гумно, саладоўня, бровар і дом упраўляючага фальваркам. Сама вуліца сфармавалася ў першай палове XIX ст., але асноўная забудова адносіцца да пачатку XX ст. Па планах апошняй «рэканструкцыі» па вуліцы Адзінаццатага ліпеня было знесена чатыры будынкі.

Адзінаццатага ліпеня № 3 — Год пабудовы — 1909. Эклектыка.

Адзінаццатага ліпеня № 18 — Дом гаспадарыні Клікс. Год пабудовы — 1898. Эклектыка. У 1920-х дом набыў староста Пакроўскага сабора Малашка. Большасць кватэр здавалася за плату. У 1939 г. быў канфіскаваны. Пасля 1944 г. тут жылі супрацоўнікі сілавых органаў і аблвыканкама. Дачка былога гаспадара — Вера Малашка, пражыла ўсё жыццё ў трохпакаёвай прыбудове побач з камяніцай.

Ажэшкі // «Новая Верцялішская дарога», Верцялішская, вуліца Раскошы, Садовая, Мураўёўская, Orzeszkowej, Adolf Hitlerstr. — Адна з цэнтральных вуліц горада. Звязвае Прывакзальную плошчу з плошчай Леніна. Яшчэ ў сярэднявеччы на месцы вуліцы праходзіла дарога з Гродна на Верцялішкі — родавое ўладанне гродзенскага кашталяна Давыда Гарадзенскага. У валочнай памеры 1560–1561 гг. згадваецца, як «Новая дарога да Верцялішак». У магістрацкіх актах XVII–XVIII стст. — дарога міма Гарадніцы, вуліца з Рынку да двара Яго Княжацкай Міласці, Гарадніца і інш. Сама вуліца сфармавалася ў 1760–1780 гг. як частка Гарадніцы— новага раёна горада, дзе размяшчаліся мануфактурныя прадпрыемствы, жылыя і грамадскія будынкі. Адзін час называлася вуліцай Раскошы па назве карчмы, што знаходзілася пры ўездзе ў горад, прычым канчалася вуліца таксама карчмой, якая мела назоў — «Галеча» («Нэндза»), што адпавядала маралізатарству эпохі Асветніцтва… У 1802 г. Гарадніца была перададзена гарадской юрысдыцы. Пачала інтэнсіўна забудоўвацца пасля 1862 г. як вуліца да чыгуначнай станцыі. У другой палове XIX ст. вуліца называлася Садовая, а на пачатку XX ст., у гонар былога губернатара, атрымала назву Мураўёўскай — маўляў, мясцовыя ўлады ўчынілі гэта наўмысна, каб зрабіць прыкрасць вядомай польскай пісьменніцы Элізе Ажэшцы, чый дом стаяў на гэтай вуліцы. Аднак ужо пасля смерці пісьменніцы і з усталяваннем польскай улады з 1920 г. вуліца стала ўласна вуліцай Э. Ажэшкі. Значныя змены ў архітэктурным абліччы вуліцы адбыліся ў 1960–1980-я гады, калі былі разбураны помнікі архітэктуры — будынкі кантрольнай палаты, чыгуначнага вакзала, шэраг пабудоў часоў Тызенгаўза. Узведзеныя на іх месцы будынак аблвыканкама, шматпавярховыя жылыя дамы ўнеслі дысананс у архітэктурны ансамбль вуліцы. Працягласць каля 1 км.

Ажэшкі № 1 — «Палац князёў Масальскіх», «дом купца Фрумкіна», «дом паштовага ведамства», чыгуначны тэхнікум, рэктарат медінстытута. Пабудаваны на гэтым месцы ў 1750-х гадах палац князёў Масальскіх быў моцна пашкоджаны пажарам 1782 г. Каля 1795 г. перабудаваны. У архітэктуры будынка выкарыстаны элементы стыляў барока і класіцызму. Паміж 1831–1843 гг. выкуплены купцом І. Фрумкіным. У 1868–1903 гг. арандатарам будынка было паштова-тэлеграфнае ведамства. Першапачаткова на працу ў тэлеграфную кантору не бралі жанчын, аднак ужо ў 1875 г. — праз дзесяць год пасля адмены забароны — на гродзенскай тэлеграфнай станцыі працавалі чатыры жанчыны. Першымі тэлеграфісткамі былі Вольга Клышынская, Аўрэлія Рэймер, Паўліна Сальтус і Эма Гайдамовіч. У 1884 г. да крыла пошты з боку вуліцы Саборнай (сучасная Савецкая) быў дабудаваны будынак суда так, што пры гэтым частка былога палаца ўвайшла ў агульную кампазіцыю. Тут у канцы XIX ст. месціліся розныя казённыя ўстановы і бакалейная крама. Ужо ў міжваенны час будынак займалі аддзел па справах

іпатэкі пры акружным судзе, натарыяльныя канторы Л. Бяляўскага, Я. Александровіча, С. Хельміцкага, магазін з алкаголем «Яфе і К°.» і інш.

Ажэшкі № 1а — **Малебная школа купца Іосіфа Фрумкіна**. Год забудовы — 1910. Знаходзіцца ў дварэ былога палаца Масальскіх.

Ажэшкі № 3 — а) **Дом віцэ-губернатара, дом Максімовіча, казённая палата, губернскае казначэйства, дом Камінскіх на акцызнай плошчы (на 1917), Староства**. Пабудаваны ў 1803 г. для Канстанта Максімовіча (каля 1767–1831) — выпускніка Віленскага універсітэта, які за адзінаццаць год у вайсковай службе даслужыўся да маёра, пазней — экспедытар гаспадарчага аддзела Найвышэйшага ўпраўлення Расійскай імперыі, з 1802 г. — дарадца Гродзенскай ізбы скарбовай (?), прыдворны дарадца, у 1807–1813, 1815–1817 — выконваў абавязкі гродзенскага віцэ-губернатара, а з 1819 г. — гродзенскі віцэ-губернатар. Ягоны дом уяўляе сабою ўзор архітэктуры класіцызму ў расійскім варыянце, даволі рэдкім для Заходняй Беларусі. У канцы лета 1812 г. падчас руска-французкай вайны тут размясціўся штаб караля Вестфаліі Жэрома Банапарта — брата Напалеона, а падчас польска-савецкай вайны летам 1920 г. — Гродзенскі рэвалюцыйны камітэт. 1–2 жніўня праездам тут спыняўся Ф. Дзяржынскі (у гонар апошніх падзей у 1970 г. на доме была ўстаноўлена мемарыяльная дошка). У 1920-я гады сядзіба гродзенскага павятовага староства, міністэрства грамадскіх прац, міністэрства фінансаў. З 1922 г. на пачатак 1930-х у будынку староства працаваў гарадскі музей. У 1930 г. тут месцілася рэдакцыя «Gazety Polskiej Ziemi Grodzieńskiej». У савецкія часы — выканкам абласнога Савета народных дэпутатаў.

б) **Гродзенскі аблвыканкам** — Дзевяціпавярховы будынак, прыклад адміністрацыйных збудаванняў савецкіх часоў. Год пабудовы — 1966, архіт. І. Міхед; рэканструкцыя — 1979 г.: архітэктары І. Еўдакімаў, У. Праабражэнскі, М. Бярэзін. Пасаду старшыні Гродзенскага аблвыканкама ў розныя гады займалі — П. Ратайка (1944–1948), Ф. Ляхаў (1945–1951), І. Канановіч (1951–1961), Н. Малочка (1961–1972), Г. Фамічоў (1972–1978), С. Кабяк (1978–1983), Д. Арцыменя (1983-1993).
Раней на гэтым месцы знаходзілася двухпавярховая **карчма «Галеча»** пабудаваная ў 1770-я гады. На пачатку XIX ст. яна была перабудавана пад будынак **Кантрольнай палаты**, які пазней быў зруйнаваны пад будаўніцтва аблвыканкама.

Ажэшкі № 4 — **Банк.** Пабудаваны ў 1930-х гадах. Прыклад стылю канструктывізму.
На гэтым месцы на пачатку XX ст. знаходзіліся прадпрыемства па вырабе лімонаду і садовай вады Шалома Ялпера і гатэль «Швейцарыя» (ён жа — гатэль «Нью-Ёрк»), у якім у красавіку-жніўні 1922 г. працавала рэдакцыя паланафільскай газеты «Беларускі шлях» на чале з Я. Міткевічам. Летам-вяс-

ной 1928 г. тут была сядзіба гродзенскага акруговага камітэта (управы) Таварыства беларускай школы.

Ажэшкі № 6 — Пабудаваны ў 1924 г.

Ажэшкі № 8 — Год забудовы 1922. Тыповы жылы дом з гандлёвай лаўкай. З 1984 г. у ім адчынены магазін «Гадзіннікі». У энцыклапедычным даведніку «Гродна» за 1989 г. адзначалася, што магазін дадаткова «прымае замовы на часова адсутныя тавары, прадае тавары ў крэдыт, прымацоўвае раменьчыкі ды бранзалеты да гадзіннікаў».

Ажэшкі № 8а — Год пабудовы — 1924.

Газон на скрыжаванні вул. Ажэшкі і Сацыялістычнай — У будынку, што стаяў на гэтым месцы, у савецкі час працавала крама «Тытунь». Побач, на самім скрыжаванні, падчас баёў 20 верасня 1939 г. быў падбіты адзін з савецкіх танкаў, а ўся ягоная каманда — загінула.

Ажэшкі № 9 — Бровар баніфратараў, акружная лячэбніца, упраўленне гродзенскай паштова-тэлеграфнай акругі, паштова-тэлеграфная кантора, акружная ўправа, стары галоўпаштамт. Год пабудовы — 1795. Перабудаваны ў 1857–1859 гг. Капрамонт — 1944 г. Помнік грамадзянскай архітэктуры XIX ст. Узнікненне шпіталя ў Гродне звязана з дзейнасцю ордэна ксяндзоў Баніфратараў, які ў канцы XVIII ст. меў драўляны будынак шпіталя на вул. Баніфратарскай (гл. вул. Свярдлова). У 1808 г. імператар Аляксандар I падараваў ордэну цагляны двухпавярховы бровар па вуліцы Верцялішскай дзеля перабудовы яго пад шпіталь для бедных. Аднак яшчэ каля 1812 г. будынак выкарыстоўваўся у якасці склада. Пасля скасавання ордэна шпіталь быў перададзены Прыказу грамадскага апекавання для размяшчэння акруговай лячэбніцы. У 1857 г. пад наглядам губернскага архітэктара В. Міхаэліса будынак адрамантаваў і перабудаваў купец І. Фрумкін, які стаў яго ўладальнікам і заключыў кантракт на 30 гадоў на здачу будынка ў арэнду пад акруговы шпіталь. У кнізе Е. Радзішэўскага «Гістарычнае апісанне г. Гродна» 1860 г. згадвалася, што: «на вуліцы Раскоша з непрыгляднага, напаўразбуранага каменнага дома адбудаваны выдатны двухпавярховы будынак Акружной лячэбніцы». У 1891 г. гродзенская гарадская ўправа зацвердзіла план чарговай перабудовы будынка. У такім выглядзе ён захаваўся да нашага часу, з тым, што ў аперацыйнай зале ў сярэдзіне будынка быў купал. У другой палове XX ст. з галоўнага фасада будынка зніклі тры чыгунныя балконы, ліквідаваны купал, а люкарна на цэнтральным атыку да апошняга часу была закрыта абстрактнай выявай тэлефоннага дыска. Са снежня 1902 г. тут размяшчаліся акруговая ўправа і паштова-тэлеграфная кантора з кватэрамі для службоўцаў. У 1920–1930-я гг. — упраўленне пошты і тэлеграфаў. Тут таксама знаходзіўся гродзенскі філіял Таварыства аб'яднанага гандлю і прамысловасці А. Ярашэвіч, М. Маліноўскі і К°.

Ажэшкі № 11 — Аптэка. Год пабудовы — 1910. Тыповы прыклад гродзенскай эклектыкі. Магчыма, што менавіта на гэтым месцы з 1857 г. працаваў мылаварны завод Ізраіля Гіршгорна.

Помнік Элізе Ажэшцы — Скульптурны партрэт Э. Ажэшкі працы скульптара Р. Зерыха. Першапачаткова пастаўлены ў 1929 г. у гарадскім парку. У Вялікую Айчынную вайну жыхары горада збераглі бюст Э. Ажэшкі, схаваўшы яго на каталіцкіх могілках. У 1949 г. перанесены на новае месца.

Мост цераз Гараднічанку — Пабудаваны на пачатку XX ст. Неаднаразова рэканструяваўся.

Ажэшкі № 15 — Шахматна-шашачны клуб. Год пабудовы — 1912. З'яўляецца ўзорным прыкладам архітэктуры стылю мадэрн. На пачатку 1920-х у будынку знаходзілася рэдакцыя газеты «Echo Grodzieńskie». Тут месціліся дабрачыннае таварыства «Жлобэк», аптэка першага дабрачыннага таварыства (адчынена каля 1903), пазней — з 1914 г., аптэка Саўла Шварца, рэстаўрацыя Невяроўскіх і Васілеўскага, магазін з малюнкамі Суднічанка, працаваў кінатэатр «Палац», пазней змяніўшы назву на «Уцеха». Паводле рэкламы ў мясцовай газеце, у ім можна было пабачыць, напрыклад, «магутную эратычную драму «Боская кабета» з Грэтай Гарбо». 24 студзеня 1926 г. тут адбыўся пасольскі мітынг Беларускай сялянска-работніцкай грамады, на якім выступілі беларускія паслы ў польскі Сейм С. Рак-Міхайлоўскі і П. Валошын.

Ажэшкі № 17 — Дом Элізы Ажэшкі. Пабудаваны ў 1976 г. (архітэктар-рэстаўратар В. Кунін) з пераносам у глыб вуліцы, як копія драўлянага дома, у якім у 1895–1910 гг. жыла польская пісьменніца Эліза Ажэшка (1841–1910). У Гродне жыла з 1869 г. На вуліцу Садовую яна пераехала ў дом да свайго мужа Станіслава Нагорскага (1826–1896) — адваката, дырэктара Гродзенскага дабрачыннага таварыства, стваральніка мясцовага Крэдытнага таварыства, сябра Дысконтавага камітэта філіі дзяржбанка і інш., з якім пражыла разам да яго смерці толькі два гады. Тут яна напісала кнігу апавяданняў «Меланхолікі», аповесці «Аўстраліец» і «Ad astra», раман «Арганаўты» і зборнік навел «Gloria victis». Калі Э. Ажэшка цяжка захварэла, жыхары Гродна выслалі брук каля яе дома саломай, каб гукі з вуліцы не перашкаджалі хворай. У 1920-я гады дом знаходзіўся пад кіраваннем Польскай мацежы школьнай. У ім размясціліся таварыства апекі над дзецьмі і гандлёвая школа (дырэктар — С. Маркевіч). У 1953 г. на доме ўстаноўлена мемарыяльная дошка памяці Э. Ажэшкі. У 1960-я гады тут працавала Гродзенскае аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР, якое пэўны час узначальваў А. Карпюк. Менавіта адсюль пачынаецца і гісторыя стварэння Саюза палякаў Беларусі. Цяпер у доме мемарыяльныя пакоі Э. Ажэшкі і аддзел юнацкай літаратуры абласной бібліятэкі імя Я. Карскага.

Ажэшкі № 19 — Дом Абрэмбскага. Пабудаваны ў канцы XIX ст. у стылі эклектыкі. Абрэмбскія сябравалі з Э. Ажэшкай, яна ж і дапамагла ім у будаўніцтве дома. Пасля Першай сусветнай вайны гаспадаром будынка з'яўляўся З. Лямпіцкі, які здаваў яго Навагрудскаму акруговаму земскаму управленню. У 1930-я гады тут знаходзілася школа імя Берка Ёсялевіча, у 1964 — станцыя юных тэхнікаў, а з 1969 г. — інстытут павышэння кваліфікацыі настаўнікаў. На тарцовай сцяне дома з боку вуліцы Леніна ў 1975 г. з'явіўся рэльеф «Навука» з выявамі асветнікаў і навукоўцаў, які ствараў агульную кампазіцыю з універсітэтам праз дарогу і быў свайго кшталту выклікам праваслаўнай царкве насупраць.

Пад пано «Навука» ў 1960-я гады знаходзіўся павільён «Сцякляшка».

Ажэшкі № 20 — Ветэрынарная школа, Гродзенская медыцынская школа, Гродзенская медыцынская акадэмія, палац князеў Чацвярцінскіх. Год пабудовы — 1786. Быў спраектаваны архітэктарам Дж. Сака для гродзенскай медыцынскай школы на Гарадніцы, аднак школа так і не пераехала ў гэты будынак у сувязі з тым што, А. Тызенгаўз быў адхілены ад справаў. Помнік архітэктуры позняга барока. Пасля перабудовы ў канцы XIX ст. змяніў свой вонкавы выгляд: бакавыя крылы вылучаны ў самастойныя памяшканні, купалы заменены атыкамі, упрыгожанымі ваеннай геральдыкай, дах у цэнтральнай частцы значна паніжаны. Пры школе існавалі аддзяленні правінцыяльных лекараў і хірургаў, акушэрак, былі бальніца, кабінет прыродазнаўства. У 1781 г. школа пераведзена ў Вільню, дзе стала асновай медыцынскага факультэта універсітэта. У міжваенны час — уласнасць князёў Чацвярцінскіх. Тут 20 снежня 1890 г. нарадзіўся вядомы гродзенскі гісторык Ю. Ядкоўскі. З савецкіх часоў выкарыстоўваецца пад розныя вайсковыя ўстановы.

Ажэшкі № 22 — Гродзенская жаночая марыінская гімназія, дзяржаўная настаўніцкая семінарыя імя Ажэшкі, дзяржаўная жаночая гімназія імя Плятэр, настаўніцкі інстытут, Гродзенскі педінстытут, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы. Год пабудовы — 1893. Аўтар праекта — інж. Небальсін. Помнік архітэктуры позняга класіцызму. Да будаўніцтва гэтага будынка гродзенскіх дзяўчынак вучылі ў шляхетным пансіёне — у будынку флігеля дамініканскага кляштара (гл. вул. Савецкая № 8). Вясной 1919 г. праз кароткі час знаходзілася канцылярыя Гродзенскай беларускай губернскай управы. З восені 1919 да пачатку 1921 г. працавала беларуская школа. У 1940–1941 гг. дзейнічаў настаўніцкі інстытут (меў тры аддзяленні і рыхтаваў настаўнікаў для 5–7-х класаў няпоўных сярэдніх школаў), на базе якога ў 1944 г. быў створаны педінстытут. Інстытут меў чатыры факультэты. З 1978 г. — педагагічны універсітэт. У 1969 г. да былой гімназіі, на месцы драўлянай школы для дзяцей са слабым зрокам, прыбудаваны чатырохпавярховы корпус педінстытута па праекце І. Мазнічка. Перад будын-

кам універсітэта ў 1964 г. пастаўлены бронзавы бюст Янкі Купалы скульптара З. Азгура. Гэта не адзіны помнік, што стаяў каля будынка былой гімназіі. Пасля ўсталявання савецкай улады ў 1939 г. злева ад параднага ўвахода ў настаўніцкі інстытут з'явілася трохметровая выява Сталіна, якую ў чэрвені 1941 г. мясцовыя жыхары скінулі з пастамента.

Ажэшкі № 23 — Свята-Пакроўскі сабор. Пабудаваны ў 1906–1910 гг. на ўшанаванне памяці афіцэраў і ніжніх чыноў 26-й артылерыйскай брыгады, якія загінулі ў руска-японскую вайну 1904–1905 гг. Аўтар праекта храма архітэктар М. Прозараў, будаўніцтвам кіраваў капітан-інжынер Савельеў. Асвечаны 30 верасня 1907 г. Помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага (псеўдарускага) стылю. Архітэктура храма мае насычанае дэкаратыўнае ўбранне, запазычанае са старажытнарускага царкоўнага дойлідства, — какошнікі, шырынкі, вітыя калонкі, магутныя сандрыкі, кілепадобныя броўкі арачных аконных праёмаў. Падлога кафляная з арнаментальным малюнкам. Шануецца абраз «Казанская Маці Божая», якая была перанесена з былога Сафійскага сабора ў 1920-х гадах і для якой у 1935 г. у саборы была пабудавана капліца; мошчы пакутніка-дзіцяці Гаўрыіла Заблудаўскага. Абразы XIX ст.: «Аляксандр Неўскі і святая пакутніца», «Маці Божая Адзігітрыя», «Бог Саваоф», «Бог Саваоф і анёлы», «Сашэсце Святога Духа», «Святая прамудрасць сатвары сабе дом», «Уваскрэсенне». На сценах пры ўваходзе размешчаны мемарыяльныя дошкі з пералікам палкоў і колькасці вайскоўцаў, якія загінулі. У верасні 1939 г. у царкве забарыкадзіравалася частка палітвязняў, збеглых з гродзенскай турмы, якія трымалі абарону перад атрадамі польскай паліцыі і войска. У ліпені 1995 г. храм наведаў Святейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II.

Ажэшкі № 28 — Дом Хаіма Рама, з'езд міравых суддзяў, павятовае паліцэйскае ўпраўленне. Год пабудовы — 1874. Тыповы даходны дом. Гаспадар здаваў яго ў арэнду канцылярыі павятовага прадвадзіцеля дваранства, дваранскай апецы, павятовай установе па вайсковай павіннасці, павятоваму камітэту па нагляду за памяшканнем для арыштаваных па прысудах гарадскіх суддзяў, павятовай дарожнай камісіі, павятовай землеўпарадчай камісіі, камісіі па складанні спісаў прысяжных засядацеляў і камісіі па ўстанаўленні справачных цэн, павятовы камітэт папячыцельства па народнай цвярозасці. У 1919–1920 гг. тут знаходзілася Беларуская школьная рада Гродзеншчыны (Гродзенская цэнтральная беларуская вучыцельская рада). Рада была створана на 1-м беларускім настаўніцкім з'ездзе Гродзеншчыны 26–29 сакавіка 1919 г. Акрамя Рады ў доме па вуліцы Ажэшкі кароткі час дзейнічалі Гродзенскі беларускі нацыянальны камітэт, Грамада беларускай моладзі, а з 14 лістапада 1920 г. часова размясціўся Беларускі саюз спажывецкіх кааператываў Гродзеншчыны. У 1980-я гады ў магазіне на рагу вуліц Ажэшкі і Акадэмічнай прадавалася гародніна. Зараз будынак

часткова перададзены праваслаўнай епархіі. У ім працуе магазін царкоўных прылад.

З боку сучаснага універсітэта будынак далучаўся да **«Kantora»** Тызенгаўза, дзе ў канцы XVIII ст. месцілася ўпраўленне гродзенскімі каралеўскімі мануфактурамі, а ў 1930-х гадах тут знаходзілася галоўнае ўпраўленне маёмасці «Станіславова» князя Яна Друцкага-Любецкага. Будынак канторы быў разабраны ў 1960-я гады.

Ажэшкі № 29 — Год пабудовы — 1898. Узор шэраговай забудовы ў стылі эклектыкі. Моцна перабудаваны.

Ажэшкі № 30 — **Dom strzelców, Дом афіцэраў**. Год пабудовы — 1933. Узор архітэктуры канструктывізму. Магчыма, што аўтар праекта — пачынальнік гэтага стылю М. Шчука. На пачатак 1920-х гадоў зямельны надзел на скрыжаванні вуліц Ажэшка і Кірхавай быў уласнасцью польскага дзяржаўнага банка. Пры закладцы будынка яшчэ ў 1923 г. першы камень пад падмуркі паклаў тагачасны прэзідэнт Польшчы С. Вайцяхоўскі. У верасні 1939 г. тут абараняліся вучні польскіх гімназіяў, некаторыя з якіх пазней былі расстраляны савецкімі ўладамі на Сабачай горцы.

Ажэшкі № 32 — Спецыялізаваная ДЮСШОР № 3 па гімнастыцы.

Ажэшкі № 34 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Узор шараговай забудовы ў стылі эклектыкі. У міжваенны час будынак належаў кіраўніцтву інжынерна-сапёрнага раёна.

Ажэшкі № 35 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Эклектыка. Захаваўся цэлы шэраг архітэктурных дэталяў. У цэнтры галоўнага фасада вялікі арачны праезд. З 1960 г. на канец 1980-х гадоў тут працавала вядомая ў горадзе крама «Магазін паляўнічага і рыбалова».

Ажэшкі № 36 — Жылы дом сярэдзіны 1960-х гадоў на месцы «басняцкіх домікаў» (гл. Ажэшкі № 37), у якіх на канец XVIII ст. жылі суконшчыкі Кучынскі, Паўловіч, Радзівановіч ды маляр Гіба. З 1965 г. тут працуе абутковая крама «Башмачок». Паміж дамамі № 36–38 у 1930-я гады праходзіла вуліца Шпітальная (пазней — Ліёнская).

Ажэшкі № 37 — **Басняцкі домік, Дом майстра, музей «Гісторыя Гарадніцы»**. Помнік архітэктуры барока. Пабудаваны ў 1768–1773 гг. на тэрыторыі Гарадніцы. З'яўляецца адзіным уцалелым будынкам з дваццаці так званых «басняцкіх дамоў» («баснякі» — вайсковая варта Гродзенскай каралеўскай эканоміі), узведзеных па двух тыпавых праектах архітэктара І. Мёзера (паводле І. Трусава, пабудаваны па праекце архітэктара Дж. Сака) сіметрычна абапал вуліцы Раскоша для жыцця запрошаных на мануфактуры А. Тызенгаўза замежных майстроў і «баснякоў». Домік — прыклад першай на Беларусі тыпавой жылой забудовы. Мае мураваную фасадную сцяну. На пер-

шым паверсе будынка жылы пакой, кухня і сені, з якіх лесвіца вядзе на мансарду. Гродзенскія «басняцкія дамы» паводле праектнага вырашэння блізкія да пастаўскіх і шаўляйскіх, але трохі меншыя і прасцейшыя па дэкоры і планіроўцы. На канец XVIII ст. тут жыў пісар Міхал Задзілоўскі і нейкая Жулкоўская. Рэстаўраваны ў 1990 г. па праекце У. Барсукова — В. Калніна.

Ажэшкі № 38 — Жылы дом сярэдзіны 1960-х гадоў на месцы «басняцкіх домікаў» (гл. Ажэшкі № 37). У 1967 г. адчынена выставачная зала гродзенскай абласной арганізацыі Саюза мастакоў БССР, працуе кнігарня «Школьнік», створаная яшчэ ў 1945 г.

Ажэшкі № 39 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад «яўрэйскай» эклектыкі.

Ажэшкі № 40 — Жылы дом сярэдзіны 1970-х гадоў. З 1975 г. тут працуе ювелірная крама «Біруза».

Ажэшкі № 41 — Пабудаваны ў пачатку XX ст., перабудаваны ў 80-я гады XX ст., пасля чаго страціў у значнай ступені сваю арыгінальнасць.

Ажэшкі № 45 — Год пабудовы — 1900. Вельмі простая эклектыка.

Ажэшкі № 47 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Эклектыка. Будынак тыповы для Гродна.

Ажэшкі № 49 — **Стаматалагічная паліклініка № 1**. Адчынена ў 1962 г. На гэтым месцы знаходзілася карчма **«Раскоша»**, пабудаваная па праекце І. Мёзера ў 1770-я гады на пачатку вуліцы Раскоша пры ўездзе з боку Азёраў. Карчма мела сіметрычную кампазіцыю. Складалася з трох аднапавярховых квадратных у плане аб'ёмаў, якія прылягалі адзін да аднаго вугламі і ўтваралі напаўадкрыты двор. У цэнтры размяшчалася гасцініца, у бакавых — стайні. У канцы XVIII ст. гаспадаром тут быў шынкар Грахоўскі.

Акадэмічная // Кірхавая, Koscielna, Akademicka, Florastr. — Вуліца ад вул. Ажэшкі каля Пакроўскага сабора да вул. 17 верасня. Сфармавалася ў канцы XVIII ст. як частка Гарадніцы. Названа ў 1931 г. у гонар школаў часоў А. Тызенгаўза — медыцынскай, балетнай, архітэктурнай, геадэзічнай, бухгалтарскай, кадэцкай, якія дзейнічалі на Гарадніцы. Працягласць 500 м.

Акадэмічная № 2 — Дом Генрыха Замкоўскага. Вясной 1920 г. тут працавала Цэнтральная беларуская школьная рада Гродзеншчыны. На пачатку 1920-х гадоў у будынку знаходзіліся яўрэйскі малітоўны дом, чыгуначны клуб, чайная Б. Крыстосіка, жылі лекар Э. Лакінскі, настаўнік К. Меер і інш.

«Крылатая» (Ніка) — Помнік супрацоўнікам міліцыі. Аўтар — У. Церабун. Устаноўлены ў ліпені 2004 г. побач з будынкам Гродзенскага УУС.

На гэтым месцы на пачатку XX ст. знаходзіўся будынак гродзенскага земства — Арыштны дом, пазней — Urząd Policji Sledczej і дом Людвіка Баркоўскага.

Акадэмічная № 7/1 — Дом пастара. Год пабудовы — 1912. Эклектыка. Адным з найбольш вядомых пастараў быў Освальд-Адольф Плямш, між іншым, заядлы філатэліст. (Паводле Ю. Ядкоўскага, пастар нават падрабіў адну з вельмі рэдкіх паштовых марак, што выдавалася ў Гродне ў час Першай сусветнай вайны. Іншыя былі ўпэўнены, што Плямш — нямецкі шпіён). На пачатку 1920-х разам з ім тут жылі настаўніцы К. Жук, А. фон Казін і ягоная цётка — Крысціна фон Плямш, таксама — настаўніца.

Кірха — гл. *Першага мая № 5.*

Акадэмічная № 12а — Дом Савіцкага. Год пабудовы — 1886. На 1913 г. тут, хутчэй за ўсё, жыў кіраўнік 26-й пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнант Кайгародаў Міхаіл Нікіфаравіч, а таксама камандзір 26-й артылерыйскай брыгады Мамантаў Уладзімір Пятровіч. На пачатак 1920-х тут размясцілася камандаванне польскіх 3-й самаходнай дывізіі і 29-й дывізіі пяхоты.

Былыя лютэранскія могілкі — На месцы дзіцячага садка. Былі закладзены ў пачатку XIX ст. — прынамсі ўжо існуюць на мапе 1824 г. Зачынены каля 1878 г., але паасобныя пахаванні рабіліся яшчэ ў 1916 г. Знішчаны на пачатку 1970-х гадоў.

Акадэмічная № 13 — Дом урача К. Бялецкага. К. Бялецкі (1874 –1926) — сын кіраўніка пошты ў Лунна. Вучыўся ў Пецярбургскай вайсковай медыцынскай акадэміі. Вайсковы лекар, у тым ліку пры 102 пяхотным палку ў Гродне. Сябра Гродзенскага таварыства прыхільнікаў ваенна-санітарных ведаў. Трымаў прыватную практыку па скурна-венерычных захворваннях.
У двары дома захаваўся арыгінальны гараж пачатку XX ст. (па іншых звестках — пабудаваны падчас Другой сусветнай вайны).

Акадэмічная № 14 — Дом Цыцэліі Ваёўнік. Год пабудовы — 1895. Эклектыка. Захавалася вельмі рэдкая крата балкона, хутчэй за ўсё работы Вячоркі з Беластока.

Акадэмічная № 15 — Дом Зоф'і Зарын. Пабудаваны ў 1909 г. Эклектыка. На пачатку 1920-х — камандаванне 3-га дывізіёна вайсковай жандармерыі. Тут у 1924–1926 гг. разам са сваім мужам Янам Гажэхоўскім жыла польская пісьменніца Зоф'я Налкоўская.

Акадэмічная № 16 — Дом З. Халецкай і Д. Качана. Год пабудовы — 1898, 1910. Крата гаўбца паходзіць з віленскай майстэрні.

Акадэмічная № 20 — Дом М. Мычака. Год пабудовы — 1920.

Антонава // Новаўдзеляна над акопам, Ерусалімская, Новая Ерусалімская, Новая, Jerozolimska, Lange Reich, Танкістаў — Гэта апошняя з пяці вуліц, закладзеных на каралеўскіх грунтах ва ўсходняй мяжы Гродна. Першая згадка аб ёй паходзіць з 1772 г. Каля 1783 г. сюды былі пераселены пятнаццаць сямей з навакольля Старога замка, бо іх надзелы былі заняты пад будоўлю каралеўскай стайні ў сувязі з маючым адбыцца Сеймам. З канца XVIII ст. сфармавалася як вуліца да першых камунальных могілкаў і вайсковых крамаў. У сучасны момант актыўна перабудоўваецца са стратай гістарычнай забудовы. Працягласць 480 м.

Антонава № 1 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Дом недарэчна перабудаваны ў 1970-я гады.

Антонава № 2 — Пабудаваны ў пачатку XX ст.

Антонава № 4 — Пабудаваны ў канцы XIX ст.

Антонава № 4а — Пабудаваны ў пачатку XX ст.

Антонава № 4б — Пабудаваны ў пачатку XX ст.

Антонава № 6 — Пабудаваны ў канцы XIX ст.

Антонава № 10 — Год пабудовы — 1910. Тыповы дом з крамаю «местачковага тыпу». У 1990-я поўнасцю перабудаваны пад гандлёвы комплекс «Сямашка».

Антонава № 11 — Пабудаваны ў канцы XIX ст. Эклектыка.

Антонава № 11/1 — Пабудаваны ў канцы XIX ст. Эклектыка з вельмі цікавымі дэталямі.

Антонава № 15 — Год пабудовы — 1898. Магчыма, тут у 1920-я гады жыў беларускі дзеяч Мікалай Якімовіч (1896–1929). Эклектыка з вельмі каштоўнай каванай кратай над уваходам працы вядомай кавальскай сям'і Качаноў.

Антонава № 20 — Станцыя юных натуралістаў. Створана ў 1950 г.

Антонава № 22 — Крама «Зялёны мир». Пабудавана ў пачатку XX ст. У сярэдзіне 1930-х гадоў тут знаходзілася сядзіба гродзенскіх баптыстаў, якую ўзначальваў брат Міллер. З прыходам савецкай улады будынак быў перададзены вайскоўцам.

Антонава № 21. — Медыцынскае вучылішча, банк. Год пабудовы — 1975.

Дом Антонава — былая Антонава № 23. Савецкі ваенны дзеяч, генерал арміі А. Антонаў (1896–1962). У 1965 г. на доме, у якім ён нарадзіўся, была ўсталявана мемарыяльная дошка, а ў 1988 г. адчынены музей. У 1990-я гады ў гэтым будынку знаходзілася крама «сэкандхэнду». Дом разабраны ў 1990-я гады.

Антонава № 25 — Рэдакцыйна-выдавецкі корпус газеты «Гродзенская праўда». Пабудаваны ў 1985 г. Аўтар праекта — архітэктар Л. Вільчко. «Гродзенская праўда» выходзіць з кастрычніка 1944 г., як орган абласнога і гарадскога камітэта КПБ. У свой час у рэдакцыі газеты працавалі М. Васілёк, В. Быкаў, А. Карпюк, Ю. Голуб і інш.

Антонава № 31 –Пабудаваны ў канцы XIX ст. Эклектыка. У 1920 г. тут месцілася «бурса» — інтэрнат пры беларускай гімназіі.

Праваслаўныя могілкі // Старыя, Рускія, Сафійскія, Ерусалімскія, могілкі па Антонова. На пачатку XX ст. увесь гэты раён разам з каталіцкімі і вайсковымі могілкамі (гл. вуліца Белуша) называўся «Кладбищенской слободой». Закладзены на пачатку XIX ст. Могілкі моцна пацярпелі падчас баёў у 1915, 1939, 1944 гг. Зачынены ў 1973 г. На могілках сярод іншых пахаваны Марыя Багдановіч (Мякота) — маці Максіма Багдановіча, гісторык Е. Арлоўскі, этнограф М. Дзмітрыеў, філолаг П. Кавалеўскі, архітэктары Небальсін і Раманаў, медыкі К. Кемарскі і А. Райпольскі, епіскап Ігнацій (Жалязоўскі) і інш. У другой палове XIX ст. тут была пабудавана **Царква прападобнай Марфы** — помнік архітэктуры позняга класіцызму. У 1890 г. пры браме на грошы мешчаніна С. Талочкі была пабудавана **капліца ў гонар Уваскрасення Хрыстова.** У 1957 г. на магіле ста дваццаці савецкіх ваеннапалонных пастаўлены помнік. У 1958 г. помнік з'явіўся на магіле пяцісот сямідзесяці воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1959 г. скульптура воіна пастаўлена па магіле, дзе пахаваны астанкі чатырыста дзевяноста савецкіх салдатаў, якія загінулі ў баях у ліпені 1944 г.

Каталіцкія могілкі // Старыя каталіцкія могілкі, фарныя могілкі. Закладзены ў 1792 г. Зачынены ў сярэдзіне 1970-х гадоў. На могілках сярод іншых пахаваны Эліза Ажэшка, яе муж Станіслаў Нагорскі, архітэктар Дж. Сака, айцы М. Фардон, Ф. Грынкевіч і М. Арановіч, З.І. Касцялкоўская, Я. Каханоўскі, генерал Ф. Баркоўскі, гродзенскія віцэ-губернатары Т. Янеўскі і К. Максімовіч, барон З. Дангел, урач А. Тальгейм, польскія жаўнеры, якія загінулі падчас польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. і інш. У 1822 г. на могілках пабудавана капліца па праекце архітэктара К. Багеміла. Асаблівую ўвагу заслугоўваюць надмагільныя помнікі працы Б. Шушкевіча, Г. Забароўскага і інш.

Арджанікідзе // Trebacka, Tabakstr.

Арджанікідзе № 18 — Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман». Прыклад стылю канструктывізму. Пабудавана ў 1930-х гадах.

Асіпенка // Niemeńska, Wigury, Talstr. — Узнікла ў 1930-х гадах як настаўніцкая «калонія».

Асіпенка № 1 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Асіпенка № 1/1 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Асіпенка № 3 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Асіпенка № 4 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Астроўскага // Paniatowskiego, Bluchier strasse — Сфармавалася ў 1920–1930-я гг. на землях былога маёнтка Станіславова. Участкі тут набывалі ў асноўным людзі забяспечаныя: афіцэры польскага войска, інжынеры-геадэзісты ды чыгуначнікі, збяднелыя сваякі былых арыстакратаў або звычайныя мяшчане, што ездзілі на заробкі ў Амерыку.

Астроўскага № 4 а — Пабудаваны ў 1920-я гады. Гарадская віла ў стылі сецэсіі.

Астроўскага № 6 — Драўляная двухпавярховая віла. Пабудавана ў 1920–1930-я гады.

Астроўскага № 11 — Дом інжынера-геадэзіста Высоцкага, дом Кляцкова, музычная школа, гродзенскі цэнтр сацыяльна-псіхалагічнай дапамогі. Год пабудовы — 1936. Пасля 1939 г. — канфіскаваны на карысць партыйнага кіраўніцтва горада. Пасля Другой сусветнай вайны ажно да канца 1980-х у ёй жылі высокапастаўленыя партыйныя начальнікі, сярод якіх і найбольш вядомы сакратар Гарадзенскага абкама КПБ Леанід Кляцкоў.

Астроўскага № 15 — Дом доктара Бяклемішава, дом унтэрштурмфюрэра СС Эрыха Шота. Драўляны. Высокамастацкі прыклад канструктывізму.

Багдановіча // Маласадовая, Мала-Ogrodowa, Ogrodowa, gen. Litwinowicza, Richthofen-Str. — Канчаткова сфармавалася ў XIX ст., калі горад адкупіў частку ўладанняў князёў Друцкіх-Любецкіх.

Багдановіча № 1 — Уласнасць В. Караткевіч, пазней — А. Міклашэвіча, К. Хорчаха. Дом-музей Максіма Багдановіча. Год пабудовы каля 1883 г. У 1957 г. на доме ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў гонар Максіма Багдановіча.

Багдановіча № 3 — Год пабудовы — 1885.

Багдановіча № 13 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Багуцкага // Objazdowa, Schrage-Str.

Форт № 5 фортавай лініі 1887–1892 гг. — Скрыжаванне вуліц Багуцкага і Горкага. Знішчаны амаль цалкам падчас будаўніцтва гаражоў. Пакінуў аб сабе памяць у назве мікрараёна «Фарты». Яшчэ раней на гэтым месцы знаходзіліся гэтакзваныя «шведскія акопы»...

Батанічная // Раздельная, Dzielna, Botoniczna, Kanzlerstr. — Сфармавалася як частка Гарадніцы. Задумоўвалася ў якасці магістралі, якая б звязвала Парадную плошчу (сучасную плошчу Тызенгаўза) з мостам цераз Гарадніцу каля карчмы «Раскоша». Не захаваліся стары будынак медыцынскай школкі і «другі домік садоўніка».

Батанічная № 3 — Дом Каханоўскіх. Год пабудовы — 1899.

Батанічная № 4 — Дом М. Янушковай. Год пабудовы — 1900.

Батанічная № 6 — Год пабудовы — 1902. Цагляная эклектыка.

Батанічная № 9 — «Дом кіраўніка дэфензівы». Пабудованы ў 1930-я гады. Высокамастацкі прыклад канструктывізму.

Батанічная № 15 — Год пабудовы — 1904. Эклектыка.

Белуша // Прадмесце Друцк, Лідская застава, Legionowa, Kasernenstr., Авангардная.

Вайсковыя могілкі — Закладзены каля 1887 г. Могілкі склаліся з дзвюх частак: лютэранскай (паўднёвай) і паўночнай, дзе знаходзіліся пахаванні вайскоўцаў іншых хрысціянскіх веравызнанняў. Да найбольш цікавых помнікаў гэтага перыяду адносіцца капліца генерал-маёра Аляксандра Русау — Капліца Русау. Падчас Першай сусветнай вайны на вайсковых могілках было пахавана шмат нямецкіх салдат і афіцэраў. На могілках хавалі таксама салдатаў, якія загінулі ў бальшавіцка-польскай вайне 1920 г., пахаваны савецкія воіны, якія загінулі ў 1939 і 1944 гг., а таксама ваеннапалонныя Чырвонай Арміі і нямецкія салдаты і ваеннапалонныя. У 1981 г. быў пастаўлены пом-

нік савецкім салдатам, аўтары якога скульптар У. Церабун і архітэктар А. Каралькоў.

Белуша № 3 — Комплекс вайсковых казармаў. Пабудаваны на пачатку XX ст.

Белуша № 4 — Przytułek dla chreściańskcich dzieci. Пабудаваны на пачатку XX ст.

Белуша № 20 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад драўлянай эклектыкі.

Белуша № 54 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад драўлянай эклектыкі.

Брацкая — Адна з вуліц на гэтакзваным «Slimake» — квартале для бедных. Яшчэ раней навакольная мясцовасць згадвецца як «урочышча Сакрэт». Побач на пачатку XX ст. знаходзіўся маёнтак Друцк. У 1936 г. на сучасных вуліцах Брацкая, Перамаганосная, Папова пачалася будоўля 41 дома для бяздомных.

Брацкая № 24 — Пабудаваны каля 1936 г. Прыклад мінімалізму з элементамі вельмі сціплага канструктывізму.

Брацкая № 25 — Пабудаваны каля 1936 г. Прыклад мінімалізму з элементамі вельмі сціплага канструктывізму.

Брацкая № 26 — Пабудаваны каля 1936 г. Прыклад мінімалізму з элементамі вельмі сціплага канструктывізму.

Будаўнікоў праспект — Пачаў фармавацца на пачатку 1970-х гадоў на месцы былой вёскі Пярэселка.

Мемарыяльная дошка ў гонар гісторыка Міхася Ткачова — На доме па праспекце Будаўнікоў № 27, дзе з 1978 па 1989 г. жыў М. Ткачоў.

Будзённага // Новая, Аляксандраўская, Warszawska, Jagiellonska, Bachndamm/Am Bahnhofstr — З'явілася ў XIX ст. на месцы фартыфікацыйных пабудоў з 1657, 1706 гг. у сувязі з будоўляй чугункі Санкт-Пецярбург — Гродна — Варшава.

Будзённага № 2 — Яўрэйская грамадская бальніца, 3-я гарадская бальніца, чыгуначны шпіталь. Першапачаткова яўрэйскі шпіталь месціўся ў раёне старога Нямецкага рынку (сёння — вуліца Малая Траецкая), аднак у 1866 г. у сувязі з яго «нездавальняючым станам» было прынята рашэнне аб будаўніцтве спецыяльнага будынка. Паўсталы ў 1868–1871 гг. шпіталь першапачаткова разлічваўся на 60 ложкаў. Ужо ў 1871 г. падчас эпідэміі халеры пры ім арганізуецца эпідэміялагічнае аддзяленне, а ў перыяд руска-турэцкай

вайны 1877–1878 гг. адчыняецца палата для параненых салдат. Яўрэйская бальніца ўтрымоўвала ў Друскеніках аддзяленне для лячэння мінеральнымі водамі хранічна хворых і прытулак. Штатны персанал з'явіўся ў шпіталі толькі пасля яго пашырэння ў 1886 г. Усяго працавалі два ўрачы і два фельчары. Адным з першых урачоў-ардынатараў стаў выпускнік Кіеўскага універсітэта Генах Замкоўскі (1852–1932). З 1857 па 1882 г. нязменным старшынёй праўлення шпіталя быў гродзенскі купец Б. Ашкеназі, які асігнаваў на дабрачыннасць значную суму з уласных даходаў. Ужо ў 1914 г. старшынёй праўлення стаў іншы гродзенскі купец — Г. Ліўшыц. У 1898 г. пры шпіталі было арганізавана таварыства па дапамозе бедным хворым «Лінас Гецэдэк». У 1915–1918 гг. пасля эвакуацыі гарадской лечэбніцы падчас нямецкай акупацыі на базе яўрэйскага шпіталя працаваў агульнагарадскі шпіталь, які меў аддзяленні па ўсім горадзе. На пачатак 1919 г. шпіталь зноў набыў вузканацыянальную спецыфіку. У яўрэйскім шпіталі доўгі час працавалі ўрачы А. і Ю. Ліпнік, Н. Нейман, М. Фінкель. З 1930 г. пры шпіталі дзейнічаў мясцовы аддзел Таварыства аховы здароўя яўрэяў (старшыня А. Ліпнік). Восенню 1939 г. ператвораны ў 3-ю гарадскую бальніцу.

Будзённага № 16 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад перапрацаванай эклектыкі.

Будзённага № 28 — Тыповая крама са складамі першай паловы 1950-х гадоў.

Будзённага № 30 — **Дом Мардуха Індурскага, дзіцячы садок**. Пабудаваны на пачатку XX ст. Гаспадар дома ў 1914 г. быў асуджаны за падробку вэксаляў. Разабраны летам 2007 г.

Будзённага № 32 — Пабудаваны напрыканцы XIX ст.

Будзённага № 36 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Уключае ў сябе элементы эклектыкі.

Будзённага № 37 — **Будынак чыгуначнага вакзала.** На месцы новага будынка месцілася старая чыгуначная станцыя, пабудаваная яшчэ ў 1865 г. з цэглы. Мела элементы стылю класіцызму. Строга сіметрычная аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя прамавугольнага ў плане будынка складалася з цэнтральнай двухпавярховай часткі, злучанай аднапавярховымі галерэямі з двума бакавымі аднапавярховымі крыламі. 21 верасня 1939 г. тут знаходзіўся польскі штаб абароны Гродна генерала Пршэдэцкага. У Вялікую Айчынную вайну разбураны, адноўлены у 1948 г. Пры аднаўленчых работах над галерэямі надбудаваны другі паверх. У 1986 г., нягледзячы на пратэсты з боку некаторых мясцовых інтэлігентаў, вакзал быў разбураны. На фасадзе сучаснага будынка вакзала ўсталяваны памятны рэльеф работы В. Панцялеева ў гонар гімназістаў — удзельнікаў паўстання 1863 г.

Будзённага № 42 — **Былая гарадская электрастанцыя.** Была ўведзена ў эксплуатацыю ў снежні 1912 г. Ужо на наступны год у горадзе было каля 500 спажыўцоў электраэнергіі, у сувязі з чым да двух ужо існуючых рухавікоў Diesla прыйшлося дадаць яшчэ два, павялічыўшы агульную магутнасць электрастанцыі да 405 КВт. Электрасетка ахоплівала толькі цэнтральную частку правабярэжнага Гродна. Пры эвакуацыі ў 1915 г. расейскімі ўладамі быў узарваны адзін з чатырох рухавікоў. Акрамя гэтага, ужо нямецкія акупацыйныя ўлады замянілі правады на жалезныя, а медзь вывезлі ў Германію. Толькі ў 1923 г. гарадскім магістратам быў куплены новы рухавік, і ўжо праз год колькасць карыстальнікаў электрычнасці дасягнула каля дзвюх з паловай тысяч чалавек. У 1928 г. электрастанцыя была перабудавана з увядзеннем паравых катлоў і турбарухавіковай сістэмы.
Зараз будынак электрастанцыі знаходзіцца на тэрыторыі прадпрыемства Гродзенскія цепласеткі і паступова знішчаецца.
Таксама на тэрыторыі сучаснага прадпрыемства на пачатку XX ст. знаходзілася Гродзенская спавівальная школа.

Бюст Леніна — Устаноўлены на тэрыторыі гарадскіх цепласетак.

Будзённага № 44 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад моцна перароблена эклектыкі.

Будзённага № 46 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад моцна перароблена эклектыкі.

Будзённага № 48 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад моцна перароблена эклектыкі.

Будзённага № 48а — Табачныя склады Акцыянернага таварыства Шарашэўскіх, консульства РП, мытныя службы, ГА ТБШ (былая «Ратуша»), «Polska macież szkolna» і інш. Пабудаваны на пачатку XX ст.

Будзённага № 50 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Будзённага № 52 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад прымітыўнай эклектыкі.

Будзённага № 54а — Санпрапускнік. Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад эклектыкі.

Будзённага № 54б — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад моцна перароблена эклектыкі.

Будзённага № 56 — **Soldatenhaine**. Пабудаваны на пачатку XX ст.

Бялінскага // Славянская, Krasińskiego, Brinkmann-Str. — Сфармавалася на пачатку XX ст. як адна з вуліц «Новага свету».

Бялінскага № 2 — Драўляны будынак пачатку XX ст.

Бялінскага № 4 — Драўляны будынак пачатку XX ст.

Бялінскага № 5 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад эклектыкі.

Бялінскага № 6 — Моцна перароблена мураваная эклектыка пачатку XX ст.

Бялінскага № 6а — Моцна перароблена мураваная эклектыка пачатку XX ст.

Бялінскага № 8 — Моцна перароблена мураваная эклектыка пачатку XX ст.

Бялінскага № 9 — Драўляны аднапавярховы будынак пачатку XX ст. Выключна эстэтычныя элементы дэкору, з якіх перш за ўсё выдзяляюцца ўпрыгожаныя разьбою дзверы.

Бялінскага № 12 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Звычайны прыклад эклектыкі.

Валковіча // Северная, Północna, Udet-Str. — Вуліца сфармавалася пасля куплі гарадскімі ўладамі зямель у князёў Друцкіх-Любецкіх у другой палове XIX ст. у квартале «Новы свет». Да гэтага на яе месцы ў канцы XVIII ст. знаходзіўся комплекс пабудоў вайсковых казарм. Асноўная гістарычная забудова адносіцца да перыяду пасля пажару 1885 г. — росквіту эклектыкі, канструктывізму 20–30-х гадоў XX ст. ды некалькі дамоў пачатку 1950-х гадоў.

Валковіча № 1 — Казармы ў прыватных дамах, гарадскі шпіталь, школа, прыродазнаўчы музей С. Жыўны, корпус сельгасуніверсітэта. Пабудаваны на пачатку XX ст. У пачатку 1920-х гадоў гаспадарамі будынка былі А. Мінкова і С. Яблакаў, якія ў 1924 г. прадалі яго гораду. Апошні прытулак ажно да свайго закрыцця ў 1927 г. гродзенскай беларускай школкі.

Валковіча № 3 — Год пабудовы — 1885. Пасля рамонту страціў сваю аўтэнтычнасць.

Валковіча № 4 — Год пабудовы — 1917. Выключны прыклад спалучэння элементаў эклектыкі і мадэрну. Захаваўся прыгожы чыгунны гаўбец працы Вячоркі з Беластока.

Валковіча № 5 — Пабудаваны на пачатку XX ст. «Местачковы» варыянт эклектыкі. На доме захаваліся драўляныя ўпрыгожанні.

Валковіча № 5а — Пабудаваны на пачатку XX ст. «Местачковы» варыянт эклектыкі. Восенню 1941 г. тут жыў беларускі гісторык Вацлаў Пануцэвіч (Папуцэвіч).

Валковіча № 9 — Пабудаваны на пачатку XX ст. На доме гаўбец работы майстэрні Качаноў з Гродна.

Валковіча № 11 — Пабудаваны на пачатку XX ст. «Местачковы» варыянт эклектыкі.

Валковіча № 23 — **Дом суддзі Аніхімоўскага**. Пабудаваны на пачатку XX ст. Гарадскі асабняк з вельмі асаблівымі элементамі дэкору. У дварэ захаваўся будынак крамкі з пачатку мінулага стагоддзя.

Васількa // Пясочная-Ганчарная, Rydza-Smiglego, Insterburger str., Чапаева — У XVIII ст. тут знаходзіліся гарадскія выганы і тылы «пятроўскіх» фартыфікацый. Асноўная захаваная забудова адносіцца да канца XIX — пачатку XX ст.

Васількa № 3 — **Паравы млын Ашэра Касоўскага**. Год пабудовы — 1890–1916. Прыклад прамысловай архітэктуры. Знесены летам 2007 г.

Васількa № 4 — Год пабудовы — 1901. Эклектыка з элементамі мадэрну — чыгунны гаўбец, лесвічныя парэнчы.

Васількa № 5 — **Яўрэйская малітоўная школа.** Пабудаваны на пачатку XX ст.

Васілька № 7 — Год пабудовы — 1903. Хутчэй за ўсё дом гаспадара яўрэйскай малітоўнай школы.

Васілька № 7а — Пабудаваны каля 1903 г. Невыразны прыклад гарадской забудовы пачатку XX ст.

Васілька № 8 — Год пабудовы — 1898. Прыклад эклектыкі з прыгожымі элементамі дэкору.

Васілька № 9 — Год пабудовы — 1912. Дом у стылі эклектыкі. Моцна перабудаваны.

Васілька № 10 — Пабудаваны ў 1891 г. у стылі эклектыкі. Некаторы час у гэтым доме жыў кіраўнік крымінальнай паліцыі Гродна.

Васілька № 11 — Год пабудовы — 1899. Прыклад стылю эклектыкі.

Васілька № 12 — Пабудаваны ў 1886–1900 гг. Захавалася планіроўка гарадскога дворыка пачатку мінулага стагоддзя з уязной брамаю.

Васілька № 14 — Год пабудовы — 1890. Даходны дом.

Васілька № 14а — Год пабудовы — 1890. Тыповы гродзенскі флігель. Моцна перароблены падчас рамонту.

Васілька № 16 — Год пабудовы — 1900.

Васілька № 18 — Год пабудовы — 1888.

Бюст Васілю Іванавічу Чапаеву — Устаноўлены ў 1981 г.

Васілька № 28, 30 — Цэнтральная аварыйна-дыспетчарская служба. Тыповыя гарадскія камяніцы канца XIX ст.

Васілька № 29 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Тыповы прыклад гарадской архітэктуры пасля пажару 1885 г.

Васілька № 32 — Год пабудовы — 1912. Эклектыка.

Васілька № 33 — Пабудаваны, верагодней за ўсё, на пачатку XX ст. у індывідуальным, арыгінальным стылі. Магчыма, уваходзіў у комплекс дзіцячага прытулку.

Васілька № 34 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Васілька № 38 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Віленская // Віленскі завулак, Wileńska, Zakręt, Kraemegrasse — Адрэзак ад перакрыжавання вуліц Ажэшкі і Савецкай і да моста цераз Гараднічанку сфармаваўся яшчэ на пачатку XV ст. Згодна М. Ткачову, менавіта на гэтым месцы магла знаходзіцца «Віленская брама» магістрата. Частка вуліцы, якая знаходзіцца за Гараднічанкай, адносіцца да пачатку XX ст. і згодна з генпланам падпадае пад знос.

Аўтастаянка — На гэтым месцы ў 1907 г. Міна Фрумкіна пабудавала лазню ў якой, між іншым, была міква — месца для рытуальных абмыванняў

у юдаізме. Пазней — першы ў горадзе медвыцвярэзнік. Разабраны ў 1970-я гады.

Каралеўская крыніца — Упершыню згадваецца ў дакументах за 1498 г. У 1990-х атрымала мастацкае афармленне ў дрэве работы У. Церабуна з тэкстамі А. Госцева: «Цані ваду — мінеш бяду»; «Глыток вады — няма бяды»; «Калодзеж чысты — настрой празрысты», якое зараз ужо не існуе…

Віленская № 1 — Турэцкая кавярня, ЗАГС, бар «Віленскі». Год пабудовы — 1888.

Віленская № 6 — Бар «Южны». Год пабудовы — 1890.

Віленская № 14 — Год пабудовы каля 1900.

Віленская № 20 — ААА «Белатракцыён». Драўляны. Пабудаваны на пачатку XX ст.

Віленская № 22 — Комплекс Гродзенскага лікёра-гарэлачнага завода.

Віленская № 25 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Двухпавярховы. Добры прыклад эклектыкі.

Віленская № 27 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Цікавы прыклад эклектыкі.

Віленская № 29 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Двухпавярховы. Цікавы прыклад эклектыкі.

Віленская № 33 — База ЖЭС-8. Пабудаваны на пачатку XX ст. Моцна перабудаваная эклектыка.

Віленская № 37 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Двухпавярховы. Цікавы прыклад эклектыкі.

Вялікая Траецкая // Вялікая Траецкая, Wyzwolienia, Pereca+Nochima, Gerberweg, Алега Кашавога. — Адна з найстаражытных вуліц горада.

Вялікая Траецкая № 2 — Талмуд Тора, Рамеснае вучылішча Брэгмана. Год пабудовы — 1888.

Вялікая Траецкая № 4 — Лабараторны корпус медуніверсітэта. Пабудаваны ў 1930-х гадах. Прыклад канструктывізму. Памятныя дошкі М. Караблёву, Шчаснаму і Роліку.

Вялікая Траецкая № 5 — Год пабудовы — 1880.

Вялікая Траецкая № 7 — Год пабудовы — 1900.

Вялікая Траецкая № 8 — Год пабудовы — 1880.

Вялікая Траецкая № 8а — Год пабудовы — 1880.

Вялікая Траецкая № 13 — Малітоўная школа Хаем Адам. Год пабудовы — каля 1875 (мураваны будынак пазначаны на гэтым месцы ўжо на мапе 1867 г.). Тут вучыліся паэт Найдус, фізік Старавольскі.

Вялікая Траецкая № 14 — Моцна перабудаваная эклектыка.

Вялікая Траецкая № 16 — Пасля перабудовы ўключае ў сябе комплекс будынкаў 1880–1889 гг. У тым ліку — дом гродзенскага вадавоза.

Вялікая Траецкая № 21 — Моцна перабудаваная эклектыка.

Вялікая Траецкая № 23 — Год пабудовы — 1890.

Аўтастаянка — Прыкладна ў гэтым месцы, на перакрыжаванні сучасных вул. В. Траецкай і Дамініканскай напрыканцы XV ст. быў заснаваны кляштар аўгусцінаў з касцёлам Св. Троіцы.

Могілкі на вуліцы Крывой, старыя яўрэйскія могілкі — Паўсталі яшчэ ў канцы XIV ст. Абшар былых могілак ахоплівае тэрыторыю ўздоўж сённяшняй аўтастаянкі да сінагогі.

Вялікая Траецкая № 29 — Прыклад невыразнай эклектыкі.

Вялікая Траецкая № 31 — Пабудаваны ў канцы XIX ст.

Вялікая Траецкая № 32 — Год пабудовы — 1925. Моцна перабудаваны.

Вялікая Траецкая № 33 — Год пабудовы — 1900. Прыклад эклектыкі.

Вялікая Траецкая № 42 — Новабуд на месцы камяніцы 1889 г.

Вялікая Траецкая № 44 — Новабуд. Падчас будаўнічых прац у 2002 г. тут быў знойдзены грашовы скарб — каля 100 манетаў XVI–XVII стст.

Вялікая Траецкая № 46 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка. Пасля апошняй перабудовы захавалася толькі сцяна фасада.

Вялікая Траецкая № 47 — Год пабудовы — 1918.

Вялікая Траецкая № 57 — Малітоўная школа для дзяўчынак «Кляўз». Год пабудовы — 1890.

Вялікая Траецкая № 59а — Галоўная сінагога Хаем Адам. Пабудавана каля 1575–1578 гг. Аўтар праекта італьянскі архітэктар Санці Гучы (па іншых звестках — Мардухаям Яфе), які шмат будаваў для караля Стэфана Баторыя. Па традыцыі яго запрасіў для будаўніцтва галоўнай сінагогі ў Гродне вядомы ва ўсёй Еўропе гродзенскі равін Іофэ, па прозвішчы Левуш. Пазнаёміліся яны хутчэй за ўсё ў Італіі, дзе Левуш вучыўся ва універсітэце. Па сведчанні прафесара Гаркаві, на ўнутранай сцяне гродзенскай сінагогі да пажару 1899 г. знаходзіўся надпіс, што архітэктар, запрошаны для будаўніцтва сінагогі, так спадабаўся каралю Стэфану Баторыю, што ён яго наняў для будаўніцтва замка і касцёла «Фара Вітаўта». Пасля пажару 1889 г. адрамантаваны і набыў рысы стылю мадэрн. Відавочна, рамантаваў сінагогу той самы архітэктар, які будаваў дом для купца Мураўёва на Савецкай плошчы.

Гарадзенскага Давыда // Podzamcze, Новазамкавая

Гарадзенскага № 3 — Прачысценская царква, манастыр базыльянак, храм Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі, манастыр Раства Багародзіцы, былы Музей атэізму і рэлігіі. Пабудаваны ў 1726–1751 гг. замест згарэлага драўлянага манастыра архітэктарам І. Фантана. У 1860-я гг. прыбудавана «цёплая» царква св. Сергія Раданежскага, у 1891 г. да ўсходняга тарца жылога корпуса прыбудаваны павярховы гаспадарчы корпус. Перад галоўным фасадам царквы ў 1980 г. выяўлены рэшткі Прачысценскай царквы з другой паловы XII ст.

Гараднічанская // «Вуліца, якая цягнецца ўздоўж вуліцы Яна Хайноўскага да вады», Скальманоўская, Mistrzowska, Jezuicka, Allensteiner Str., Энгельса — Сфармавалася ў XV–XVI стст. Першая згадка аб вуліцы адносіцца да 1561 г. У 1970-я гады адрэзак вуліцы, які выходзіў на вуліцу Ажэшкі ад перакрыжэвання з вуліцай Карбышава, быў знесены.

Гараднічанская № 13 — гл. Тэльмана № 9.

Гараднічанская № 15 — Год пабудовы — 1920. Тыповая гарадская камяніца без асаблівых рысаў.

Гараднічанская № 17 — Год пабудовы — 1900. Капітальна перароблены.

Гараднічанская № 19 — Год пабудовы — 1886. Гаспадаром дома ў 1901 г. быў вядомы выдавец літаратуры на ідыш, які надрукаваў у тым ліку і вершы Найдуса.

Гараднічанская № 20 — Гатэль «Раяль». Год пабудовы — 1904. У гатэлі спыняліся кайзер Вільгельм II і маёр Д. Эйзенхаўэр — будычы амерыканскі прэзідэнт, сябры ўрада БНР А. Цвікевіч, А. Галавінскі і авантурыст А. Бахановіч. У канцы 1920 г. ў «Раялі» Гродзенская грамада беларускай моладзі прэзентавала гледачам спектаклі «Мядведзь» ды «Міхалка».

Гараднічанская № 21 — Год пабудовы — 1901. Эклектыка.

Гараднічанская № 22 — Год пабудовы — 1900. Пасля капрамонту ў 1975 г. значна страціў стылёвыя рысы.

Гараднічанская № 23 — Дом гісторыка Карнілава. Год пабудовы — 1890.

Гараднічанская № 24 — Год пабудовы — 1901. Эклектыка. Страціў архітэктурныя рысы пасля капрамонту.

Гараднічанская № 24а — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка. Страціў архітэктурныя рысы пасля капрамонту.

Гараднічанская № 24/1 — Год пабудовы — 1902. Эклектыка.

Гараднічанская № 25 — Канспіратыўная кватэра царскай ахранкі ў Гродне. Год пабудовы — 1900.

Гараднічанская № 26 — Год пабудовы — 1910. Эклектыка. Перабудаваны.

Гараднічанская № 27 — Год пабудовы — 1898. Эклектыка. Захаваліся даволі рэдкія аздобленыя ўваходныя дзверы.

Гараднічанская № 28 — Год пабудовы — 1910. Перабудаваны.

Гараднічанская № 29 — Год пабудовы — 1923.

Гараднічанская № 30 — Год пабудовы — 1929. У канцы 1920-х гадоў тут месцілася сядзіба Гродзенскага павятовага сакратарыята Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба.
У 1870-я гады на рагу Рэзніцкай (Кірава) і Гараднічанскай стаяў дом Макіявельскай, унук якой пазней стаў акадэмікам.

Гараднічанская № 31. Пабудаваны напрыканцы XX ст. Пасля капрамонту страціў архтэктурную каштоўнасць.

Гараднічанская № 38 — Год пабудовы — 1900. Даходны дом.

Гараднічанская № 38а — Год пабудовы — 1900. Капітальна перабудаваны.

Гараднічанская № 42 — Пабудаваны паміж 1886 і 1896 гг.

Гарнавых // Ліпова, Lipowa-Grochowska, Fabrikstr. — Адна з галоўных магістраляў у занёманскай частцы Гродна. Да 1940-х гадоў была забудавана ў большасці драўлянымі дамамі. Рэканструявана ў пасляваенны час. Зараз у працэсе рэканструкцыі моста цераз Нёман расшыраецца за кошт зносу пабудоваў пачатку XX ст.

Месца гібелі старшага палітрука Р. Гарнавых — Чырвонаармеец Р. Гарнавых загінуў 20 верасня 1939 г. у час савецка-польскіх баёў за Гродна. У 1965 г. на месцы яго гібелі ўстаноўлены мемарыяльны знак.

Гарнавых № 17 — Палац хімікаў, філармонія. Год пабудовы — 1974. Прыклад універсальнага клубнага збудавання.
Месца, на якім пабудаваны палац, у народзе меў назву «п'яны вугал».

Гарнавых № 31 — Szkola powszechna im. Zeromskiego, СШ № 6.

Горкага // Мярэчская застава, Грандзіцкая застава, Grandzicka, Hochmeisterstr. — Першапачаткова развівалася як гасцінец Варшава—Вільня. Адзін з падарожнікаў, наведаўшы ў 1793 г. Гродна, пісаў, што адразу за горадам пачынаецца шырокая брукаваня дарога, абведзеная з абодвух бакоў ірвамі і акаймлёная дрэвамі. Канчаткова сфармавалася ў сярэдзіне XIX ст. Вуліца ў значнай ступені страціла сваю архітэктурную каштоўнасць у 1949-я, 1970-я і 2006-я гады ў сувязі з чарговымі «рэканструкцыямі».

Горкага № 1 — Комплекс будынкаў гарадской (акружной) лячэбніцы, 221-шы палявы запасны шпіталь, казармы Гінзбурга, казармы польскай жандармерыі, Гродзенскі памежны атрад. Пабудаваны ў 1895–1912 гг. Ар-

хітэктары М. Плотнікаў і інжынер Л. Сямёнаў. Гэта быў спецыяльны праект, які ўлічваў не толькі «колькасць ложкамесцаў», але і спецыфіку, па сённяшніх патрэбах, абласной бальніцы. Праект бальніцы быў прыстасаваны для методыкі лячэння, утрымання хворых розных катэгорый і агульнай гігіены. На тэрыторыі акружной бальніцы ў 1915 г. «у рамках вытворчага семінару» быў пабудаваны «ўзорны агенцкі будынак», які, на жаль, не захаваўся.

Горкага № 2/2 — Палац віцэ-адміністратара, «кватэра паўнамоцнага расійскага пасла», дом Дзяконскага, палац Валіцкага, архірэйскі дом, корпус медуніверсітэта. Спраектаваны І. Мёзерам у 1776–1778 гг., як частка комплексу Гарадніцы. Будаўніцтва скончана толькі ў 1793 г. Рэдкі для Гродна прыклад класіцызму. Існавалі насценныя роспісы прыкладна канца XIX ст. У пачатку 1919 г. тут знаходзілася беларуская вайсковая камендатура, у 1921 г. працавала беларуская гімназія.
У сярэднявеччы згаданы участак прымыкаў да Віленскага тракта. Верагодна, тут была пабудавана царква Св. Мікалая. Упершыню яна згадваецца ў 1560 г. На сярэдзіну XVIII ст. на месцы царквы застаўся толькі крыж ды могілкі.

Горкага № 2 — Флігель палаца адміністратара. Пабудаваны ў 1783–1793 гг. па праекце Дж. Сака. У 1875 г. асвечана дамавая царква св.Іаана Прэдцечы.

Горкага № 2 а — Флігель палаца адміністратара, казармы Якавюка, сядзіба Расійскага дабрачыннага таварыства. Пабудаваны ў 1783–1793 гг. па праекце Дж. Сака. Разабраны летам 2007 г. з мэтай пабудаваць на гэтым месцы дамавую царкву на 500 вернікаў.

Горкага № 3 — Год пабудовы — 1915.

Горкага № 5 — Магазін Яблонскага. Год пабудовы — 1924. Прыклад драўлянага канструктывізму.

Горкага № 7 — Пабудаваны ў 1930-х гадах.

Горкага № 13 — Пабудаваны на пачатку XX ст.

Горкага № 15 — Пабудаваны на пачатку XX ст.

Горкага № 17 — Пабудаваны на пачатку XX ст.

Горкага № 21 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Магчыма, што тут жыў гісторык Д. Мілюцін — аўтар шэрагу прац, прысвечаных мінуламу Гродзеншчыны.

Горкага № 23 — Аптэка Юдэйкі, гарадская аптэка № 2. Пабудаваны на пачатку XX ст.

Горкага № 27 — гл. 17 верасня № 1.

Горкага № 29 — Дом Пашковічаў, крама «Гарачы хлеб». Пабудаваны ў 1936 г. на гэтакзванай «Залатой горцы». Выдатны помнік архітэктуры кан-

структывізму. 6 кастрычніка 2006 г. ў 8 гадзін 45 хвілін раніцы быў знішчаны. За апошнія некалькі месяцаў свайго існавання ён паспеў стаць сімвалам змагання за захаванне гістарычнай спадчыны Гродна.

Горкага № 47а — Натарыяльная кантора. Тыповы гарадскі асабняк 1930-х гадоў у стылі сэцэсія.

Горкага № 72 — Дом тэхнікі. Пабудаваны ў 1984 г. па праекце архітэктараў В. Бажко і У. Праабражэнскага.

Горкага № 80 — Галоўны корпус медыцынскага інстытута. Пабудаваны ў 1975 г. Архітэктары Л. Вільчко і В. Давыдзёнак. Прыклад вучэбных збудаванняў савецкай архітэктуры 1970-х гадоў.

Дамініканская // Вуліца з боку Нямецкага рынка да Віленскай, завулак Троіцкі, Калакольны завулак, Magistracka, Mauergasse, Клары Цэткін — Сфармавалася каля XV ст.

Дамініканская № 3 — Год пабудовы — 1880.

Дамініканская № 9 — Год пабудовы — 1897.

Дамініканская № 17 — Стары яўрэйскі дзіцячы прытулак. Пабудаваны ў 1900 г. на месцы старога яўрэйскага шпіталя.

Дамініканская № 19 — Пабудаваны на пачатку XIX ст.

Дзяржынскага // Лапенская, Тэатральная-Акцызная плошча, Сапёрная, Pionerska, Narutowicza, Tannenberg-Str. — На адрэзку ад плошчы Тызенгаўза да перакрыжавання з вул. 17 верасня сфармавалася паводле праектнага плана Гарадніцы І. Мёзера 1765–1783 гг. Ад перакрыжавання з вул. 17 верасня да Церашковай — у другой палове XIX ст. Канчатковыя памеры набыла з забудовай мікрараёна Дзевятоўка.

Дзяржынскага № 1 — Манеж, Стары гродзенскі тэатр, Тэатр лялек — Год пабудовы — 1793. Задуманы як працяг палаца Тызенгаўза — злучаўся з яго левым флангам крытым пераходам. Рэканструяваны ў 1859, 1940 і 1970 гг.

Скульптурная кампазіцыя — Выява чалавека ў касцюме XVIII ст. — умоўна лічыцца помнікам Жану Эмануэлю Жыліберу. Устаноўлена ў 2007 г. Аўтар А. Панцялееў.

Дзяржынскага № 1а — Былы склад на Гарадніцы, Лямус, рэстаўрацыя «Стары Лямус». Пабудаваны ў 1765–1780 гг. У 1939 г. пераабсталяваны ў жылы дом. У 2005–2006 гг. перапланаваны пад рэстаўрацыю.

Дзяржынскага № 1/1 — Народны дом, 1-шы дывізійны лазарэт 6-й пяхотнай дывізіі, teatr «Dom Zołnierza», гарадскі Дом культуры. Пабудаваны ў 1904 г. паводле праекта Л. Лангада і М. Раманава. Помнік грамадзянскай архітэктуры пачатку XX ст.

Дзяржынскага № 8 — Пакгауз на Гарадніцы. Пабудаваны ў 1765–1780 гг. Уваходзіць у комплекс забудоў СШ № 10.

Дзяржынскага № 10 — Дом Вагнераў. Пабудаваны ў 1930- х гадах.

Дзяржынскага № 12 — Год пабудовы — 1930.

Дзяржынскага № 14 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад таннай гарадской камяніцы.

Дзяржынскага № 15, 17 — Казармы 4-га сапёрнага батальёна, казармы Панятоўскага, Вайсковы шпіталь. Год пабудовы — 1895. Аўтар праекта — вайсковы інж. генерал-маёр Штальман. Эклектыка. Будынак заўсёды

выкарыстоўваўся вайскоўцамі. Салдаты, стоячы на варце, пакідалі на цэглах уласныя імёны, даты. З боку вул. Дзяржынскага можна адчытаць наступныя графіці: «Рядовой Иван Нить, 1893», «jefrejtar Bolek z Gdyni, 1931», «Jozaf Szafrański, 1934», «1942, Содыков А. П., II.1942» і інш.

Дзяржынскага № 19 — Пабудаваны ў 1920–1930-х гадах. У двары дома знаходзіліся нямецкія вайсковыя могілкі часоў Першай сусветнай вайны.

Дзяржынскага № 20 — Мураваны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Дзяржынскага № 20а — Пабудаваны на пачатку XX ст. Драўляны, двухпавярховы, з элементамі канструктывізму.

Дзяржынскага № 28 — Амбулаторыя Чырвонага Крыжа, паліклініка для хворых на сухоты; Kasa chorych, інфекцыйная бальніца, корпус мастацкага аддзялення Гродзенскага дзяржуніверсітэта. Год пабудовы — 1914. Яскравы прыклад цаглянага стылю эклектыкі.

Дзяржынскага № 30 — «Трастбанк». Пабудаваны на пачатку XX ст. Малавыразная эклектыка пасля капрамонту.

Дзяржынскага № 32 — Саюз палякаў Беларусі. Поўнасцю перабудаваны на пачатку 1990-х гадоў з пераносам у глыб вуліцы. Перад будынкам у 1998 г. усталяваны **бюст А. Міцкевіча** працы А. Заспіцкага.

Былая КЭЧ — У канцы 1941 г. праз некалькі месяцаў ад пачатку акупацыі за цяперашнім хлебакамбінатам у раёне вуліцы Дзяржынскага немцы стварылі лагер для савецкіх ваеннапалонных.

Перакрыжаванне вуліц Дзяржынскага і Церашковай — Брацкая магіла рускіх салдат, якія загінулі у 1915 г. Знішчана на працягу апошніх гадоў пры будоўлі камунікацыяў і новага дома.

Дзяржынскага № 41/2 — Мемарыяльная дошка камсамольцам-падпольшчыкам. Усталявана ў 1967 г. на ўшанаванне памяці членаў скідальскай падпольнай камсамольска-маладзёвай арганізацыі.

Аўтастаянка — Былы цагельны завод. У ліпені 1944 г. месца бою 508-га стралковага палка.

Дзяржынскага № 88 — Аптэчны склад. Уваход на тэрыторыю прадпрыемства «ўпрыгожвае» брама, зробленая са старой агароджы гарадскога парку.

Форт № 6 фортавай лініі 1887–1892 гг. — На паўночны захад ад канцавога прыпынку тралейбусаў № 7, 10, 11, 12 на Дзевятоўцы. Да апошняга часу захоўваліся значная частка валоў і равоў з усходняга боку.

2-я працоўная // Gerberweg, Рынкавая

2-я працоўная № 2 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Заводская // Садоўніцкая, Агародная, Karmelicka, zaulek Ogrodowy, wybrzeze Pierackiego, Ritterstr. — Галоўная вуліца гродзенскага падзамча. Сфармавалася ў XII–XVI стст. Знаходзіцца на тэрыторыі Падола — неўмацаванага сярэднявечнага пасада. Першыя дакладныя згадкі пра забудову і ўладальнікаў нерухомай маёмасці вуліцы паходзяць з XVI ст. Галоўную групу насельніцтва вуліцы складалі каралеўскія садоўнікі. У XVI–XVIII стст. спіс уладальнікаў пашырылі Радзівілы, Агінскія, Сапегі ды бернардзінкі.

Заводская № 2 — Палац Сапегаў, палац Агінскага над Нёманам, піўзавод. Пабудаваны у пачатку XVIII ст. Перабудаваны ў 1877 г. архітэктарам Вало. Помнік прамысловага будаўніцтва.

Галоўнай дамінантай гэтага гарадскога раёна лічыўся палац Сапегаў. Як сведчаць матэрыялы архіва гэтага роду, у 1530 г. кароль Жыгімонт пацвердзіў віцебскаму ваяводу Івану Сапегу набыццё нерухомай маёмасці, у прыватнасці «палацаў над Нёманам» у Гародні. З 1555 г. паходзіць згадка аб тым, што Астафій Валовіч, які „мел дворец Сапеженьский [...] на сей стороне Немна от места Городенского», абмяняў гэтую нерухомасць на палац войта Пятра Шаматулы. Паводле плана Гародні 1706 г. палац належаў троцкаму ваяводу Юзафу Агінскаму. Звесткі 50–70-х гадоў XVIII ст. сведчаць аб тым, што палацам з афіцынамі валодаў польны літоўскі пісар, будучы гетман вялікі літоўскі Міхал Казімір Агінскі. У тарыфе падымнага падатку Гародні 1775 г. пры апісанні вуліцы Садоўніцкай адзначаны «палац мураваны» вялікага літоўскага гетмана Агінскага. У 1779 г. пасэсію за 35000 злотых набылі гарадзенскі маршалак Казімір і Ганна з Хлявінскіх Вольмеры, а ў 1789 г. нерухомасць перайшла да літоўскага канцлера Аляксандра Сапегі. У 1801 г. яе ўладальнікам быў граф Міхал Дзяконскі. У XIX ст. нерухомасць належала Юзафу Кунцу (1830–1903), аўстрыйскаму падданаму. У будынках былі размешчаны бровар і саладоўні. Гродзенскі піўзавод быў створаны ў 1877 г. у былым палацы Сапегаў. Першым яго ўладальнікам быў купец Кунц. У год стварэння піўзавода ў горадзе працавала яшчэ 4 меншыя піўзаводы. На заводзе Кунца працавала 18 чалавек (на ўсіх піўзаводах горада — 35 чалавек). Завод даваў 64400 вёдраў піва на год. У 1897 г. Восіп Кунц перадаў справу свайму сыну Ігнацію Кунцу, які кіраваў заводам да 1911 г. У 1911 г. Кунц падчас праверкі, якая высветліла парушэнні ў тэхналогіі вырабу піва, памёр, і завод перайшоў да яго зяця Краткоўскага. У 1914 г. завод выпрабляў ужо 315000 вёдраў на год. У 1918–1930 гг. заводам валодаў Юдэль Марголіс і яго сям'я. Пасля банкруцтва сям'і Марголісаў у студзені 1933 г. завод купіў варшаўскі мільянер Гелер Гарацкі. У 1939 г. завод выпускаў каля 385 тысяч дэкалітраў піва і розных напояў. Пасля рэканструкцыі 1950 г. у дадатак да піва «Баварскае» пачалі выпускаць піва «Аксамітнае», «Украінскае», «Карамельнае». З 1957 г. на заводзе запрацавала першая аўтаматычная лінія. За-

чынены летам 2007 г. У сувязі з рэканструкцыяй моста цераз Нёман прадугледжана знішчэнне значнай часткі комплексу.

Заводская № 6 — Klub Kresowija. Год пабудовы — 1922. Прыклад сэцэсіі.

Заводская № 12 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка. Знішчаны вясной 2006 г. падчас «упарадкавання» набярэжнай.

Заводская № 13 — Пабудаваны у пачатку XX ст. Пасля рэканструкцыі страціў частку гістарычнай аўтэнтычнасці. Знаходзіўся каля спуску да старой пераправы цераз Нёман (зараз не існуе).

Замкавая // Вуліца яўрэйская з рынка на замак, Яўрэйская, Zamkowa-Sw. Kazimierza, Burgstr. Упершыню згадваецца ў судовых дакументах 30–40-х гг. XVI ст. Значэнне вуліцы вырастае ў XVI ст., калі змяншаецца абарончая функцыя замка. Да гэтага традыцыйны шлях да замка з боку моста над Нёманам ішоў па падножжы замкавай гары і быў даволі цяжкім і небяспечным. Таму функцыя камунікацыйнай артэрыі Гродна, што звязвала замак з галоўным рынкам горада, паступова пераходзіць вуліцы Замкавай.
Сквер на рагу плошчы Савецкай і вуліц Замкавай і Кастрычніцкай — месца знаходжання былой **Фары Вітаўта.** Тут прыкладна ў 1389 г. вялікім князем літоўскім Вітаўтам быў заснаваны першы каталіцкі храм горада. Уяўляў сабой аднанефавы прамавугольны ў плане будынак пад двухсхільным дахам і з вуглавой цыліндрычнай шмат'яруснай вежай. Драўляны храм неаднаразова перабудоўваўся — у 1494 г. рэканструяваны вялікім князем Аляксандрам, у 1551 г. — каралевай Бонай. У крыніцах XVI ст. згадваецца як «польскі храм у горадзе» («Templum Polonorum in Urbe»). Замест яго ў 1584–1587 гг. паводле загада і за кошт караля Стэфана Баторыя італьянскімі дойлідамі (вядомы Антоні Дзігрэп), які перабудоўваў таксама палац Старога гродзенскага замка ў формах рэнесансу пад кіраўніцтвам архітэктара Скота з Пармы, узведзены мураваны храм. Касцёл размяшчаўся на ўзгорку каля Гандлёвай плошчы, да якой быў арыентаваны алтарнай апсідай. З'яўляўся помнікам гатычна-рэнесанснага (маньерыстычнага) стылю з элементамі абарончага дойлідства. У падзямеллях касцёлу больш за год захоўвалася пасля смерці цела караля Стэфана Баторыя, перш чым яго перавезлі ў Кракаў. Неаднаразова перабудоўваўся. У 1782 г. будынак касцёла моцна пацярпеў ад пажару, які знішчыў верхнія ярусы вежаў. У 1804–1807 гг. тут праведзены аднаўленчыя работы, пасля чаго храм быў асвечаны як праваслаўны Сафійскі сабор. Перабудаваны ў 1870-я гады архітэктарам Гур'евым. Пры Свята-Сафійскім саборы ўтрымоўваліся восем царкоўных школаў для дзяцей, чатыры гарадскія вучылішчы, Сафійскае брацтва. У саборы захоўваліся такія праваслаўныя святыні, як перламутравы крыж з часткай мошчаў св. Пятра, мітрапаліта Маскоўскага і ўсяе Русі цудатворца, драўляныя крыжы з часціцамі святых мошчаў благаверных князёў Канстанціна, Міхаіла, Фёдара

і чад яго, Мурамскіх цудатворцаў. Меўся абраз Спасіцеля ў срэбнай рызе, ахвяраваны сялянамі ў 1863 г. На калоне знаходзілася цудатворная ікона Казанскай Маці Божай, якую ўжо пасля Першай сусветнай вайны перанеслі ў Свята-Пакроўскую царкву (гл. Ажэшкі № 23). Пасля пажару 9 мая 1892 г. сабор быў моцна пашкоджаны. Сярод прычын падпалу называлі дзяцей, якія быццам бы лазілі гуляць на званарню. Падчас пажару званы адзін за другім упалі на землю, прабіўшы чатыры столі званарні. Два вялікія званы (самы большы ватыў 155 пудоў) далі моцныя трэшчыны. Пасля пажару ў канцы 1890-х гадоў перабудаваны ў руска-візантыйскім стылі паводле праекта акадэміка архітэктуры варшаўскага епархіяльнага архітэктара М. Чагіна пад кафедральны Свята-Сафійскі сабор. Пасля перабудовы пад праваслаўны сабор набыў традыцыйнае пяцікупалле на высокіх барабанах, какошнікі, з усходняга боку — апсіду, з паўночнага боку — прыдзел. Званіца стала вышэйшай і завяршалася шатром з макаўкай. Мастацкае афармленне храма было даручана мастакам Мураўёву і Белавусаву. Усе працы па перабудове былі праведзены падрадчыкам А. Лімонавым под наглядам архітэктара В. Храсціцкага. На адбудову храма паступілі сродкі ад сям'і імператара, жонкі гродзенскага губернатара графіні С. Борх, фрэйлін Ланскіх. Напрыклад, званы для царквы падарыў купец О. Собалеў, яўрэі з Лунна ахвяравалі абраз Прэабражэння Гасподняга ў залатым ківорце. Большую частку будаўнічых матэр'ялаў падараваў гродзенскі купец Фрумкін. З 1919 г. храм вернуты каталікам і выкарыстоўваўся як гарнізонны касцёл. Перабудаваны пасля пажару ў 1923 г. архітэктарам В. Генебергам і ў 1935 г. архітэктарам А. Сасноўскім, храм набыў рысы раманска-гатычнага стылю. Алтарная апсіда была адбудавана да ранейшай вышыні, адноўлены высокі кроквенны дах. Над ніжнімі чацверыкамі цэнтральнай вежы ўзведзены два невысокія васьмерыковыя ярусы, завершаныя сціплым шатром. У такім выглядзе помнік перажыў Другую сусветную вайну. Пасля Вялікай Айчыннай вайны не дзейнічаў. Магчыма, з 1958 г. тут быў інтэрнат медінстытута (адрас — Замкавая № 1). 8 сакавіка 1961 г. Гродзенскі гарвыканкамам прыняў пастанову № 213 «Аб зносе аварыйнага будынка ваеннага касцёла на плошчы Савецкай». Для выканання рашэння гарвыканкама была ўтворана спецыяльная камісія ў складзе: намесніка старшыні Гродзенскага гарвыканкама В. Тупоўскага, начальніка міліцыі П. Назаркіна, загадчыка прамыслова-транспартнага аддзела гаркама КПБ В. Пясэцкага, загадчыка абладдзела па справах будаўніцтва і архітэктуры М. Макарава, начальніка аддзела капітальнага будаўніцтва Гродзенскага гарвыканкама В. Ледухоўскага і дырэктара Абласнога музея Собаля. На здзяйсненне «аперацыі» з гарадскога бюджэта было выдзелена 19,5 тысячы рублёў. 29 лістапада 1961 г. у дзве гадзіны ночы рабочымі ленінградскага «Ленвыбухпрома», мясцовымі вайсковымі сапёрамі і супрацоўнікамі КДБ загад аб зносе храма быў выкананы. Тое, што засталося ад Фары Вітаўта, было

выкарыстана для часовага пакрыцця праезнай часткі вуліцаў, ходнікаў і дарожак.

Замкавая № 2 — Палац тэкстыльшчыкаў. На гэтым месцы знаходзіўся гэтакзваны Замкавы двор, пабудаваны каля 1540 г. Уяўляў вялікую трохпавярховую рэзідэнцыю ў стылі рэнесансу.

Замкавая № 3 — Дом Сафійскага брацтва на месцы плябаніі. Пабудаваны ў 1903 г. Эклектыка.

Замкавая № 4 — Дом быту. Год пабудовы — 1971 г. Пры пабудове была знішчана трасіроўка вул. Кляштарнай і камяніцы XVII–XVIII стст. па вул. Замкавай — **Дом рыбака** — гарадскі дом XVIII ст., у якім жыў галава гродзенскіх рыбакоў Антоній Максімовіч.

Замкавая № 5 — Камяніца Масальскіх, інтэрнат медуніверсітэта. Год пабудовы — 1643. Самы стары жылы будынак у горадзе. 28 сакавіка 1920 г. тут прайшоў агульны сход Гродзенскага Беларускага нацыянальнага камітэта. Восенню таго ж года адбываліся беларускія сямейныя вечарыны і запіс у Грамаду беларускай моладзі. У 1925 г. жыў беларускі дзеяч М. Галавач.

Замкавая № 6 — Трохпавярховы дом з крамай.

Замкавая № 7 — Былы палац Масальскіх, дом Собаля. Год пабудовы — 1643. Пасля пажару 1899 г. частка будынка аказалася разабранай, і на гэтым месцы пазней быў пабудаваны суседні дом. Рэшткі руінаў былі перабудаваны ў 1910 г.

Замкавая № 9 — Дом саветніка Івана Харчанкі. Год пабудовы — 1912. Эклектыка. Паўстаў на падмурках былога палаца Масальскіх. Ягоны колішні гаспадар І. Харчанка меў звычку пісаць вялікую колькасць скаргаў па самых розных прычынах, так што мог бы паспрачацца за званне аднаго з самых скандальных жыхароў Гродна.

Замкавая № 10 — Аднапавярховы з фасадным франтонам.

Замкавая № 11 — Дом Хаіма Стральца. Год пабудовы — 1906.

Замкавая № 12 — Даходны дом. Пабудаваны ў 1880, 1904 гг.

Замкавая № 12а — Пабудаваны ў 1880, 1905 гг.

Замкавая № 13 — Вінная лаўка Рохлі — Руткоўскай Рахель. Год пабудовы — 1901.

Замкавая № 14 — Год пабудовы — 1900. Мадэрн.

Замкавая № 15 — Год пабудовы — 1870.

Замкавая № 16 — Палац Храптовічаў, камяніца Мучынскіх, палац Лясніцкага, Музей атэізму і рэлігіі. Пабудаваны ў 1742–1752 гг., перабудаваны ў 1790 г. Унутраная планіроўка зменена ў 1970-я гады. Большая частка дома, утвараючы парадны ўнутраны двор, ідзе ў глыб квартала. На вуліцу выступае

толькі невялікі корпус, прарэзаны уязной аркай з чатырма пілястрамі дарычыскага ордэра. У архітэктуры будынка заўважны ўплывы рускага класіцызму канца XVIII — пачатку XIX ст., аднак маюцца і ўласныя своеасаблівыя рысы — раслінныя ляпныя гірлянды над праездам у двор; форма ліштваў вокан і інш.

Замкавая № 17 — Дом саветніка Анцылевіча. Год пабудовы — 1912.

Замкавая № 18 — Год пабудовы — 1920.

Замкавая № 19 — Былы флігель каралеўскіх канюшняў, пажарнае дэпо. Пабудаваны ў 1793 і 1902 гг. Рэканструкцыя дэпо ў верасні 2006 г. пачалася з таго, што экскаватарам быў моцна пашкоджаны культурны пласт.

Замкавая № 20 — Ніжні замак, Новы замак, вайсковы шпіталь, Гродзенскі абласны камітэт КПБ, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, Гродзенская абласная бібліятэка імя Я. Карскага. На месцы суседняй з дзядзінцам пляцоўкі берагавога ўзвышша Нёмана. Ніжні замак злучаўся з горадам драўляным мостам, які быў перакінуты ў бок горада. З будынкаў XII ст. на яго тэрыторыі вядома толькі Васкрасенская царква, якая хутчэй за ўсё была ўзведзена ў адным стылі з Каложскай і Ніжняй. Яе дакладнае месцазнаходжанне да гэтага часу яшчэ не высветлена. У XIV–XVII стст. — Каралеўскі двор. Паводле інвентара 1633 г. у каралеўскім двары, які ў дакуменце называецца «парканам», знаходзілася мураваная царква, вялікі аднапавярховы дом, дзе праводзіліся сеймікі шляхты Гродзенскага павета і пасяджэнні суда каралеўскай адміністрацыі, дом начальніка варты, кухня, пякарня, памяшканні для вартавых і каралеўскай чэлядзі.

Рашэнне аб будаўніцтве ў Гродне новага каралеўскага палаца на месцы былога каралеўскага двара было прынята на Сейме у 1726 г. пры каралю Аўгусту II Моцным. Аднак уласна будаўніцтва пачалося толькі ў 1737 г., ужо пры каралю Аўгусту III. Аўтарам праекта палаца быў вядомы саксонскі архітэктар Карл Фрыдрых Пёпельман, сын стваральніка аднаго з найпрыгажэйшых палацавых комплексаў у Еўропе — дрэздэнскага Цвінгера. Першапачатковы праект палаца меў непрапарцыянальныя формы, бо прадугледжваў выкарыстанне старых пабудоў, што знаходзіліся на тым месцы, адным з якіх быў драўляны палац Асалінскага — захавальніка каралеўскіх рэгалій і каштоўнасцей. Акрамя таго, каралю Аўгусту III, які ў адрозненне ад свайго бацькі мог лічыцца ўзорам у сямейным жыцці, не спадабалася, што ў гэтым праекце няма пакояў для каралевы, і ў выніку К. Пёпельман вымушаны быў перагледзець праект. Будаўніцтва палаца вялося чатыры гады і скончылася толькі ў 1742 г.

Палацавы комплекс знаходзіўся ў цэнтры горада і адначасова быў адасоблены ад яго. Галоўны двухпавярховы будынак быў вытрыманы ў выглядзе літары «П» са строга прамымі вугламі і ствараў парадны ўнутраны двор — курданёр, які замыкаўся дзвюма аднапавярховымі пабудовамі з высокімі ча-

тырохсхільнымі дахамі. У правым была кардэгардыя — памяшканне для каралеўскай варты, а левы прызначылі пад палацавую пякарню. Паміж імі была агароджа і брама. На яе масіўных пілонах былі змешчаны дзве скульптуры міфічных істотаў — сфінксы, якія нясуць пухлых пуцці. Слупы агароджы вянчалі шлемы з элементамі вайсковай атрыбутыкі.

К. Пёпельман імкнуўся ўвесці ў планіроўку палаца анфіладу, што было адным з самых галоўных прынцыпаў архітэктуры ракако. Гэтага ўдалося дасягнуць у правым крыле будынка. У левым крыле стварэнню анфілады перашкаджала вялікая Пасольская зала, якая займала палову яго і была двухсветлавой. Галоўны ўваход вёў у вялікі прамавугольны вестыбюль, які часта называлі Залай варты. Гэтая зала была ўпрыгожана фрэскавым роспісам, які імітаваў архітэктурныя дэталі. З Залы варты было тры выхады. Выхад налева вёў да вялікай лесвіцы на другі паверх і да Сенатарскай залы, направа — у буфетную, прама — у салон, які яшчэ называлі першай прыёмнай караля. Гэта была Авальная зала — першае такое архітэктурнае рашэнне на Беларусі — з пышнай лепкай і фрэскамі. Авальная зала таксама мела тры выхады: налева — у палацавую капліцу (пачаткова знаходзілася паміж Авальнай і Сенатарскай заламі), прама — на знешні двор, направа — у другую каралеўскую прыёмную.

У правай частцы галоўнага корпуса знаходзілася сталовая, трэцяя прыёмная для сенатараў і каралеўская аўдыенц-зала. Увесь правы флігель быў спланаваны ў выглядзе дзвюх паралельных анфілад. З боку ўнутранага двара анфілада была больш вузкай, пакоі былі невялікімі. Гэтая частка называлася каралеўскай рэтырадай. Са знешняга боку гэтага корпуса анфіладныя пакоі былі большымі па плошчы. Кароль вырашыў іх адвесці пад свае асабістыя апартаменты: кабінет, спальню-сталовую, гардэроб. Другую палову правага флігеля аддалі каралеве. Тут знаходзіліся яе кабінет, аўдыенц-зала, спальня, гардэроб і г. д.

Уся левая палова галоўнага корпуса была занята Сенатарскай залай, дзе адбываліся пасяджэнні верхняй палаты сейма Рэчы Паспалітай. Гэтае двухсветлавое памяшканне было аздоблена з такой жа раскошай, як і Авальная зала. Над кожным акном Сенатарскай залы былі змешчаны гербы ваяводстваў, на сценах і столі прыцягвалі ўвагу ляпныя картушы і ракайлі. Гэтыя аб'ёмныя аздобы дапаўняліся фрэскавымі імітацыямі архітэктурных дэталяў. На ўзроўні другога паверха ў зале былі зроблены нешырокія галерэі, агароджаныя дэкаратыўнымі кратамі. На галерэі ў час сесіі сейма маглі сядзець каралева з прыдворнымі дамамі, паслы і гледачы — так званыя арбітры. Каля сцяны, якая аддзяляла Сенатарскую залу ад капліцы, знаходзіўся вялікі балдахін з чырвонага шоўку, упрыгожаны шлячкамі і залатымі кутасамі, а пад ім на трох прыступках стаяў каралеўскі трон, аздоблены разьбой і золатам, укладзены шаўковымі падушкамі. Справа і злева ад трона знаходзіліся дзяржаўныя гербы — Белы Арол і Пагоня.

Левы флігель да паловы займала Пасольская зала, у якой праходзілі пасяджэнні ніжняй палаты сейма, так званай Ізбы паслоў. Планіроўка і аздабленне гэтай залы былі падобныя да Сенатарскай. У другой палове левага крыла палаца знаходзіліся памяшканні для прыдворных.

Другі паверх каралеўскага палаца быў спланаваны амаль што таксама, як і першы. Гэта дыктавалася як наяўнасцю трох двухсветлавых залаў, так і імкненнем да стварэння анфілад. Для таго, каб гаспадарчыя памяшканні вывесці па-за аб'ём палаца, побач з левым крылом і паралельна яму быў узведзены доўгі двухпавярховы будынак, які звычайна называлі Маршалкоўскай кухняй. Досыць вялікая плошча Маршалкоўскай кухні давала магчымасць выкарыстоўваць яе не толькі для гаспадарчых мэтаў, але і як жылыя памяшканні для прыдворных ніжэйшага рангу.

Першы сейм Рэчы Паспалітай у новым каралеўскім палацы адбыўся ў 1744 г., наступны — у 1748 г. У час пасяджэнняў гэтых сеймаў адразу выявіліся недахопы ў планіроўцы палаца. Больш за ўсё нязручнасцей стварала капліца, якая займала занадта многа месца ў самай ажыўленай частцы палаца. Таму было вырашана пабудаваць новую капліцу побач з цэнтральным корпусам палаца. У 1750 г. кароль Аўгуст III зацвердзіў праект Іахіма Хрысціяна Яўха, і адразу пачаліся работы. Паводле інвентара 1752 г. новая капліца была амаль што скончана. У 1753 г. кіраўніцтва заканчэннем яе будаўніцтва было даручана Яну Фрэдэрыку Кнобелю, якога памылкова лічаць аўтарам праекта. Капліца ўяўляла сабой аднапавярховы прамавугольны ў плане будынак з трыма падоўжанымі і пяццю папярэчнымі восямі. Знешне ён быў вельмі падобны да палаца і меў высокі чатырохсхільны дах, пакрыты дахоўкай. Сцены ўпрыгожвалі пілястры і карнізы. Вокны адрозніваліся ад палацавых — яны былі паўцыркульныя. Па грэбені даху капліцы стаялі прыгожыя дэкаратыўныя вазы. З палацам капліца злучалася невялікім пераходам, які пачынаўся ад вонкавага выхаду з Авальнага салона. У 1752 г. у Гродне адбыўся апошні сейм эпохі Саксаў. У 1768 г. чарговы сейм у Гродне адбываецца ўжо пры новым каралю Рэчы Паспалітай — Станіславе Аўгусту Панятоўскім. Чарговым рамонтам палаца кіраваў архітэктар Дж. Сака.

Панятоўскі змяніў расклад памяшканняў у палацы. Сабе ён выбраў пакоі на другім паверсе правага крыла. Свайму брату Міхалу-Ежы, прымасу Польшчы, ён аддаў увесь першы паверх у правай частцы галоўнага корпуса. Над ім знаходзіліся памяшканні мазавецкага ваяводы Малахоўскага і каралеўскага лекара Яна Бэклера. Біскуп і гісторык Адам Нарушэвіч займаў два невялікія пакойчыкі на другім паверсе паміж Сенатарскай і Авальнай заламі. Побач з ім жыў шэф вайсковай канцылярыі караля генерал Ян Камажэўскі. У правым крыле палаца, там, дзе пры Саксах былі пакоі каралевы Марыі Юзэфы, змяшчаліся вялікі літоўскі маршалак Уладзіслаў Гуроўскі са сваёй службай і каралеўскі камердынер Францішак Рыкс. А ўвесь левы корпус за Пасольскай залай займаў маршалак каралеўскага двара Тамаш Александровіч.

Самай значнай гістарычнай падзеяй, якая адбылася ў палацы, стаў апошні сейм Рэчы Паспалітай 1793 г., на якім быў зацверджаны другі падзел гэтай дзяржавы паміж Расійскай імперыяй і Прускім каралеўствам. У Сенатарскай зале ў ноч з 23 на 24 верасня 1793 г. праходзіла так званае «нямое пасяджэнне» сейма, на якім паслы моўчкі прынялі падзел Рэчы Паспалітай. Гэты гвалтоўны акт выклікаў абурэнне шырокіх слаёў грамадства. Неўзабаве вясной 1794 г. пачалося паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Восенню гэтага ж года ў гродзенскім каралеўскім палацы адбылася нарада галоўнага кіраўніка з начальнікамі паўстанчых аддзелаў. 29 верасня 1794 г. Касцюшка прыехаў у Гродна, а 30 верасня сустрэўся ў памяшканнях палаца з кіраўнікамі паўстання ў Вялікім княстве Літоўскім Якубам Ясінскім, Тамашам Ваўжэцкім, Юрыем Грабоўскім і Станіславам Макраноўскім. Жадаючы зрабіць барацьбу супраць расійскага войска на тэрыторыі ВКЛ больш актыўнай, ён рэарганізаваў вайсковае камандаванне і раздаў узнагароды. Але час ужо быў страчаны і паўстанне хутка пацярпела паражэнне. Пасля гэтых смутных падзей гродзенскі каралеўскі палац зноў стаў рэзідэнцыяй Станіслава Аўгуста Панятоўскага — 9 студзеня 1795 г. ён атрымаў загад з Пецярбурга жыць у Гродне пад наглядам расійскага пасла М. В. Рэпніна.

Менавіта тут 25 лістапада 1795 г. Станіслаў Аўгуст падпісаў акт адрачэння, які і стаў апошняй кропкай у гісторыі Першай Рэчы Паспалітай. Пасля гэтага былы кароль яшчэ жыў у сваім палацы да 15 лютага 1797 г., калі ён па выкліку імператара Паўла I ад'ехаў у Пецярбург.

Пасля ад'езду Станіслава Аўгуста каралеўскія палацы ў Гродне былі перададзены ў распараджэнне расійскага ваеннага ведамства. У Новым замку зрабілі вайсковы шпіталь і ўсё XIX і першую палову XX ст. будынак палаца выкарыстоўвалі без змен. Акрамя шпіталя тут размяшчаўся вузел сувязі і аддзяленне Варшаўскай тэлеграфнай лініі. У сярэдзіне XIX ст. у Новым замку быў зроблены вялікі рамонт, падчас якога частка памяшканняў была перароблена. Была знішчана Пасольская зала. Яе падзялілі на два паверхі і на кожным абсталявалі некалькі пакояў. Капліцу таксама перабудавалі: зрабілі там тры памяшканні, якія выкарыстоўвалі як склады для бялізны. У 20–40-я гады XX ст. у Новым замку па-ранейшаму змяшчаўся вайсковы шпіталь. Падчас баёў за вызваленне горада ў 1944 г. яго будынкі былі моцна пашкоджаны: вялікі пажар знішчыў амаль што ўсе памяшканні палаца, дах і капліцу. Адразу пасля заканчэння Другой сусветнай вайны Новы замак пачалі адбудоўваць. Работы працягваліся да 1952 г. пад кіраўніцтвам архітэктара У. Вараксіна. Палац быў адноўлены ў так званым класічным псеўдарускім стылі. З 1952 г. у Новым замку змяшчаўся Гродзенскі абласны камітэт КПБ. У 1991 г. Новы замак быў перададзены пад установы культуры: правае крыло пад Гродзенскую абласную бібліятэку імя Я. Карскага, а цэнтральны і левы карпусы — пад Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей.

Замкавая № 22 — Верхні замак, Стары замак, Dom oficera polskiego.

а) Стары замак На працягу другой паловы XIV ст. і пачатку XVст. замак неаднойчы вытрымліваў штурмы. Пяць разоў — у 1284, 1306, 1311, 1328, 1393 гг., крыжакам удавалася захапіць замак. У 1398 г. у Верхнім замку адбыўся вялікі пажар. Згодна легендзе, князь Вітаўт разам з жонкай выратаваліся толькі дзякуючы малпачцы, што крыкам разбудзіла іх. Пасля гэтага здарэння князь загадаў паставіць замест драўлянага мураваны замак. Будоўля апошняга скончылася прыкладна ў 1400 г. Было ўзведзена моцнае фартыфікацыйнае збудаванне, у плане блізкае да трохкутніка, што адпавядала канфігурацыі тэрыторыі пагорка. Працягласць крапасных сцен была каля 300 м, а таўшчыня іх дасягала 2,5–3 м. У замку было пяць вежаў. Першая — уязная вежа-брама, пад якой размяшчалася вязніца, мела пад'ёмны мост. Вежу аддзяляў ад горада 50-метровы сухі роў. Другая вежа стаяла на поўдзень ад першай, трэцяя — на заходнім баку гары, на мысе па-над Гараднічанкай, чацвёртая — у паўночна-ўсходнім нарожніку з боку горада, пятая — у заломе муроў з усходняга боку, блізка ад уязной вежы. Паміж чацвёртай і пятай вежамі знаходзіўся палац. Княскі палац меў невялікія памеры і быў двухпавярховым. Паверхі ў пакоях размяшчаліся ў адзін рад.

На замку адбываліся перамовы князя Вітаўта і караля Ягайлы, жылі князі Свідрыгайла, Жыгімонт Кейстутавіч. З 1440 г. — ва ўладанні вялікага князя Казіміра. 6 чэрвеня 1492 г. у Гродзенскім замку памёр Вялікі князь літоўскі і кароль польскі Казімір. У 1579 г. замак перабудоўваецца па загаду караля Стэфана Баторыя у познерэнесансны палац па праекце архітэктара Санці Гучы з Фларэнцыі. Гэта быў будынак з высокім двухсхільным дахам, накрытым чырвонай дахоўкай. У цэнтры галоўнага фасада знаходзілася парадная лесвіца, якая вяла на другі паверх. Яна ўяўляла сабой двух'ярусны рызаліт з аркадамі. Балюстрада была каменнай, а часткова нават з жалеза. Фасад з боку горада ўпрыгожвалі эркеры. Па баках былі шасцігранныя эркеры з шасцю вокнамі і купалападобнымі дахамі, а ў цэнтры фасада змяшчаўся прамавугольны эркер з чатырма вокнамі. Фасады і франтоны аздабляла двухколернае сграфіта. Ніжні пласт тынкоўкі быў цёмна-шэры, а верхні — белы. Усяго на першым паверсе было дзесяць памяшканняў. У цэнтры знаходзіліся квадратныя сені. Толькі з іх можна было трапіць у ізаляваны ад іншых памяшканняў невялікі пакой з двума вокнамі ў бок горада, які выконваў ролю скарбніцы. Найбольш цікавай была вялікая скляпеністая зала ў паўночна-заходняй частцы палаца. Яе скляпенні трымаліся на арыгінальных васьмігранных калонах. Зала мела сем вокнаў, з якіх тры выходзілі на надворак, а чатыры былі ў сцяне з боку горада. Другі паверх займалі каралеўскія пакоі — парадныя і жылыя, якія аб'ядноўваліся ў тыпавую палацавую анфіладу. Іх было 14: сені, зала сталовая, пакой з боку двара, невялікая пярэдняя, пакой з боку горада з эркерам, пакой «бакавы», другі пакой «бакавы», трэці пакой «бакавы» з вы-

хадам у сярэдні эркер, чацвёрты «бакавы» пакой, пакой з боку горада, пакой «убок ад надворка», памяшканне для целаахоўнікаў, пакой «таксама ад надворка», з якога дзверы вялі ў сені і на парадную лесвіцу. Апошняй у інвентары пазначана каралеўская спальня, кутні пакой з усходу, які меў выхад у эркер. Гэта былі багата аздобленыя вялікія памяшканні з высокімі столямі. Сцены былі аблямаваны паліраваным гіпсам, столі — разьбяныя ці ляпныя. Асабліва адметным было скляпенне ў сталовай зале «з ружамі і лялькамі залацістымі», аналагічнае скляпенню пасольскай залы на Вавелі. Дзверы разьбяныя і паліхромныя, часцей за ўсё з мармуровымі парталамі. Падлога была выкладзена мармурам ці рознакаляровымі паліванымі керамічнымі плітамі. Своеасаблівым упрыгожаннем пакояў былі разьбяныя каміны і кафляныя печы. Апошнія аблямоўваліся зялёнай паліванай ці паліхромнай рэльефнай кафляй. У атыку знаходзіліся памяшканні трэцяга паверха, якія асвятляліся невялікімі вокнамі. Сюды можна было трапіць толькі па пакручастай лесвіцы ў паўночным тарцы палаца. Унутранай сувязі паміж паверхамі не было, кожны з іх меў асобныя ўваходы. Жытло караля злучалася закрытай галерэяй з брамамі і лазняй. Уезд на палацавы надворак быў размешчаны крыху на ўсход ад ранейшай уязной вежы Верхняга замка. Брама мела вялікую арку-праезд, над якой было памяшканне, дзе, верагодна, знаходзілася капліца. Дах брамы — купалападобны, быў пакрыты меддзю. Да брамы падыходзіў пяціпралётны каменны мост, умацаваны 16 вежачкамі. Перад самай брамай мост меў пад'ёмнае звяно. Да вежы з боку Нёмана, што засталася ад часоў Вітаўта, дапасоўвалася каралеўская лазня. Над ёй знаходзілася «алебастравая зала» — улюбёнае месца адпачынку караля. Праз некаторы час залу аздабляюць мармурам, але яна захоўвае сваю ранейшую назву. Далей па замкавай сцяне ішла другая крытая галерэя да двухпавярховага будынка, на другім паверсе якога знаходзіліся парадныя памяшканні, а на першым — склады. На мысе, дзе раней была вежа, месціліся кухня і пякарня. Да паўночнага крыла каралеўскага палаца прымыкала жытло «дворнага». Большую частку замкавага двара займалі драўляныя гаспадарчыя пабудовы і дамы замкавай чэлядзі.

У палацы Стэфан Баторый прымаў пасольствы, адсюль выступіў у ваенны паход на Смаленск і Пскоў, выязджаў на паляванні. Тут ён цяжка захварэў і памёр 12 снежня 1586 г. Вельмі часта наведваў сваю гродзенскую рэзідэнцыю і кароль Уладзіслаў IV. Разам з узвядзеннем палаца на месцы Верхняга замка ў 80-я гады XVI ст. змянілася забудова і суседняга ўзвышша, што было адлюстравана на гравюры 1600 г. Т. Макоўскага. Пасля руска-польскай вайны сярэдзіны XVII ст. замкі сталі значна пашкоджанымі. У 1673 г. на Варшаўскім сейме прымаецца рашэнне аб правядзенні кожнага трэцяга генеральнага сейма ў Гродне. Пасяджэнні планавалася праводзіць у Старым замку, і таму паўстала пытанне аб тэрміновым аднаўленні каралеўскай рэзідэн-

цыі для патрэб сейма. Рамонтна-будаўнічыя работы адбываліся на працягу пяці гадоў пад кіраўніцтвам вялікага літоўскага канцлера Крыштофа Паца. Каля замкавай сцяны з боку Нёмана быў узведзены будынак, які прызначаўся для пасяджэнняў сейма і меў дзве залы — Пасольскую і Сенатарскую. Сенатарская зала праз галерэі і вежу-браму злучалася з каралеўскім палацам. Быў спрошчаны фасад самога палаца: перароблены вокны, ляпны барочны дэкор змяніў каменныя аблямаванні (ліштвы), ліквідаваны эркеры, а замест рызаліту з лесвіцай з'явілася аднапралётная лесвіца барочнага тыпу. Першы гродзенскі сейм пачаў свае пасяджэнні ў снежні 1678 г., яго маршалам быў Францішак Сапега, літоўскі канюшы. На гэтым сейме было зацверджана Андросаўскае перамір'е з Расіяй. Чарговы сейм праходзіў у 1688 г. У хуткім часе адбылася нейкая значная катастрофа, якая вымусіла весці ў замку аднаўленчыя работы, а ў 1699 г. трэці і апошні раз паслы і сенатары сабраліся на сейм у сценах Старога замка. У 1729 г. у Старым замку адбылася чарговая рэканструкцыя, якой кіраваў архітэктар Пёпельман. Былі знесены флігелі з боку Гараднічанкі, уздоўж нёманскай часткі замкавых сцен пабудавалі казарму, двор забрукавалі пад плац. Дэкор фасадаў самога палаца быў знішчаны, дах пакрыты жалезам. Над цэнтральнай часткай палаца надбудавалі трэці паверх, што дазволіла стварыць двухсветлавыя залы. Пасля рамонту ў Старым замку размясцілі розныя службы і частку світы караля.

б) Ніжняя царква. Твор архітэктуры Гродзенскай школы дойлідства. З'яўлялася саборным храмам замка. Уяўляў сабой прамавугольны ў плане (16,8 х 11,6 м) будынак са зрэзанымі вугламі, падзелены 6 слупамі на 3 нефы, цэнтральны з якіх завяршаўся паўкруглай апсідай, бакавыя — акруглымі нішамі ў тоўшчы сцяны, выкладзенай тонкай цэглай-плінфай на вапнавай рошчыне. Падмурак складзены з дробных камянёў без вапнавай рошчыны. Дах меў пакрыццё са свінцовых лістоў і купал у завяршэнні, бліжэй да заходняга фасада, аб чым сведчыць размяшчэнне апорных слупоў. Знадворку і ўнутры сцены крапаваны плоскімі лапаткамі, у верхняй частцы размяшчаліся вокны-біфорыумы. Дэкор фасадаў стваралі абчасаныя гранітныя глыбы, каменная паліхромная інкрустацыя, маёлікавыя ўстаўкі ў форме крыжа карычневага і зялёнага колераў, круглых разетак. У паўднёва-заходнім вуглу храма захаваліся рэшткі вітых сходаў, якія вялі на хоры. Залу перакрывала цыліндрычнае скляпенне на падпружных арках. Царква мела 3 уваходы па галоўных восях падкупальнага квадрата. Акустыку залы пашырала выкарыстанне галаснікоў-рэзанатараў. Падлога мела мазаічны маёлікавы плітачны набор зялёнага, жоўтага і карычневага колераў. Знойдзены дэталі ўбрання драўлянай алтарнай перагародкі — пазалочаныя медныя лісты з выгравіраванымі выявамі апосталаў Фядота, Паўла і Сімяона ў абрамленні расліннага і плеценага арнамента. Іпацьеўскі летапіс паведамляе аб пажары царквы 1183 г., які прывёў яе да разбурэння. У XIII–XIV стст. зруй-

наваныя сцены храма служылі агароджай невялікіх могілак. Руіны храма адкрыты ў 1932–1933 гг. у час раскопак Замкавай гары (кіраўнік Ю. Ядкоўскі). У 1937–1939 гг. іх даследаваў З. Дурчэўскі, з 1949 г. раскопкі прадоўжыў археолаг М. Варонін.

в) Верхняя царква — Пабудавана прыкладна ў XIV ст. на месцы больш старажытнага храма на брукаванай платформе. Уяўляла сабою невялікі, квадратны ў плане храм (8,9 х 8,9 м) са срэзанымі вугламі, цаглянай падлогай і паўкруглай-эліптычнай апсідай. Сцены царквы былі рознай таўшчыны і непаралельныя паміж сабою. Адкрыта ў 1933 г. Ю. Ядкоўскім падчас археалагічных раскопак на Замкавай гары. Пасля кансервацыі ў 1939 г. была перанесены ў асобны павільён, дзе захоўваецца да гэтага часу.

г) княжацкі церам — Пабудаваны ў другой палове XII ст. Мураваны двухпавярховы палац. Адкрыты у 1932 г.

д) мост — Цагляны арачны мост пабудаваны у другой палове XVII ст. замест драўлянага.

Замак і археалагічныя помнікі на Замкавай гары патрабуюць звыштэрміновай кансервацыі.

Замкавы тупік // Цесная, Мясная Яўрэйская, Schustergang — Сфармавалася як завулак ад вул. Замкавай уздоўж юрыдыкі Масальскіх. На пачатку вуліцы — мемарыял памяці ахвяр гродзенскага гета.

Захарава // Новая, Артылерыйская, Artyleryjska, Jupiterstr.

Захарава № 22 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад драўлянай эклектыкі.

Захарава № 24 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад арыгінальнай архітэктуры. Прызначаны пад знос.

Захарава № 25 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад эклектыкі.

Калючынская // Калюцінская, Каложская, Калужанская, Цюрэмны завулак, Залатарскі завулак, Marienburgstr., Пасіянарыяў — Упершыню згадваецца ў 1561 г. Асноўная гістарычная частка забудовы адносіцца да перыяду пасля 1885 г. Частка дамоў была пашкоджана падчас Другой сусветнай вайны, частка — разабрана падчас будаўніцтва кінатэатра «Гродна». На пачатку 1990-х насупраць турмы быў знесены прыгожы дом з элементамі стылю мадэрн.

Калючынская № 1 — Год пабудовы — 1890.

Калючынская № 3 — Даходны дом. Год пабудовы — 1889. Эклектыка.

Калючынская № 5 — Год пабудовы — 1889. Эклектыка.

Калючынская № 6 — Пабудаваны на пачатку XX ст.

Калючынская № 8 — Пабудаваны на пачатку XIX ст.

Калючынская № 10 — Пабудаваны на пачатку XX ст.

Калючынская № 16 — Пабудаваны напрыканцы XIX ст.

Калючынская № 23 — Дом Майгорна, хедэр Захарыя Фінкеля, Яшэва. Пабудаваны напрыканцы XIX ст. У «Гродзенскай праўдзе» не так даўно з'явіўся ліст «аднаго з жыхароў дома» з прапановай аб ягоным зносе ў сувязі з «аварыйным станам».

Камунальная // Rzeznińcka, Schlachthofstr.

Камунальная № 2 — Мемарыяльная дошка памяці З. Салаўёва на Першым гарадскім клінічным шпіталі. У комплексе будынка шпіталя захаваліся камяніцы старога гарадскога шпіталя з пачатку XX ст.

Камунальная № 3 — Былыя яўрэйскія могілкі, стадыён «Чырвонае знамя». У 1963 г. на месцы могілак пабудаваны стадыён. Аўтары праекта — архітэктар В. Бажкоў, інж. Н. Філітовіч. Сярод іншых была знішчана магіла паэта Л. Найдуса. Зараз стадыён у стадыі чарговай рэканструкцыі. У 2007 г. тут была змешчана мемарыяльная дошка ў памяць яўрэйскаму насельніцтву горада.

Камунальная № 32 — Былая яўрэйская рэзня.

Карбышава // Полевая, Polna, Napoleona — Пачалася фармавацца не раней 1795 г. Канчаткова склалася ў 1862 г. як вуліца да камерцыйных складаў пры чыгунцы.

Карбышава № 3 — Гл. Сацыялістычная № 22.

Карбышава № 7 — Год пабудовы — 1902.

Карбышава № 7а — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Карбышава № 9 — Год пабудовы — 1900. Каштоўны прыклад эклектыкі.

Карбышава № 10 — Клуб «Беларуская хатка». Год пабудовы — 1888. Тут жылі ў 1919 г. Тамаш Грыб і Паўліна Мядзёлка.

Карбышава № 11 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Пасля капрамонту.

Карбышава № 13 — Пабудаваны ў 1950-х гадах. Добры прыклад «сталінскага ампіру».

Дом Міхася Васілька — аднапавярховы драўляны, які згодна з афіцыйным заключэннем «з'еў грыбок», у сувязі з чым быў разабраны. На яго месцы ў 1975 г. пабудаваны чатырохпавярховы будынак Гродзенскага філіяла беларускага інстытута па праектаванні капітальнага рамонту і рэканструкцыі аб'ектаў жыллёва-грамадзянскага прызначэння — архітэктар В. Ягошын. З 1986 па 1990-я гады на будынку мелася мемарыяльная дошка ў гонар Міхася Васілька. У 2005 г. новая дошка з'явілася зусім на іншым будынку — на рагу вул. Васілька і Кірава.

Карбышава № 17 — Павятовы банк. Год пабудовы — 1931. Аўтары праекта — архітэктары С. Валконскі і М. Шчука. Прыклад канструктывізму.

Карбышава № 19 — Пабудаваны прыкладна ў 1930-х гадах. Добры прыклад драўлянага канструктывізму з мураваным гаражом у двары ў тым жа стылі.

Карбышава № 24 — Пабудаваны ў другой палове XIX ст. Эклектыка.

Карбышава № 24а — Пабудаваны ў другой палове XIX ст. Эклектыка.

Карбышава № 28 — Гарадская станцыя хуткай медычнай дапамогі. Мураваны. Стыльны прыклад канструктывізму.

Касманаўтаў праспект // Смаленскі тракт, Лідскі тракт, паштовы сталічны тракт на Вільню, Скідальская застава, Skidelska, Skidelerstr. Уключаецца ў гарадскую тэрыторыю ў XIX ст. разам з пабудовай тут шэрагу вайсковых аб'ектаў. Зараз гэта галоўная магістраль, якая звязвае горад і вытворчае аб'яднанне «Азот».

Гарбаты (чортаў) мост (праз чыгунку) — Пабудаваны ў XIX ст. Разабраны на пачатку XXI ст.

Касманаўтаў праспект № 1 — Сінагога на Аляксандраўскай слабадзе. Пабудавана ў пачатку XX ст.

Касманаўтаў праспект № 2а — Жылы дом. Пабудаваны ў 1964 г. Першы гарадскі шматпавярхоўны будынак савецкіх часоў. Прыкладна на гэтым месцы на пачатку XVIII ст. знаходзілася **карчма «Пагулянка».** Праіснавала да канца XIX ст. Тыповая прыгарадная карчма, у якай месціліся невялікі шынок, гатэль, канюшня і карэтня.

Касманаўтаў праспект № 2б — Стралковы гарадскі арсенал, вайсковыя казармы 26-й артылерыйскай брыгады, дом ДТСААФ. Год пабудовы — 1902.

Касманаўтаў праспект № 6 — Новы яўрэйскі дзіцячы прытулак. Год пабудовы — 1918. Мадэрн. Пасля Другой сусветнай вайны надбудаваны трэці паверх. Пасля рамонту летам 2007 г. фасад будынка быў абшыты гіпсакартонам, страціўшы арыгінальны выгляд.

Месца пакарання Міхала Валовіча // былая плошча Валовіча. Зараз — спальны раён. Праспект Касманаўтаў № 29–37.

Касманаўтаў праспект № 8 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад цаглянай эклектыкі. Уваходзіў у комплекс вайсковых збудаванняў.

Касманаўтаў праспект № 8б — Артылерыйскі парк. Пабудаваны на пачатку XX ст.

Касманаўтаў праспект № 24 — Пабудаваны ў 1920–1930-х гадах. Прыклад позняй эклектыкі.

Курган славы — Закладзены 17 верасня 1968 г. на ўшанаванне памяці барацьбітоў за савецкую ўладу. Сюды прывезена зямля з усіх раёнаў Гродзеншчыны, з брацкіх магіл воінаў Чырвонай Арміі і партызан, магіл Герояў Савецкага Саюза, пахаваных на тэрыторыі Гродзенскай вобласці.

Каханоўскага // Krżyżaki, Gutsstr., Вучхозаўская.

Каханоўскага № 1 — Крама. Тыповая забудова гандлёвага прызначэння пачатку 1950-х гадоў.

Каханоўскага № 13 — Майстэрня Васіля Качана. Пабудавана напрыканцы XIX ст. Працавала шэсць мужчын. Толькі за 1889 г. тут было зроблена 18 помнікаў, на агульную сумму 900 рублёў.

Каханоўскага № 15 — Пабудаваны напрыканцы XIX ст. Прыклад вельмі выразнай эклектыкі.

Каханоўскага № 17 — Пабудаваны напрыканцы XIX ст. Прыклад вельмі выразнай эклектыкі.

Каханоўскага № 19 — Пабудаваны напрыканцы XIX ст. Прыклад вельмі выразнай эклектыкі.

Каханоўскага № 21 — Пабудаваны напрыканцы XIX ст.

Кірава // Мірсніцка (Мірыніцкая), Рэзніцкая, Паліцэйская, Listowskiego, Lyckier-Str — Сфармавалася яшчэ ў XV ст. як вуліца, паралельная Смаленскаму тракту. Першая згадка аб ёй адносіцца да 1560 г. Вуліца моцна пацярпела ад пажару 1885 г.

Кірава № 1 — Былая езуіцкая калегія, турма. На пачатку XIX ст. пад губернскую турму быў адведзены двухпавярховы каменны флігель, што ўваходзіў у комплекс будынкаў езуіцкага калегіума (зараз на тэрыторыі турэмнага комплексу). У 1802 г. гродзенскі губернатар Кошалеў перадаў будынак калегіума ў распараджэнне Гродзенскага прыказа грамадскага апекавання. У 1817–1820 гг. перабудаваны па праекце архітэктара Лянгоскага пад гродзенскі турэмны замак. У кастрычніку 1821 г. на тэрыторыі гродзенскага турэмнага замка была пабудавана капліца пад назвай «Св. Пятра ў аковах». У канцы 1820-х гадоў частка былога калегіума была перададзена вайсковаму ведамству. У 1840 г. была перабудавана турэмная царква. У 1853 г. пад кіраўніцтвам архітэктара Мікульскага пачынаецца будаўніцтва двух невялікіх флігеляў, якія далучаюцца да корпуса турэмнага замка. У 1858 г. была разабрана хата ката з мэтаю перашкодзіць магчымым спробам уцёкаў, бо яна прымыкала да турэмнай сцяны. У 1861 г. адбываецца чарговы рамонт, а ўжо ў сакавіку 1863 г. тут з'яўляюцца першыя удзельнікі паўстання. Колькасць палітычных вязняў у хуткім часе ўзрасла настолькі, што турэмныя ўлады вымушаны былі перавесці крымінальных злачынцаў у былы кармеліцкі манастыр. Чарговыя працы па пашырэнні турмы праводзіць гродзенскі купец Андрэс пад кіраўніцтвам інжынер-падпалкоўніка Арнольда. У 1912 г. на тэрыторыі турмы будуецца корпус для вобыску і спатканняў.

Кірава № 3 — Дом Хаіма Бронервейна. Год пабудовы — 1878. Узор эклектыкі. У 1920-я гады тут жыў рабін Хаім Беластоцкі.

Кірава № 5 — Дом Марыі Вэнжык-Відоўскай. Год пабудовы — 1898. Эклектыка. Сярод жыльцоў у 1920-я гады былі пасол у польскі сейм прафесар К. Лашкевіч. Тут жа працавала сямікласная яўрэйская школа «Tarbut». У кастрычніку 1930 г. знаходзілася рэдакцыя беларускай паланафільскай газеты «Беларуская думка».

На доме знаходзілася мемарыяльная табліца ў гонар Лазара Земенгофа (1859–1917) — стваральніка мовы эсперанта, які ў свой час тут жыў.

Кірава № 5а — Год пабудовы — 1898. Тыповы флігель даходнага дома.

Кірава № 6 — Год пабудовы — 1880. Перабудаваны ў 1931 г. пад гарадскі шпіталь.

Кірава № 7 — Дом Шломы Швэйцара. Год пабудовы — 1890. Эклектыка. У 1920-я гадыў жыў кіраўнік яўрэйскай школы Шмерэль Бадылкес.

Кірава № 8 — Магазін «У майстра». Тыповы будынак пачатку XX ст.

Кірава № 9 — Год пабудовы — 1880. Эклектыка.

Кірава № 10 — Гл. Гараднічанская № 30. У 1679 г. пляц паміж сучаснымі будынкамі № 10–12 набыў Ордэн камедулаў з Віграў.

Кірава № 11 — Гл. Гараднічанская № 38.

Кірава № 12 — Год пабудовы — 1887. Прыклад пасляпажарнай забудовы Гродна.

Кірава № 12а — Год пабудовы — 1887. Тыповы флігель.

Кірава № 13 — Год пабудовы — 1914. Эклектыка.

Кірава № 14 — Гл. Сацыялістычная № 27.

Кірава № 16 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Кірава № 18 — Год пабудовы — 1884. Цудам захаваўся пасля пажару 1885 г.

Кірава № 18а — Год пабудовы — 1890. Тыповы флігель.

Кірава № 22 — Год пабудовы — 1890. Прыклад стылю эклектыкі.

Кірава № 26 — Год пабудовы — 1888. Тыповы гродзенскі даходны дом.

Кірава № 26а — **Дом архітэктара Плотнікава.** Год пабудовы — 1889. Флігель. Пасля грунтоўна дабудаваны у 1970-я гады.

Кірава № 27 — Год пабудовы — 1889. Эклектыка.

Кірава № 29 — **Дом Баўмгартэна**. Год пабудовы — 1900. Эклектыка. Магчыма, што на гэтае месцы ў 1614 г. пасля пажару была перанесена Васкрасенская царква.

Кірава № 29а — Год пабудовы — 1888. Эклектыка.

Кірава № 31 — Год пабудовы — 1885. Эклектыка.

Кірава № 32 — **Дом купцоў Касоўскіх**. Год пабудовы — 1912. Выключны для Гродна прыклад мадэрну. У доме былі кватэры з лазенкамі і клазетамі, пячное ацяпленне. Акрамя кватэраў тут месціліся харчовая крама і кравецкая майстэрня.

Кірава № 34 — Год пабудовы — 1904. Прыклад эклектыкі.

Кірава № 35 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Кірава № 36 — Год пабудовы — 1888. Каштоўны прыклад эклектыкі з элементамі мадэрну.

Кірава № 37 — Год пабудовы — 1886.

Кірава № 39 — Год пабудовы — 1890.

Кірава № 39а — Год пабудовы — 1890. Эклектыка. На будынку захаваліся каштоўныя архітэктурныя дэталі.

Кірава № 40 — **Музычная школа**. Пабудаваны на пачатку XX ст.

Кірава № 41 — Год пабудовы — 1911. Эклектыка.

Кірава № 42 — Пабудаваны на пачатку XX ст.

Кірава № 43 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Кірава № 45 — Магчыма, упраўлене гродзенскага павятовага вайсковага начальніка. Год пабудовы — 1887. Добры прыклад эклектыкі.

Купалы Янкі праспект

Стаянка каменнага веку адкрыта М. М. Чарняўскім у 1972 г. на ўсходняй ускраіне в. Солы (цяпер раён вуліц каля гатэля «Турыст»). Тут знойдзены крэмневыя прылады працы, фрагменты ляпных гаршкоў. У 1958 г. на гэтым месцы Ф. Д. Гурэвіч адкрыла і даследавала селішча культуры штрыхаванай керамікі (рубеж нашай эры).

Форт № 1 фортавай лініі 1887–1892 гг.– Каля бальніцы № 4.

Леванабярэжная // Lewa Nadbrzeżna, Sokolnicza+Nadbrzeżna, Holzstr.

Звярынец, Рачны порт — Зараз Занёманская набярэжная ніжэй Францысканскага касцёла. Велікакняскі звярынец упершыню згадваецца ў крыніцах у 1560 г., аднак магчыма, што ён існаваў ужо ў XV ст. У ім утрымоўвалі ласёў, аленяў, касуль і нават зуброў. У 1653 г. гэты пляц арандаваў каралеўскі сакратар Лазар Маясевіч. Пазней частка зямлі былога звярынца адышла ў рукі Масальскіх, а частка дасталася кармелітам і брыгіткам.

Леванабярэжная № 2 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Драўляны прыклад эклектыкі. Магчыма, былая станцыя ратавання.

Леванабярэжная № 9 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Сціплы драўляны канструктывізм.

Леванабярэжная № 29 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Перабудаваны цягам апошніх месяцаў.

Леванабярэжная № 39 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Драўляны прыклад эклектыкі.

Леванабярэжная № 41 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Драўляны прыклад эклектыкі.

Леванабярэжная № 42 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Драўляны прыклад эклектыкі.

Леванабярэжная № 43 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Драўляны прыклад эклектыкі.

Леніна // Сафійская, Іванаўская, Зялёная, Pilsudskiego, Konigsberger-Str., Сталіна — Прыкладна па гэтай вуліцы праходзіла лінія фартыфікацый ў XVII–XVIII стст. Вуліца сфармавалася на пачатку XIX ст., аднак пачала актыўна забудоўвацца толькі напрыканцы XIX ст.

Леніна № 3 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Леніна № 4 — Гарадское вучылішча, Пушкінскае вучылішча, Міністэрства беларускіх спраў, Батароўка (сярэдняя школа № 2 імя С. Баторыя), педагагічны коледж. Пабудаваны напрыканцы XIX ст. Прыклад цаглянай эклектыкі. У 1919 г. тут знаходзілася трохкласнае беларускае вучылішча; жылі беларускія дзеячы Л. Дзякуць-Малей і К. Салошык.

Леніна № 5, 7 — Комплекс прамысловых пабудоў канца XIX — пачатку XX ст.

Леніна № 9 — Сялянскі пазямельны банк, Камандаванне акругі корпуса III (ДОК III), Штаб арміі. Пабудаваны ў 1913 г. паводле праекта архітэктара Б. Астравумава. Прыклад архітэктуры стылю мадэрн. Правае кры-

ло будынка паўстала ў другой палове 1930-х, як частка ДОК III, і было пабудавана ў стылі канструктывізму.

Мемарыяльная дошка Д. Карбышаву — Устаноўлена ў 1965 г. на ўшанаванне памяці Героя Савецкага Саюза генерал-лейтэнанта інжынерных войск Д. Карбышава, які ў чэрвені 1941 г. інспектаваў будаўніцтва ваенных умацаванняў у Беластоцкай вобласці і жыў у гэтым доме.

Леніна № 10 — Дом адваката Е. Дамбровы. Пабудаваны на пачатку XX ст.

Леніна № 11 — Год пабудовы — 1900. З элементамі мадэрну. Гэты будынак звязаны з дзейнасцю самых каларытных у Гродне на пачатку 1970-х гадоў хіпі.

Леніна № 12 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Леніна № 14 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Леніна № 15 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Леніна № 16 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Моцна перабудаваная эклектыка.

Леніна № 17 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Леніна № 18 — «Польскае радыё». Год пабудовы — 1932. Прыклад канструктывізму.

Леніна № 19 — Вельмі моцна перабудаваная эклектыка. У двары дома захаваліся гаражы пачатку XX ст.

Леніна № 22 — Дом урача А. Тальгейма. Год пабудовы — 1911. Стыль мадэрн. Аляксандр Тальгейм (1873–1937) нарадзіўся у Варшаве. Скончыў універсітэт у Кіеве. Пасля двух год працы ў Варшаве і пяці — у Поразаве пераязджае ў Гродна, дзе каля горада меў родавы маёнтак у Путрышках. З 1905 г. — урач пры суполцы сясцёр міласэрнасці. У 1907 г. заклаў таварыства аматараў мастацтва «Муза», якое ўзначальваў да 1913 г. З'яўляўся старшынёй гарадскога таварыства ўрачоў, сябрам Варшаўска-Беластоцкай урачэбнай палаты, сябрам праўлення гарадскога музея прыроды і інш.
У 1941–1944 гг. тут знаходзілася сядзіба Grunstuckgesellschaft, якая займалася геадэзічнымі распрацоўкамі, добраўпарадкаваннем і азеляненнем Гродна і ваколіцаў. У яе планы ўваходзіла, між іншым, рэстаўрацыя Швейцарскай даліны.

Леніна № 23 — Пабудаваны напрыканцы XIX ст. Эклектыка.

Леніна № 24 — Год пабудовы — 1917.

Леніна № 27а — Перабудаваная эклектыка.

Леніна № 28 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыгожая эклектыка.

Леніна № 31 — Звычайны прыклад местачковай забудовы пачатку XX ст.

Леніна плошча — У канцы XVIII ст. на месцы сённяшняй плошчы па далі-не Гараднічанкі працавалі млын, пральня, бойня ды піваварны завод, які, дарэчы, абслугоўвалі чэшскія вінакуры. У1920-я гады на гэтым месцы працаваў адзін з лепшых у горадзе магазінаў радыётавараў Ханона Голдберга, у якім можна было набыць патэфоны, пласцінкі, радыёапараты Philips, Elektrit, Telefunken і заменныя часткі да іх. Сённяшні выгляд плошча набыла напярэдадні святкавання 70-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1987 г. па праекце архітэктараў А. Пархуты і Б. Шмыгі. Агульны кошт рэканструкцыі склаў па тых цэнах 900 тыс. рублёў. Цікавая дэталь: бетонныя пліты на плошчы падзелены базальтавай шашкай, якую ў розныя часы знялі з праезжай часткі вуліц.

Леніна плошча № 2/1 — Гродзенскі гарвыканкам. Пабудаваны ў 1971 г. для гаркама КПБ. Архітэктар В. Давыдзёнак. Прыклад адміністрацыйных збудаванняў 1970-х гадоў.

Помнік Леніну — Аўтар З. Азгур. Устаноўлены ў 1987 г.

Памятны знак «Нулявы кіламетр» — Метровай вышыні слуп з гербамі Гродна — аленем св. Губерта, выявай Зубра, знакам «Белаўтадор» і паказальнікамі адлегласці да іншых гарадоў.

Лермантава // Загарадная слабада, Bergstr., Bazyłijanska, Górna, Ordens-str.

Лермантава № 8 — Сядзіба Корпуса аховы пагранічча. Пабудаваны ў 1930-х гадах. Тут у 1960-я гады жыў вядомы дзеяч ТБШ Марцінчык.

Лермантава № 25 — Пабудаваны ў першай палове XX ст. Мураваны. Без стылю.

Лермантава № 31 — Школа. Пабудавана ў 1930-я г. паводле тыпавога праекта. Стыльны канструктывізм.

Лермантава № 35 — Пабудаваны ў 1930-х гадах.

Лермантава № 38 — Гарадскі асабняк, дом кіраўніка гродзенскага МДБ Фаміна, гатэль-інтэрнат. Пабудаваны ў 1920–1930-х гадах.

Лялевеля

Лялевеля № 31 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Маладзёжная // Dziewocka, Навікоўская, Брыгіцкі завулак+Новая, Паштовы завулак, Bianeckiego, Nazaretanska, Franstr.+Braunberger-Str. — Частка вуліцы ўздоўж Брыгіцкага кляштара сфармавалася яшчэ ў XVII ст.

Маладзёжная № 3 — Год пабудовы — 1887. Эклектыка.

Маладзёжная № 4 — Завод роварaў і матацыклаў «Нёман» Старавольскага, завод Радыёпрыбор. Пабудаваны ў 1876–1912 гадах. Матацыклы на заводзе Старавольскага выпускаліся па ліцэнзіі BMW.

Маладзёжная № 5 — Год пабудовы — 1931.

Маладзёжная № 7 — Год пабудовы — 1910. Эклектыка.

Маладзёжная № 9 — Год пабудовы — 1887. Эклектыка.

Малая Траецкая // Над ровам Гарадніцы, Пры могілках яўрэйскіх, Могілкавая, Sw. Trojcy, 1-sza Narodowa, 8 марта — Сфармавалася ў XV–XVI стст., як шлях з яўрэйскіх могілак на Нямецкі рынак. Драўляную забудову вуліцы знішчылі пажары 1865 і 1885 гг.

Малая Траецкая № 5 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Перароблена эклектыка.

Малая Траецкая № 6 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Перароблена эклектыка.

Малая Траецкая № 11 — Год пабудовы — 1886. Элементы стылю эклектыкі. Перабудаваны.

Малая Траецкая № 13 — Год пабудовы — 1875.

Малая Траецкая № 15 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Перароблена эклектыка.

Малая Траецкая № 17 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Малая Траецкая № 19 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка. Дом моцна страціў падчас перабудовы.

Малая Траецкая № 21 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Вельмі моцна перабудаваная эклектыка.
У першай палове XVII ст. прыкладна тут быў пабудаваны драўляны касцёл айцоў аўгусцінаў, спалены ў 1673 г.

Маркса // Язерская, Купецкая, Брыгіцкая, Hermann strasse — У XVI ст. вуліца забудоўвалася ад гарадскога рынку дамамі рамеснікаў і магнатаў. У 1567 г. перад «Смаленскай брамай» знаходзілася «Крывая карчма», якая пазней належала манахіням-брыгіткам, а за ёй — ужо па-за межамі горада — гарадская віселіца.

Маркса № 1 — Батароўка. Згодна гродзенскай традыцыі, менавіта тут адбылося анатамічнае ўскрыцце цела караля Стэфана Баторыя, што не адпавядае гістарычным фактам, аднак замацавала за домам імя манарха Рэчы Паспалітай. У 1643 г. камяніца была набыта гарадзенскім земскім пісарам Уладыславам Кярдзеем ад сына гарадзенскага падкаморыя Аляксандра Масальскага. У 1680 г. сядзіба перайшла ў валоданне віленскага ваяводы Казіміра Яна Сапегі. У 1717–1718 гг. палац разам з другім палацам Сапегаў быў перабудаваны нямецкім архітэктарам І. Яўхам пад рэзідэнцыю караля Аўгуста II і паседжання сейма Рэчы Паспалітай. У другой палове XVIII ст. у гэтым будынку адбываліся паседжанні Скарбовай Камісіі ВКЛ. У 1765 г. Сапегі прадалі будынак вялікаму літоўскаму падканцлеру Міхалу Бжастоўскаму. З 1860 г. тут знаходзілася вінная лаўка І. Лапіна.

Маркса № 2 — Будынак старой бурсы. Пабудаваны ў канцы XVII ст. Дабудаваны ў 1880, 1920 гг. Праект рэстаўрацыі ў 1991 г. В. Барсукова.

Маркса № 4 — Езуіцкая калегія. Гаспадарчыя і службовыя памяшканні з пачатку XIX ст. сталі належаць праваслаўнаму духавенству. У кастрычніку 1911 г. тут на кватэры Л. Сівіцкай адбыўся спектакль Гродзенскага гуртка беларускай моладзі. Праект рэстаўрацыі В. Барсукова.

Маркса № 5 — Дом гісторыка С. Касцялкоўскага. Год пабудовы — 1870.

Маркса № 6 — Дом Цырлі Булькауштэйн. Год пабудовы — 1873. Эклектыка.

Маркса № 7 — Год пабудовы — 1870. Эклектыка.

Маркса № 8 — Дом Каўфмана. Пабудаваны ў другой палове XIX ст. Эклектыка.

Маркса № 9 — Год пабудовы — 1904. Эклектыка.

Маркса № 10 — Дом Борэраў. Пабудаваны ў другой палове XIX ст. Эклектыка.

Маркса № 11 — Swietlica Stowyrzeszenia Dom Polaków Wyznania prawoslawnego im. Króla Stefana Batorego. Год пабудовы — 1861. Эклектыка.

Маркса № 12 — Пабудаваны ў 1890, 1900 гг. Эклектыка. Страчаны шмат якія архітэктурныя дэталі.

Маркса № 13 — Год пабудовы — 1889. «Пасляпажарная» эклектыка.

Маркса № 14 — Дом Канстанціна Тарасевіча. Год пабудовы — 1898. Эклектыка.

Маркса № 15 — Год пабудовы — 1885. Эклектыка. Страчана шэраг цікавых архітэктурных дэталяў, аднак захаваліся цікавыя падвалы, якія, магчыма, належалі папярэдняму будынку, што стаяў на гэтым месцы.

Маркса № 16 — Дом Абрама і Перлы Крусподзінаў, дом Аўсея Балуна. Другая паловя XIX ст. Эклектыка. Апошні з гаспадароў прыкупіў суседні дом Івана Калянкевіча і цалкам рэканструяваў іх, аб'яднаўшы ў адзін будынак.

Маркса № 16а — Пабудаваны ў 1875, 1888 гг.

Маркса № 18 — Год пабудовы — 1888.

Маркса № 19 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Маркса № 20 — Стыльны прыклад канструктывізму да таго, як быў разабраны ў 2006 г.

Маркса № 22 — Год пабудовы — 1870. Неаднаразова перабудоўваўся.

Маркса № 21 — Год пабудовы — 1900.

Маркса № 23 — Год пабудовы — 1909. Эклектыка.

Маркса № 24 — Год пабудовы — 1889.

Маркса № 25 — Год пабудовы — 1909. Пасля пажару 1885 г. пляц на гэтым месцы забудаваў Шалома.

Маркса № 27 — Касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі, кляштар Брыгітак, сталярныя майстэрні, псіханеўралагічны дыспансер — «псіхушка». Кляштарны комплекс брыгітак і брыгітан заснаваны ў 1632–1642 гг. Пабудаваны ў 1634–1642 гг. з цэглы па фундацыі Весялоўскіх. Комплекс уключае касцёл, манаскі корпус, што ўтварае квадратны ўнутраны двор, драўляны лямус, высокую мураваную агароджу з пластычнымі брамамі і вуглавымі 8-граннымі вежамі. У 1950-я гады была разабрана ўся агароджа з паўднёвага боку разам з дзвюма вонкавымі вежамі, брама і частка ўсходняй сцяны, а таксама званіца праз дарогу ад кляштара.

Маркса № 29 — Дом сувязі. Год пабудовы — 1968. Аўтары праекта архітэктары Г. Тарасевіч і Л. Вільчка. Прыклад грамадскіх збудаванняў савецкай архітэктуры.

Маркса № 30 — Год пабудовы — 1886 г. Капрамонт — у 1976 г.

Маркса № 32 — Пабудаваны ў канцы XIX ст. Эклектыка.

Маркса № 34 — Год пабудовы — 1880.

Маркса № 34а — Год пабудовы — 1860.

Маркса № 36 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Маркса № 38 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Маркса № 38а — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Маркса № 40 — Год пабудовы — 1870.

Маркса № 40а — Год пабудовы — 1870.

Маркса № 40/1 — Год пабудовы — 1932.

Маркса № 42 — Год пабудовы — 1888.

Маставая // Mostowa, Маставая, Ludendorff-Str./ Wernerstr. — Сфармавалася ў XII–XIV ст. як частка гродзенскага Падола. Праект транспартнай развязкі праз Нёман у раёне Старога моста звязаны са значнымі працамі па вул. Маставой і паўтарэннем сітуацыі з плошчай Савецкай з 2006 г., калі былі страчаны старажытная планіроўка горада і значная частка культурнага пласта.

Маставая № 31 — Тытунёвая фабрыка Шарашэўскага, Hurtownia Monopolu Tytoniowego, пальчатачная фабрыка. Год пабудовы — 1867.

Маставая № 35 — Драмтэатр. Пабудаваны ў 1977–1984 гг. па праекце архітэктараў Г. Мачульскага і А. Пархуты. Твор савецкай архітэктуры.
На гэтым месцы старастам жмудскім Геранімам Валовічам ў 1621 г. быў заснаваны **кляштар Бернардзінак**. У маі 1854 г. перададзены **Барысаглебскаму праваслаўнаму манастыру**. Менавіта тут, у Барысаглебскім манастыры, восенню 1918 г. знайшла прытулак першая ў Гродне легальная беларуская арганізацыя — Сувязь культурна-нацыянальнага адраджэння Беларусі, а ў 1920-х гадах знаходзіліся беларускія школа і канцылярыя Беларускай вучыцельскай рады, сакратарыят Беларускага пасольскага клуба і Беларуская школьна-прытулкавая рада, Беларускі камітэт дапамогі пацярпелым ад вайны і рэдакцыя газеты «Сялянская гутарка», беларуская кнігарня і Гродзенскае аддзяленне Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. У манастырскіх келлях жылі А. Грыкоўскі, Л. Дзякуць-Малей, А. Кухарчук, А. Шах, С. Кішко, С. Буйло, Д. Лічыцкі, М. Амяльянчык, Е. Буднік, Л. Лукашык і іншыя гродзенскія беларусы. У 1930-я гады — gimnazjum krawiecki.

Маставая № 37 — Былы комплекс манастыра босых кармелітаў у Гродне. Мураваныя кляштарныя будынкі і касцёл, вырашаныя як цэласны архітэктурны ансамбль, былі ўзведзены паміж 1738 і 1765 гг. Пасля 1863 г. былі перададзены пад вайсковыя казармы. У 1875 г. перабудаваны пад акруговы суд. У 1903 г. пачалася «рэканструкцыя» комплексу і будаўніцтва на яго аснове вайсковых казармаў Гродзенскага крапаснога батальёна. Пры гэтым быў разабраны касцёл. З'яўляўся помнікам архітэктуры ракако.

Маставая № 39 — Махорачная фабрыка Іоселя Лейбавіча Шарашэўскага і Файвеля Шабшалевіча Русоты, Machoczarnia, казармы, гарадскія казармы, казённыя казармы, корпус тонкасуконнага камбіната. Год пабудовы — 1867. Будынак неаднаразова рэканструяваны. Восенню 1939 г. — месца абароны польскіх салдатаў. У XVI ст. тут знаходзілася Чэснахрэстная царква, у XVII ст. — стары драўляны кармяліцкі касцёл, у XVIII ст. — палац Мураўскага.

Маставая № 40 — Рэзідэнцыя ўніяцкага мітрапаліта ў Гродне. Год пабудовы — 1743.

Міру // Łowiecka — Ogrody wazywny, Laubengasse. На вуліцы захаваліся чугунныя ліхтарныя слупы 1950-х гадоў з вельмі характэрнымі ўпрыгожаннямі.

Міру № 15 — Помнік Д. Карбышаву. Пастаўлены ў 1975 г. перад будынкам сярэдняй школы № 15. Скульптар А. Салятыцкі.

Міцкевіча // Суворaўская, Mickiewicza, Scholtz-Str. — Сфармавалася ў другой палове XIX ст. на землях, адкупленых у князёў Друцкіх-Любецкіх. У 1970-х і 1990-х гадах ансамбль вуліцы быў «разбіты» ўзвядзеннем шматпавярховых будынкаў жылога дома і банка.
У скверы на рагу вуліц Міцкевіча і 17 верасня ўзвышаўся вялізны драўляны крыж, які пасля вайны спілавалі паводле загаду савецкіх уладаў.

Міцкевіча № 4 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Міцкевіча № 7 — Год пабудовы — 1935.

Міцкевіча № 9 — Год пабудовы — 1932.

Міцкевіча № 12 — Год пабудовы — 1896.

Міцкевіча № 13а — Год пабудовы — 1907. Эклектыка з элементамі мадэрну.

Міцкевіча № 16 — Год пабудовы — 1910.

Мічурына

Мічурына № 2 — Пабудаваны ў 1920–1930-я гады.

Мічурына № 14 — Пабудаваны ў 1936 г.

МОПРаўская // Narodowa, Toepfergasse

МОПРаўская № 6 — Тыповая местачковая камяніца ў стылі эклектыкі.

Мядовая

Мядовая № 3 — Пабудаваны ў 1930-х гадах. Прыклад «крэсовай» сядзібы.

Мядовая № 4 — Пабудаваны ў 1930-х гадах. Прыклад драўлянага канструктывізму.

Мядовая № 5 — Пабудаваны ў 1930-х гадах. Прыклад драўлянага канструктывізму.

Найдуса Ляона // Хлебны завулак, Халодны завулак, Pekarska, Najdusa, Tischlergasse — Сфармавалася ў XV ст. як завулак паміж вуліцамі Віленскай і Вялікай Траецкай. Сёння, па сутнасці, поўнасцю перабудавана.

Найдуса № 1 — Дамы Лейбы і Фейгі Найдусаў. Год пабудовы — 1880 (па іншых звестках — 1885). Канчаткова дабудаваны ў 1924. У XVII ст. участак належаў князям Масальскім. Тут знаходзіліся склеп змешаных мануфактурных тавараў, майстэрня дамскіх плацця ў Міны Веліч, кандытарская Катоўскага, дробязная лаўка з продажам табачных вырабаў Брайны Цыпкін, пральня Евы Ліцкевіч, фотамайстэрня Рубінштэйна, піўная лаўка ў разліў і на вынас Якава Чартка і інш. Магчыма, у ім жыў паэт Л. Найдус. Апошні ўладальнік — фірма «АВС».

Найдуса № 7 — Банк. Пабудаваны на пачатку XX ст. Моцна перабудаваны.

Падольная // Podolska, Podolskaja, Подольная, Karlstr./Uferstr. — Частка старажытнага Гродзенскага падола. Гістарычная забудова не захавалася. У сувязі з праектам будаўніцтва новых пад'езных шляхоў да моста знаходзіцца пад пагрозай знішчэння культурнага пласта.

Падольная № 34 — Пабудаваны ў XX ст. Небагаты гарадскі дом.

Падольная № 43 — Пабудаваны ў XX ст. Тыповая местачковая камяніца.

Падольная № 43 — Палац Румеля, Аляксандраўскае рамеснае вучылішча. Пабудаваны на пачатку XIX ст.

Падпярэселка

Літоўскі ручэй — Упершыню згадваецца ў дакументах за 1498 г. Зараз безыменны ручэй у бок Новага моста.

Паліграфістаў // Варшаўская, Eisenbahnweg

Паліграфістаў № 16 — Скідальскі рынак, Крыты рынак, Цэнтральны рынак. Год пабудовы — 1976. Прыклад гандлёвых збудаванняў новага тыпу.

Панямунь // Загарадная рэзідэнцыя караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Сядзібна-паркавы ансамбль, створаны ў 1771 г. паводле праекта архітэктара Ю. Аляхновіча, дабудоўваўся ў XIX ст. Уласнасць Страінскага, князёў Друцкіх-Любецкіх, гродзенскага павятовага маршалка Ляхніцкага. Ад маёнтка Панямунь захаваліся капліца, дом і стайня. Усе будынкі выкарыстоўваюцца гаспадарчымі службамі горада Гродна. Усе ў вельмі запушчаным стане.

Паповіча

Яўрэйскія могілкі — Адзіныя ўцалелыя яўрэйскія могілкі ў горадзе.

Паповіча № 3 — Кінатэатр «Кастрычнік». Год пабудовы — 1987. Індывідуальны праект У. Еўдакімава, Л. Вільчко і У. Шапавалава.

Паповіча № 5 — Гасцініца «Гродна». Год пабудовы — 1985.

Форт № 4 фортавай лініі 1887–1892 гг. — Стадыён каля СШ № 12. Захавалася значная частка. На валах знаходзяцца месцы для балельшчыкаў.

Парк Жылібера — На месцы былога каралеўскага замка на Гарадніцы. Бярэ пачатак ад парку часоў А. Тызенгаўза вясной 1776 г., калі ў Гродна быў запрошаны французскі прафесар медыцыны, батанік і анатам Жан Эмануэль Жылібер. Па дамове з А. Тызенгаўзам, падпісанай 9 мая 1776 г., ён павінен быў «залажыць сад, неабходны для школы медычнай». У цэнтры саду знаходзіўся домік садоўніка, які павінен быў яго даглядаць, з двюма аранжарэ-

ямі. Пасля 1781 г., калі А. Тызенгаўз быў зняты са сваіх пасад, частка найбольш каштоўных раслін была перавезена ў Вільню. Рэшткі каралеўскага батанічнага саду належалі вайсковаму шпіталю, які размяшчаўся побач. Таму да пачатку XIX ст. называлі яго «лазаретный» (шпітальны). Са стварэннем губернскай улады ён стаў часткай Гарадніцкага саду ці, як яго называлі яшчэ — Губернатарскім.

У другой палове XIX ст. Гарадніцкі сад стаў публічным. Найбольш ўпарадкаваным быў участак, які прылягаў да Гараднічанкі і губернатарскага дома. Тут зрабілі рамантычную «Швейцарскую даліну» з абрывамі, воднымі люстэркамі, якія размяркоўваліся тэрасамі, з лёгкімі ажурнымі масточкамі. У 1924 г. тут закладзены гарадскі парк паводле плана прафесара Таньскага. Чыгунная агароджа з боку вул. Ажэшкі, якая захавалася да нашага часу, была зроблена паводле праекта Ю. Ядкоўскага і на замову магістрата ў яўрэйскай рамеснай школе. На пачатак 1920-х гг. у парку, з боку вул. Акадэміцкай, працаваў летні лакаль клуба «Муза», — з більярднаю, асобнымі кабінетамі, чытальняй, залаю, буфетам і кухняй. Побач стаяла старая кузня часоў А. Тызенгаўза (пазней — уласнасць Ганараты Завіслоўскай), разабраная ўжо пасля 1950 г. У 1926 г. настаўнік гімназіі імя А. Міцкевіча Я. Каханоўскі арганізуе побач з паркам агарод і клумбы. Таксама ў парку былі гарадошная пляцоўка і драўляны масток цераз Гараднічанку — Мендарпляц. Ян Каханоўскі з дазволу магістрата ў 1926 г. заклаў у паўночна-ўсходняй частцы гарадскога парку школьны батанічны сад. У 1928/29 школьным годзе адкрыўся заалагічны аддзел, які стаў асновай для арганізацыі ў 1929 г. гарадскога заапарку. У 1950-я гады вакол парку была зроблена агароджа з кованых эклектычных бардзюр, дэмантаваных з разбуранага моста над Нёманам. Тады ж з боку вул. Дзяржынскага быў пастаўлены помнік Сталіну–Леніну. У 1951 г. на базе былога біялагічнага саду Я. Каханоўскага адчыняецца абласная станцыя юных натуралістаў. Першым яе кіраўніком стаў Н. Жаваранкоў. Для яе працы выкарыстоўвалі ў тым ліку захаваную з 1920-х гадоў аранжарэю-«памаранчарню».

У гады Другой сусветнай вайны ў былым будынку гімназіі знаходзіўся савецкі палявы ваенны шпіталь. Тэрыторыя школьнага батанічнага саду была выкарыстана пад могілкі. Было захавана каля тысячы савецкіх салдат. Пазней перазахавалі ў адной брацкай магіле паблізу Гараднічанкі. У 1953 г. станцыя перанесена на вул. Камунальную, але аранжарэя заставалася яе філіялам яшчэ да канца 1950-х гадоў. У далейшым тэрыторыя былога батанічнага саду была поўнасцю ўключана ў склад гарадскога парку. Усе расліны, уключаючы пробкавае дрэва часоў Жылібера, былі знішчаны, а на іх месцы пабудавана некалькі каруселяў. Рашэннем гарвыканкама ад 15 верасня 1989 г. парку было нададзена імя прафесара Ж. Жылібера. У траўні 1991 г. Саўмін БССР зацвердзіў пастанову аб усталяванні бюста навукоўцу, аднак гэтае ра-

шэнне не было выканана. Апошняя рэканструкцыя парку, падчас якой з'явілася новая «Швейцарская даліна», адбылася ў 2005 г., аднак ужо ў 2006 г. напярэдадні чарговага свята тут быў знесены будынак старой аранжарэі. Тады ж былі знесены драўляны кінатэатр «Летні» — апошнія гады ў ім месціўся клуб «Клетка», і «Лакамка» — драўляны павільён на ўваходзе у парк з боку плошчы Леніна.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан — Пахаваны 46 воінаў і 4 партызаны. Сярод іх Героі Савецкага Саюза Юрый Іўліеў (1923–1945), Вольга Санфірава (1917–1944) і Вольга Соламава (1920–1944).

Парк Каложскі // Górna, Новы парк, парк імя 40-годдзя ВЛКСМ — Калажанскае плато, на якім засаджаны парк, зараз актыўна забудоўваецца. Упершыню амаль за дзесяць стагоддзяў на гэтым месцы павінны з'явіцца жылыя (элітныя) кварталы.

Помнік у гонар 850-годдзя Гродна — Усталяваны ў 1978 г. да 850-годдзя першага згадвання Гродна ў Іпацьеўскім летапісе пад 1128 г. Скульптар Г. Буралкін, архітэктары А. Каралькоў, Г. Пешкаў. Вышыня 31 м.

Парк Румлеўскі // На паўднёва-ўсходняй ускраіне жылога мікрараёна Прынёманскі-2. Існаваў ужо ў XVIII ст. Належаў І. Ляхніцкаму, Я. Румелю, К. Відацкаму, А. Васількоўскаму. У 1886 г. удавой апошняга перададзен пад вайсковы лагер. У цэнтры стаяў сядзібны дом, да якога вяла кляновая алея (захавалася часткова). У паўночна-заходняй частцы захавалася шатровая вежа, узведзеная ў 1880 г. з бутавага каменю. У цэнтры паўднёва-ўсходняй часткі вялізная паляна, абкружаная асобнымі курцінамі. Сярод пасадак ліпа, таполя, каштан, вяз, клён, бэз. Парк — помнік садова-паркавага мастацтва. Менавіта «на Румлёўцы» ў чэрвені 1938 г. пры геалагічнай разведцы межледніковых пластоў Я. Каханоўскі знайшоў ікл маманта, які быў перададзены ў гарадскі музей. Там жа С. Жыўна адшукаў парэшткі шарсцістага насарога. Па планах «рэканструкцыі» ў бліжэйшыя два-тры гады парку пагражае суцэльнае пакрыццё лясных сцежак пліткай і знішчэнне падлеска, што катастрафічна паўплывае на яго экасістэму.

Парыжскай камуны // Вуліца ад айцоў-бернардзінаў да вуліцы на курган, Карэтны завулак, Bernardyńska, Gartnerweg — Сфармавалася ў канцы XV ст. як дарога ад замка да каралеўскіх стайняў.

Парыжскай камуны № 1 — Касцёл Знаходкі святога Крыжа, былы манастыр бернардзінаў. Пачаў будавацца ў 1602 г. Будынкі касцёла і кляштара значна пацярпелі ад пажару ў час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. У 1682 г. будынак кляштара перабудаваны. У XVII–XVIII ст. тут збі-

раліся павятовыя сеймікі. На пачатку XIX ст. пры кляштары працавала прыватная пачатковая школа. Значна пацярпеў у гады Другой сусветнай вайны. Будынкі кляштара былі вернуты рымска-каталіцкай царкве ў 1990 г. У іх размясцілася Вышэйшая рымска-каталіцкая духоўная семінарыя.

Помнік настаўнікам і вучням — У 1981 г. на ўшанаванне памяці настаўнікаў і вучняў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, перад будынкам сярэдняй школы № 1 пастаўлена памятная стэла.

Парыжскай камуны № 5 — Пабудаваны ў 1920-я гады. Гарадская віла ў стылі сэцэсіі.

Парыжскай камуны № 5а — Пабудаваны ў 1920-я гады. Гарадская віла ў стылі сэцэсіі.

Паўлава

Паўлава № 11д — Мураваны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Паўлоўскага // Пясочны завулак, Жандарскі завулак, Piaskowa, Heilsberger-Str.

Паўлоўскага № 3 — Пабудаваны на канец XIX ст.

Паўлоўскага № 6 — Пабудаваны на пачатку XX ст.

Паўлоўскага № 7 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Паўлоўскага № 8 — Пабудаваны каля 1900–1903 гг. Перабудаваны ў трохпавярховы.

Паўлоўскага № 9 — Пабудаваны ў другой палове XIX ст. Эклектыка. Прыгожы фасад.

Паўлоўскага № 9а — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Паўлоўскага № 9б — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка. Вельмі прыгожыя элементы.

Паўлоўскага № 11 — Былы публічны дом. Пабудаваны ў 1902 г.

Паўлоўскага № 11б — Пабудаваны на пачатку XX ст. Звычайны прыклад эклектыкі.

Паўлоўскага № 11в — Пабудаваны на пачатку XX ст. Звычайны прыклад эклектыкі.

Паўлоўскага № 11д — Пабудаваны на пачатку XX ст. Звычайны прыклад эклектыкі.

Паўлоўскага № 15 — Пабудаваны ў канцы XIX ст. Эклектыка, аднак гаўбец выкананы ў стылі мадэрну. З 1906 г. тут знаходзіўся пункт яўрэйскай эміграцыі ў Палесціну і ЗША.

Паўлоўскага № 15а — Пабудаваны ў канцы XIX ст. Сціплы прыклад эклектыкі.

Паўлоўскага № 15б — Пабудаваны ў канцы XIX ст. Перабудаваны флігель.

Паўлоўскага № 15/1 — Пабудаваны ў канцы XIX ст. Эклектыка. Нетыповы для Гродна прыклад шматпавярховай камяніцы.

Будынак знаходзіцца на месцы старых гарадскіх умацаванняў прыкладна сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст.

Паўлоўскага № 17 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Невыразная эклектыка.

Паўлоўскага № 21 — Пабудаваны ў 1915 г. Эклектыка.

Мемарыяльная дошка памяці генерал-палкоўніка М. Паўлоўскага (1903–1960).

Перамогі // Калгасная

Перамогі № 5 — Свята-Уладзімірская царква-школа. Пабудавана ў 1896 г. інж. І. Плотнікавым. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. У сярэдзіне 60-х гадоў XX ст. Уладзімірская царква ледзь не папоўніла спіс знішчаных храмаў горада. Выканкам Гродзенскага гарсавета на падставе рашэння ад 09.12.1964 г. за № 649 звярнуўся з просьбай у выканкам аблсавета аб закрыцці царквы. Прапанавалася прыстасаваць будынак царквы пад клуб. У жніўні 1965 г. Гродзенскі гарвыканкам згодна са сваім рашэннем (подпісы нам. старшыні гарвыканкама Л. Сташкевіча і сакратара Е. Архіпава) прасіў Гродзенскі аблвыканкам «зняць з уліку дзеючую Уладзімірскую царкву на вуліцы Калгаснай з далейшым зносам гэтага будынка».

Вайсковыя могілкі — Пахаваны савецкія воіны, якія загінулі ў 1939 г. — Р. Гарнавых, Ф. Квітко, брацкая магіла чырвонаармейцаў з верасня 1939 г. У1940 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Перамогі завулак

Праваслаўныя могілкі // Закладзены ў канцы XIX ст.

Францішканскія могілкі // Закладзены прыкладна напрыканцы XVIII ст. У 1854 г. тут была ўзведзена капліца, фундатарам якой стаў Якаў Румель. З найстарэйшых помнікаў, што захаваліся на могілках, — эпітафія на магіле Антаніны Кушалеўскай, якая памерла ў 1865 г.

Форт № 3 фортавай лініі 1887–1892 гг. — Гаражны масіў на паўднёвы ўсход ад Францішканскіх могілак. Знішчаны амаль поўнасцю.

1-я працоўная // Крывая, Webergasse

1-я працоўная № 4 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

1-я працоўная № 6 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

1-я працоўная № 8 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

1-я працоўная № 10 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

1-я працоўная № 12 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Першага мая // Якаўлеўскі праспект, 3-go maja, Bismark str.

Першага мая № 2/1 — Камяніца лекаркі-дантысткі Яніны Сыртаўт (Janina Syrtowtt). Дом Р. Шырмы. Год пабудовы — 1930. Перабудаваны ў 1947 г. Канструктывізм. На будынку ўсталявана памятная дошка ў гонар беларускага грамадска-культурнага дзеяча Р. Шырмы.

Першага мая № 3 — Гродзенскае рэальнае вучылішча цэсарэвіча Аляксея, штаб генерала 10-й арміі Ф. Сіверса, гімназія Міцкевіча, школа, аграрны універсітэт. Пабудаваны ў 1907–1914 гг. Выключна цікавы прыклад стылю мадэрн.

Першага мая № 5 — Кірха. Пабудавана на месцы тракціра часоў А. Тызенгаўза ў канцы 1870-х гадоў. Перабудавана ў 1912 г. Пры кірсе — стары дом пастара (гл. Акадэміцкая № 7/1).

Першага мая № 6 — Пабудаваны прыкладна ў 1920-х гадах. Гарадскі асабняк.

Першага мая № 6а — Драўляны. Стыльны прыклад канструктывізму. Знясены ў канцы кастрычніка 2006 г.

Першага мая № 8 — Гродзенская інжынерная дыстанцыя, інжынерна-тапаграфічная служба, камандаванне інжынерна-сапёрнымі службамі ДОК III, вайсковая камендатура. Пабудаваны на пачатку XX ст. Перабудаваны ў 1930-х і 1990-х гадах.

Першага мая № 10 — Дом Максіма Багдановіча.

Першага мая № 11 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Першага мая № 12 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Першага мая № 12а — Дом Юзафа Гіршкохума. Год пабудовы — 1885. На 1913 г. тут знаходзілася камера судовага следчага па важных справах.

Першага мая № 14 — Дом Э. Лістоўскага. Год пабудовы — 1899. Уласнасць першага пасля Першай сусветнай вайны прэзідэнта Гродна.

Першага мая № 16 — Дом Мендэля і Меера Ферлікоўскіх. Пабудаваны каля 1901 г. Перабудаваны.

Першага мая № 17 — Драўляная сядзіба пачатку XX ст.

Першага мая № 18 — Дом Алены Нарбут. Год пабудовы — 1910. З 1922 г. тут працаваў спажывецкі магазін Леі Вядніцкай. Перабудаваны.

Першага мая № 20 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Першага мая № 22 — Дзіцячы сад № 21. На месцы былых лютэранскіх могілак. Знесены ў сярэдзіне 1970-х гадоў.

Першага мая № 24 — Дом М. Марозава. Год пабудовы — 1909. Сярод іншых на 1913 г. тут жыў губернскі землямер, межавы інжынер Скарабагатаў Піліп Пятровіч.

Пралетарская вул. // Сабачая горка (Psia górka), Mysliwska górka — Месца экзекуцый у 1920–1939 гг.

Пышкі — лясны масіў, зона адпачынку. За 1 км на захад ад горада, на правым беразе Нёмана, знаходзіцца стаянка каменнага веку. Акрамя гэтага, захаваліся пабудовы форта № 5 (па іншай нумарацыі № 1) фортавай лініі 1887–1892 гг. Як галоўны з фартоў меў больш складаную форму, планаваўся да выкарыстання ў 1912–1915 гг. як цэнтральная станцыя сувязі.

Рабочая // Juryzdyka

«Лесвіца на Завершчызну» — Згодна В. Чарапіцы, пабудавана ў 1942–1943 гг. з надгробкаў з яўрэйскіх могілкаў паводле загаду нямецкіх уладаў. Магчыма, аднак, што паўстала значна раней.

Рабочая № 17 — Дом Петрулевіч.

Рабочая № 57 — Дом пекара Пікаловіча.

Рабочая № 61 — «Белы дом». Год пабудовы — 1914.

Рабочая № 85 — Дом Канавегаў. Пабудаваны ў 1880–1890-я гады.

Рыбацкая // Рыбацкая слабада, Rybacka, Pierackiego, Memelufer

Рыбацкая № 6/1 — Барысаглебская царква, Каложа. Пабудавана ў канцы XII ст. Была часткова разбурана ў 1853, 1859 і 1889 гг. Ужо ў 1864 г. купец Сідорскі самастойна спрабаваў аднавіць святыню, аднак працы былі спынены ў сувязі з адсутнасцю зацверджанага праекта. Рэканструявана ў 1872–1873 гг. Царква з'явілася першым помнікам, пытанне пра захаванне якой разглядалася Імператарскай археалагічнай камісіяй у 1896 г. У 1904 г. пры Сінодзе была створана спецыяльная камісія па яе рэстаўрацыі. Царкву даследавалі: у XIX ст. У. Грозноў, на пачатку XX ст. — П. Пакрышкін, у 30-я гады — Ю. Ядкоўскі, у 1946 г. — І. Хозераў, у 40-я гады — М. Варонін, у 80-я гады — А. Трусаў і П. Рапапорт. Работы па кансервацыі праведзены ў 1910 г. і 1935 гг. Кансервацыйна-рамонтныя — у 1970 г. У 1967 г. пастановаю ЦК КПБ і Саўміна БССР Каложскі храм быў абвешчаны гісторыка-археалагічным запаведнікам. На пачатак 1980-х — пачатак 2000-х гадоў на Каложы былі праведзены чарговыя рэстаўрацыйныя працы, часткова ўмацаваны схіл. На працягу 2006 г. інфармацыя аб рэстаўрацыі-«рэканструкцыі» Каложы неаднаразова з'яўлялася ў афіцыйных СМІ. Насцярожвае, аднак, непразрыстасць працэсу выбару праекта рэстаўрацыі і адсутнасць досведу ў працы з аб'ектам падобнай каштоўнасці ў айчынных будаўнікоў.

Рэйманта // Rejmonta, Feldherrnstr. — Адна з крайніх вуліц «Новага свету». Канчаткова сфармавалася ў 1920–1930-х гадах.

Рэйманта № 4 — Эклектыка пачатку XX ст. У будынку захаваліся адны з найпрыгажэйшых разьбяных дзвярэй у горадзе.

Рэйманта № 9 — Атынкаваны аднапавярховы будынак 1920–1930-х гадоў. Захаваліся дзверы, аздобленыя разьбой на побытавыя сюжэты.

Рэйманта № 10 — Драўляная віла 1920–1930-х гадоў.

Рэйманта № 16 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Рэйманта № 18 — Год пабудовы — 1932. Драўляны аднапавярховы будынак з калонамі.

Рэйманта № 24 — Пабудаваны ў 1920–1930-х гадах.

Рэпіна — Трасіроўка вуліцы супадае з галоўнай алеяй палаца-паркавага ансамбля Аўгустова. Пабудаваны напрыканцы XVIIIст. архітэктарам Дж. Сака як паляўнічая рэзідэнцыя караля Станіслава-Аўгуста. Уласнасць О'Брайнаў дэ Ласі. Знішчаны ў 1915 г., калі рускае войска, адыходзячы ад Гродна, спаліла сядзібу.

Рэпіна № 2 — Прысядзібная капліца-ратонда. Год пабудовы — 1817. Узведзеная архітэктарам Фардонам па правым баку алеі, якая вяла ад маёнтка Аўгустова да Нёмана. Яе акружае высокая мураваная агароджа. Па задуме фундатара графа Караля Медэма капліца мусіла нагадваць базіліку святых Пятра і Паўла ў Рыме. У склепе капліцы знаходзілася крыпта з пахаваннямі роду дэ Ласі.

Каралеўская эканамічная карчма — Пабудавана па праекце Дж. Сака ў 1782 г. пры перакрыжаванні ўязной алеі з гродзенскім загарадным трактам. Пасля 1921 г. — сядзіба О'Брайнаў дэ Ласі.

Савецкая // Віленская, Гімназіяльная, Саборная, Dominikanska, Hinderburg str. — Адна з галоўных вуліц цэнтральнай часткі горада. Пачала фармавацца пасля 1496 г. з пераносам Рынку ў раён сучаснай Савецкай плошчы. Звязвала галоўную гандлёвую плошчу Гродна з Віленскім гасцінцам і ажно да канца XVIII ст. заставалася ўласна гандлёвым шляхам. З 1874 г. паводле праекта рэканструкцыі Гродна губернскага архітэктара Гур'ева забудоўвалася толькі мураванымі дамамі, якія належалі пераважна купцам і прадпрымальнікам. Сучасны выгляд вуліца пачала набываць пасля пажару 1885 г. У час Вялікай Айчыннай вайны вуліца часткова разбурана, адноўлена пасля вайны. З 1989 г. пешаходная. У 1960–1970-я гады вуліца Савецкая страціла вялікую колькасць дамоў і дваровых флігеляў, некаторыя фасады былі непазнавальна зменены.

Савецкая № 1 — «Дом мейскі гасцінны», Мураваная гарадская карчма, камяніца Зеляпугі, палац князёў Сангушкаў, аптэка па Дамініканскай, крама «Цацкі», крама «Ратушная». Пабудаваны ў XVI ст. — 1742 г. Неаднаразова перабудоўваўся.

Савецкая № 3 — Год пабудовы — 1880, 1890, 1914. Перабудоўваўся ў 1924 і 1933 гг. Эклектыка. Раней тут размяшчаліся крамы, пякарня, садавінны склеп, 12 кватэр; цяпер жылы дом.

Савецкая № 4 — Будынак Аблсаўпрофа. Пабудаваны ў 1950-я гады. Стылёвы «сталінскі ампір», які сваёй аддаленасцю ад гістарычнай восі вуліцы разбівае яе на самым выйсці з колішняга Рынку. У канцы XIX ст. тут знаходзіліся мураваныя дамы са стайняй купца Ізраэля Закгэйма, крама Каплана, новая банкаўская кантора Гурвіч, дамы Лейзера Брэгмана і яго жонкі Яхі Грынберг з крамамі Мухіна, Жоўтка і Раўтэнштэйна ды дом Таўбы Грынберг на месцы былога палаца Сапегаў.

Савецкая № 5 — Дом Шарашэўскага, дом Багуміла. Год пабудовы — 1848. У 1886 г. прыбудаваны мураваны свіран і хлеў, якія ў 1910 г. былі перароблены ў флігелі.

Савецкая № 6 — Дамініканскі манастыр, дамініканская школа, дамініканская гімназія, губернская мужчынская гімназія, мужчынская класічная гімназія, настаўніцкая семінарыя Польскай мацежы школьна, школа фольксдойчаў. Год пабудовы — 1735. Перабудоўваўся ў 1836 г., 60-я і 80-я гады XIX ст. Пасля Другой сусветнай вайны будынак гімназіі быў прыстасаваны пад жылыя кватэры.

Савецкая № 7 — Дом Фукса. Год пабудовы — 1823. Тут арандаваў кватэру Ільдэфонс Мілевіч — гродзенскі каморнік, які падчас студзеньскага паўстання быў сакратаром паўстанцкага цывільнага начальніка. На кватэры Мілевіча, як і ў доме Ромераў, адбываліся патаемныя сустрэчы кіраўнікоў паў-

стання, прыпыняўся Канстанцін Вікенці Каліноўскі. Пасля пажару 1885 г. тут з'явіліся крамы Лапіна, Зільбермана, Красіўца.

Савецкая № 8 — Новая дамініканская школа, жаночы пансіён, гарадская ўправа, гарадское паліцэйскае ўпраўленне, Магістрат. Пабудаваны каля 1789 г. паводле праекта Л. Грынцэвіча.

Дамініканскі касцёл — Існаваў у 1632–1832 гг. Пасля 1867 г. пераўтвораны ў палкавую царкву Ямбургскага ўланскага прынца Фрыдрыха Віртэмбергскага палка. Знішчаны ў 1873–1874 гг., а з яго цэглы побач была пабудавана гімназічная спартыўная зала. У 1876 г. месца па касцёле было засаджана дрэвамі, пабудавана агароджа. Зараз тут сквер з помнікам.

Помнік маршалу В. Сакалоўскаму (1897–1968) — Пастаўлены ў 1973 г. Скульптар — Г. Мурамцаў, архітэктар — В. Аладаў. На гэтым месцы на пачатку 1950-х стаяў помнік Сталіну, які па мясцовай легендзе быў пазней закапаны тутжа ў зямлю.

Савецкая № 9 — Кінатэатр «Гродна», філармонія. Год пабудовы — 1961. Будынак перакрыў сабой вуліцу Калючынскую. Адначасова пры пабудове былі наўмысна зруйнаваны камяніцы пры вуліцы Савецкай.

Савецкая № 10 — Палац Сапегаў па Дамініканскай, дом Саламона Лапіна, райвыканкам. Год пабудовы — 1795. У 1873 г. прыбудаваны двухпавярховы флігель. У 1970-я гады непазнавальна перароблены ў трохпавярховы будынак для гарадскога Савета народных дэпутатаў і страціў усё былое аздабленне.

Савецкая № 12 — Дом купцоў Франкаў, магазін Жураўскага. Год пабудовы — 1900. Эклектыка. Першапачаткова належаў гродзенскаму друкару Давыду Мейлаховічу. Пажар зруйнаваў Мейлаховіча і прымусіў у канцы 90-х прадаць маёмасць купцам Франкам, якія ў хуткім часе пабудавалі тут люксусовы дом з усімі выгодамі і знакамітым магазінам Жураўскага.

Савецкая № 13 — Дом Шаі Піка. Год пабудовы — 1831. Перабудаваны ў 1900.

Савецкая № 14 — Касцёл і шпіталь Св. Духа, дом А. Тарлоўскага, гатэль «Славянскі», нямецкі вайсковы пансіянат «Стары сябра», Ленінскі райвыканкам. Быў пабудаваны на фундуш каралевы Боны ад 9 кастрычніка 1551 г. Касцёл узводзіўся на Пушкарскім месцы — абарончай мяжы Гродна сярэдзіны XVI ст. Пасля студзеньскага паўстання камяніцу набыў купец 2-й гільдыі, гандляр збожжам Абель Тарлоўскі. Пасля пажару 1885 г. ён перапрадаў пашкоджаныя будынкі купцу Іоўну Хозэ. У 1896 г. Іоўна памёр. У 90-х гадах XIX ст. перароблены пад гатэль.

Савецкая № 15 — Дом Левандоўскага. Пабудаваны паміж 1875–1885 гг. Прыклад эклектычнай архітэктуры з перавагай элементаў класіцызму.

Савецкая № 15а — Гатэль Левандоўскага. Год пабудовы — 1895.

Савецкая № 17 — Гатэль «Расія». Год пабудовы — 1811. Пабудова і аздабленне маюць выразныя рысы класіцызму.

Савецкая № 17а — Год пабудовы — 1895.

Савецкая № 17б — Год пабудовы — 1820.

Савецкая № 18 — Гандлёвы дом «Нёман» — універмаг. Пабудаваны на месцы гатэля «Еўропа». Да гэтага тут месціліся дамы з мураванай крамай Мортхеля Левінсона, крама Мусоўскага, пазней — Пялецкага. Складаецца з дзвюх частак: «сталінскага ампіру» з 1950-х гадоў і будынка 1970-х гадоў. Пры пабудове быў зруйнаваны шэраг камяніцаў, якія складалі неад'емную частку архітэктанічнага комплексу гістарычнай забудовы вул. Савецкай.

Савецкая № 19 — Дваранскі дэпутацкі сход. Год пабудовы — 1848. Дабудаваны ў 1875 г. у стылі эклектыкі з перавагай элементаў класіцызму.

Савецкая № 20 — Гатэль Лейбы Фэдэра, гатэль «Камерцыйны», «Гандлёвы», рэстаран «Беласток». Год пабудовы — 1897 (па іншых звестках — 1901).

Савецкая № 21 — Дом купца Чартка. Год пабудовы каля 1866. Зараз непазнавальна перароблены пад магазін.

Савецкая № 23– Дом Ромера, дом Ясяноўскіх, гатэль Пецярбургскі, Маскоўскі, Hotel Polski, месца паседжанняў урада БНР. Год пабудовы — 1856. Эклектыка. Ясяноўскім дом дастаўся ад высланых пасля студзеньскага паўстання ў Сібір кіраўніка паўстання на Гродзеншчыне Севярына Ромера і яго жонкі Тэадоры. Ясяноўскі перабудаваў дом паўстанцаў пад гатэль «Пецярбургскі» і адкрыў тут склеп рэйнскіх вінаў і магазін каланіяльных тавараў. У сакавіку-красавіку 1919 г. тут працавалі Беларускі нацыянальны камітэт, Беларуская павятовая рада, Цэнтральная беларуская рада Гродзеншчыны, клуб «Беларуская хатка», Грамада беларускай моладзі, курсы беларускай мовы, адбываліся беларускія вечарыны, працавала рэдакцыя газеты «Беларусь».

Савецкая № 25 — Год пабудовы — 1870. Пераважаюць элементы стылю мадэрн.

Савецкая № 27 — Год пабудовы — 1870.

Савецкая № 31/1 — Будынак Гродзенскага акружнога суда. Пабудаваны ў 1884 г. па праекце архітэктара Небальсіна. Архітэктура будынка мае стылізатарскі характар, у ёй выкарыстаны формы і прыёмы розных будаўнічых эпох.

Савецкая плошча // Рынак, Ратушная, Гандлёвая, Парадная, Саборная, Фарная плошча, plac Stefana Batorego, Kirchplatz — Гарадскі рынак сфар-

маваўся да пачатку XV ст. Забудова плошчы моцна была пашкоджана падчас Першай сусветнай вайны, падзей верасня 1939 г., у 1941 і 1944 гг. У выніку апошняй «рэканструкцыі» 2005–2006 гг. плошча страціла сваю першапачатковую планіроўку. Былі пашкоджаны падмуркі палаца Радзівілаў, Ратушы і гандлёвых радоў, знішчаны магдэбургскі калодзеж і значная частка культурнага пласта. Разам з тым апошняя «рэканструкцыя» абудзіла грамадскую актыўнасць, паставіўшы актуальнае пытанне аб эфектыўнасці ў сённяшніх умовах працы дзяржаўных органаў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Гродна.

Савецкая плошча № 1 — Палац культуры Тэкстыльшчыкаў. Пабудаваны ў 1958 г. па тыпавым праекце (архітэктар — І. Рожын) з выкарыстаннем элементаў класіцызму. Прыклад архітэктуры 1940–1950-х гадоў.

Савецкая плошча № 2 — Дом купца Мураўёва, biblioteka miejska, абласная бібліятэка імя Я. Карскага. Год пабудовы — 1914 (па іншых даных — 1890-я).

Побач, там дзе зараз пустая пляцоўка (апошнія некалькі год — тралейбусны прыстанак), **на пачатку XX ст. знаходзілася фотамайстэрня Якава Салавейчыка.**

Савецкая плошча № 4 — Касцёл святога Францыска Ксаверыя і кляштар езуітаў. Пабудаваны ў XVII–XVIII стст. Будаўніцтва калегіума і першага драўлянага касцёла Пятра і Паўла (існаваў да 1700) вялося ў 1650–1964 гг. пры гродзенскім пробашчу Далмаце Ісакоўскім. У 1678 г. па фундацыі Самуэля і Канстанцыі Лозаў пабудаваны мураваны касцёл, асвечаны ў імя св. Францішка Ксаверыя ў 1705 г. Комплекс уключаў будынкі касцёла, калегіума, бібліятэкі, друкарні, аптэкі, жылых карпусоў, гаспадарчыя пабудовы. Першапачатковы калегіум будавалі ў 1677–1683 гг., новы — у 1691–1763 гг. У 1750–1752 гг. муляр К. Бурман надбудаваў лёгкія ажурныя вежы. У 1725 г. на вежы ўладкаваны гадзіннік-куранты. Перад уваходам у пачатку XX ст. пабудавана шырокая лесвіца з пастаўленай на яе парапет скульптурай Хрыста з крыжам.

Савецкая плошча № 4 — Аптэка, салон мэблі, Дом настаўніка. У 1709 г. побач з касцёлам быў узведзены асобны будынак аптэкі, да якога ў 1763 г. дабудаваны другі паверх. Рэстаўравана ў 1970-х гадах.

Помнік у гонар воінаў-вызваліцеляў — Танк Т-34. Усталяваны ў 1968 г.

Савецкіх памежнікаў // Łososiańska, Augustower-Str.

«Кунстава» — У канцы XVIII ст. раўначасна з Гарадніцай на беразе рэчкі Ласасянка меркавалася стварыць гандлёва-прамысловы цэнтр «Кунстава» («Майстэрства»). Планавалася пабудаваць 14 мануфактураў, рынак, скла-

ды, канторы і дамы для рабочых. Ад гэтага часу паходзіць назва раёна — «Фолюш». Захаваліся зруйнаваныя фрагменты майстэрняў і воднага млына больш позняга часу.

Сенсацыяй сталі рэшткі маманта, якія ў сакавіку 1837 г. былі знойдзены ў Фолюшы. Ласоснаўскі млынар Людвіг Міхальскі на беразе Ласасянкі знайшоў рог даўжынёю каля трох аршынаў і ніжнюю сківіцу з двума зубамі. Гродзенскі мешчанін Адам Макарэвіч адшукаў на гэтым месцы галаву з двума зубамі, пярэднюю і заднюю лапатку даўжынёю і шырынёю каля аршына. Мясцовы памешчык дэ Ласі паслаў сюды сваіх людзей, і яны адкапалі тры кавалкі рабрын маманта. Даследаванні месца знаходкі ў маі 1837 г. паказалі, што спачатку ў масе торфу захоўваўся цэлы шкілет маманта. У 1855 г. па распараджэнні апекуна Віленскай навучальнай акругі тая частка маманта, якая належала Гродзенскай мужчынскай гімназіі (чэрап, пярэдняя і задняя лапаткі), была перададзена ў Віленскі музей.

Друкарня КПЗБ — Створана ў 1926 г. у падвале дома І. Пата па вул. Ласасянскай № 48. Будынак не захаваўся.

Помнік савецкім памежнікам.

Савецкіх памежнікаў № 50 — Пабудаваны ў пачатку XX ст.

Савецкіх памежнікаў № 52 — Пабудаваны ў пачатку XX ст.

Савецкіх памежнікаў № 54 — Пабудаваны ў пачатаку XX ст. Эклектыка.

Сацыялістычная // Банкавая, Паштовая, Басняцкая, Дрывяная, Аліскоўская, Кузнечны зав., Гарохавая, Базарная, zaułek Bazarowy+zaułek Kowalski, Witoldowa+Kurhan, Orlicz-Dreszera, Ottostr./Martinstr.+Danziger-Str. — Асноўная частка сфармавалася ў XVIII ст. Найбольш старажытны адрэзак вуліцы — паміж сучаснымі вуліцамі К. Маркса і Свярдлова.

Сацыялістычная № 4 — Кінатэатр Манастырскага, «Эдэн», «Палонія», «Чырвоная зорка». Пабудаваны на пачатку XX ст. Элементы мадэрну.

Сацыялістычная № 6 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Сацыялістычная № 10 — Дом Фрумкіна на Паштовой, дом Берка Лейбавіча Гардона. Год пабудовы — 1879. Эклектыка з элементамі мадэрну.

Сацыялістычная № 12 — Год пабудовы — 1879. Стыль эклектыка з элементамі мадэрну.

Сквер па правым баку вул. Сацыялістычнай — Карчма (асторыя) «Выгода». Была пабудавана ў 1770-я гады ў Гродне абапал галоўнай магістралі Гарадніцы. У канцы XVIIIст. гаспадаром тут быў шынкар Арцішэўскі. Была знесена ў канцы XIX ст.

Аўтастаянка на перакрыжаванні вул. Сацыялістычнай і Карбышава — На гэтым месцы стаяў дом выдатнага гродзенскага гісторыка Ю. Ядкоўскага.

Сацыялістычная № 15 — Год пабудовы — 1835.

Сацыялістычная № 17 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Сацыялістычная № 19 — Гродзенскае аддзяленне дзяржбанка, камерцыйны банк, гатэль «Метраполь». Пабудаваны ў канцы XIX ст.

Сацыялістычная № 21 — Былы банк. Год пабудовы — 1889.

Сацыялістычная № 22 — Гродзенская тэлефонна-тэлеграфная станцыя. Пабудавана ў 1910 г. па праекце архітэктара Небальсіна.

Сацыялістычная № 23 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Сацыялістычная № 25 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Сацыялістычная № 26 — Пабудаваны ў канцы XIX ст.

Сацыялістычная № 27 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Сацыялістычная № 30 — Год пабудовы — 1890. Падчас рамонту ў печы дома быў знойдзены скарб — шпага канца XIX ст. і музычная шкатулка.

Сацыялістычная № 30а — Пабудаваны на пачатку XX ст. Сціплая эклектыка.

Сацыялістычная № 32 — Дом купца Уладзіміра Крэйцара, рэдакцыя «Вечернего Гродно». Год пабудовы — 1899. Быў «рэканструяваны» са зносам гістарычнай забудовы.

Сацыялістычная № 33 — Год пабудовы — 1889. Эклектыка.

Сацыялістычная № 33а — Год пабудовы — 1910. Эклектыка.

Сацыялістычная № 35 — Малебная школа Бенахім. Год пабудовы — 1912. Эклектыка.

Сацыялістычная № 37 — Год пабудовы — 1905. Віла ў стылі мадэрн. На пачатку 1920-х гадоў тут працавала амбулаторыя ад яўрэйскага шпіталя.

Сацыялістычная № 38 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Сацыялістычная № 39 — Дом Канстанціна Тарасевіча. Год пабудовы — 1883. Эклектыка.

Сацыялістычная № 40 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Сацыялістычная № 42 — Год пабудовы — 1910. Эклектыка.

Сацыялістычная № 43 — Пабудаваны у пачатку XX ст. Перароблены.

Сацыялістычная № 44 — Дом Крэйцара. Пабудаваны у пачатаку XX ст. Выключна цікавы прыклад мадэрну. У 1910 г. сядзіба купца Уладзіміра Крэйцара складалася з новага двухпавярховага з мезанінам мураванага дома, пакрытага бляхай, аднапавярховага з мезанінам флігеля, хлява і саду. На першым паверсе дома ў трох пакоях месціўся магазін домаўладальніка, у мезаніне быў склад, які займаў два пакоі. Іншыя памяшканні займала кватэра

домаўладальніка з лазенкай, трыма гаўбцамі і верандай. Існуе пагроза «рэканструкцыі» помніка цягам апошняга часу са стратай гістарычнай аўтэнтычнасці.

Сацыялістычная № 52 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Сацыялістычная № 54 — Год пабудовы — 1892. Эклектыка.

Сквер насупраць вуліцы Свярдлова (раней перыкрыжаванне Сеннай, Татарскай вуліц і Рыначнай плошчы) — Магчыма, на гэтым месцы знаходзіўся палац Агінскага. Быў узведзены ў 1790 г. па праекце архітэктара К. Шыльдгауза. Пазней перабудаваны пад будынак управаўлення дзяржмаёмасцю (на 1903 г.).

Сацыялістычная № 56а — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Сацыялістычная № 60 — Год пабудовы — 1901. Эклектыка.

Сацыялістычная № 62 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Сацыялістычная № 64 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Свярдлова // На курган, Дзям'янаўская, Баніфратарская, Татарская, Bonifraterska-Stara, Walterstr. — Сфармавалася ў сярэдзіне XVI ст.

Свярдлова № 2 — Гродзенскія воданапорныя вежы. «Вежы Ася і Бася». Усходняя вежа пабудавана ў 1905 г. Заходняя — у 1890 г. Помнікі вытворчай архітэктуры.

Свярдлова № 3 — Новы будынак яўрэйскага шпіталя, медвучылішча. Год пабудовы — 1908. Эклектыка з элементамі стылю мадэрн.

Свярдлова № 4 — Новыя жандарскія казармы. Год пабудовы — 1902. Эклектыка. На ганку захавалася лацінская манаграма: «SALVE».

Свярдлова № 4а — Год пабудовы — 1926. Польскі варыянт сэцэсіі.

Свярдлова № 6а — Год пабудовы — 1926. Польскі варыянт сэцэсіі.

Свярдлова № 8 — Пабудаваны ў 1920-х гадах. Польскі варыянт сэцэсіі.

Свярдлова № 8а — Год пабудовы — 1926. Польскі варыянт сэцэсіі. Магчыма, на гэтым месцы ў 1729 г. па фундацыі віленскага епіскапа быў пабудаваны драўляны касцёл і кляштар са шпіталем манахаў баніфратраў.

Свярдлова № 10 — Год пабудовы — 1926. Польскі варыянт сэцэсіі.

Свярдлова № 11 — Моцна перароблена эклектыка.

Свярдлова № 12 — Год пабудовы — 1910. Эклектыка.

Свярдлова № 22 — Эклектыка.

Свярдлова № 22а — Год пабудовы — 1899. Эклектыка.

Скосная // Skosna

Капліца 1934 г.

Славацкага

Славацкага № 19 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Славацкага № 21 — Драўляны.

Славацкага № 23 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Славінскага

Форт № 2 фортавай лініі 1887–1892 гг. — Канцавы прыпынак тралейбусаў № 9, 12 па вул. Славінскага. Знішчаны амаль поўнасцю.

Соламавай

Помнік сакратару Гродзенскага падпольнага гаркома камсамола Вользе Соламавай — Устаноўлены ў 1977 г. перад будынкам сярэдняй школы № 19.

Месца лагера смерці — Створаны ў 1941 г. нямецкімі ўладамі. Праз лагер прайшло каля 36 тысяч чалавек. Больш за 18 тысяч пахаваны ў 68 ямах-магілах. У 1965 г. на тэрыторыі лагера пастаўлена стэла.

Студэнцкая // вуліца без назвы, як праезд да складоў табачнага таварыства Шарашэўскіх з вуліцы Сафійскай, завулак Зялёны, Zielona, Jelinka, Studeńcka, Loetzener Str.

Студэнцкая № 3 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Простая эклектыка.

Студэнцкая № 4 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад позняй эклектыкі.

Студэнцкая № 5 — Пабудаваны ў канцы XIX ст. Эклектыка.

Студэнцкая № 6 — Дом урача Алшыбаева, «дом з ільвамі». Год пабудовы — 1906. Мадэрн.

Студэнцкая № 7 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыклад эклектыкі.

Студэнцкая № 8 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка.

Студэнцкая № 9 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Дабудаваная эклектыка.

Студэнцкая № 9а — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка. Цікавая лесвіца.

Студэнцкая № 11 — Пабудаваны ў канцы XIX ст. Эклектыка. Дабудаваны паверх.

На рагу вул. Студэнцкай і Леніна ў 1950–1960-я гады знаходзілася драўляная піўная, якая карысталася попытам сярод мясцовых жыхароў, у тым ліку — студэнтаў суседняга інстытута.

Суворава завулак

Суворава завулак № 10 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

Сямнаццатага верасня // Пушкінская, Puszkinskaja-Krajowa, 11 listopada, Moelder str.

17 верасня № 1 — **Крама каланіяльных тавараў Канела**. Пабудаваны на пачатку XX ст.

17 верасня № 8 — Двухпавярховы драўляны асабняк з мансардай.

17 верасня № 10 — Пабудаваны на пачатку XX ст. Эклектыка з элементамі мадэрну.

17 верасня № 10а — Мураваны. Сціплы прыклад канструктывізму.

17 верасня № 12 — Пабудаваны ў 1920–1930-я гады. Гарадскі асабняк.

17 верасня № 13 — **Дом У. Федарука.** Пабудаваны ў пачатку XX ст. Дом апошняга дырэктара беларускай школы ў Гродне.

17 верасня № 15 — Пабудаваны ў пачатку XX ст.

17 верасня № 17 — **Дом Ярашэвіча.** Пабудаваны ў пачатку XX ст.

17 верасня № 19 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Прыклад невыразнай эклектыкі.

17 верасня № 30 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

17 верасня № 36 — Драўляны. Сціплы прыклад канструктывізму.

17 верасня № 48 — **Сярэдняя школа № 2.** Прыкладна на гэтым месцы ў 1930-х гадах жыў Ян Каханоўскі (1894–1941) — заснавальнік гродзенскага заапарку.

17 верасня № 52 — Мураваны. Сціплы прыклад канструктывізму.

17 верасня № 54 — Прыклад канструктывізму.

17 верасня № 58 — Прыклад канструктывізму.

17 верасня № 59/2 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Прыклад цаглянай эклектыкі. Былая вуліца Фабрычная.

17 верасня № 59/4 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Прыклад цаглянай эклектыкі.

17 верасня № 59/6 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Прыклад цаглянай эклектыкі.

17 верасня № 59/8 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Прыклад цаглянай эклектыкі.

Аўтастаянка на перакрыжыванні вул. 17 верасня і Цімірязева — На гэтым месцы на пачатку XIX ст. знаходзіўся казённы вінны склад.

17 верасня № 61 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Без стылю.

Тэлеграфная // Баніфратарскі завулак, Druga Bosniacka, Bosniacka, Tilsiter str. — Забудова вуліцы склалася напрыканцы XIX — пачатку XX ст.

Тэлеграфная № 3 — Пабудаваны напрыканцы XIX ст. Эклектыка.

Тэлеграфная № 5 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Эклектыка. Перабудаваны.

Тэлеграфная № 7 — Год пабудовы — 1884. Эклектыка.

Тэлеграфная № 8 — Банк. Пабудаваны напрыканцы XIX ст. Эклектыка. Перабудаваны. Захавалася ўязная брама, магчыма, канца XVIII ст.

Тэлеграфная № 14 — Год пабудовы — 1898. Эклектыка.

Тэлеграфная № 20 — Пабудаваны напрыканцы XIX ст. Эклектыка.

Тэлеграфная № 22 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Эклектыка. Пасля капрамонту.

Тэлеграфная № 22а — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Эклектыка.

Тэлеграфны завулак // Ganczarska+Podwałna, Rastenburger Str. — Узнік у канцы XVIII ст. як праезд да рэзідэнцыі.

Тэлеграфны завулак № 2 — Пабудаваны, магчыма, у першай палове XIX ст. Рысы позняга класіцызму.

Тэлеграфны завулак № 4 — Пабудаваны ў пачатку XX ст.

Тэлеграфны завулак № 15а — Дом гродзенскіх масонаў, «Приказ общественного призрения», Дом благотворительного общества, Polskie towarzystwo dobroczynności. Пабудаваны ў 1783–1785 гг., верагодна, архітэктарам Дж. Сака ў якасці асабістай рэзідэнцыі.

Тэльмана // Іванаўская, Hoowera, Neidenburger-Str. — Узнікненне вуліцы звязана з новаю забудоваю купца Іосіфа Фрумкіна.

Тэльмана № 4 — Дом купца Фрумкіна на Іванаўскай. Год пабудовы — 1856. Дабудаваны ў 1900 г. Частка будынка была разабрана ў сувязі з будоўляй крамы «Дзіцячы свет» па вул. Савецкай.

Тэльмана № 5 — Прэзідыум гродзенскай калегіі адвакатаў. Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Тэльмана № 6 — Былая яўрэйская гміна. Год пабудовы — 1900.

Тэльмана № 7 — Год пабудовы — 1900.

Тэльмана № 7а — Год пабудовы — 1900.

Тэльмана № 9 — Ленінскі РАУС горада Гродна. Год забудовы — 1905. Унікальны ўзор архітэктуры стылю мадэрн. Імя архітэктара невядома. Пры ўмове поўнай рэстаўрацыі будынка цяжка было б уявіць, што тут знаходзіц-

ца міліцэйскі пастарунак. У любым іншым еўрапейскім горадзе гэта быў бы шыкоўны гатэль.

Тэльмана № 10– Малебная школа; сядзіба НКУС. Год пабудовы — 1905.

Тызенгаўза плошча // Гарадніцкая плошча, Губернская плошча, Дварцовая плошча, Napoleona, Wołnosci, York-Platz, Леніна — Сфармавалася ў 1765–1785 гг. па праектным плане архітэктараў І. Мёзера і Дж. Сака. Адміністрацыйны і культурны цэнтр Гарадніцы. Падчас рэканструкцыі плошчы Леніна быў знесены флігель Дома адміністратара з тым, каб «падчас святочных першамайскіх і кастрычніцкіх дэманстрацый забяспечыць свабодны праход калонам працоўных каля трыбунаў і помніка Леніну…».

Палац Тызенгаўза, Губернатарскі дом і канцылярыя губернатара, губернскае праўленне Пабудаваны ў 1760–1770-я гады, як палац старосты гродзенскай эканоміі А. Тызенгаўза. Пазней належаў генералу Я. Сіверсу, князю Рэпніну, з пачатку XIX ст. быў рэзідэнцыяй губернатара. Зруйнаваны ў 1915 г.

Аляксандраўская царква — Узведзена ў 1872 г. у цэтры плошчы. Была разабрана ў 1938 г.

Стэла Свабоды — Пастаўлена ў 1924 г. у гонар ахвяраў бальшавізму. Знесена ў 1939 г.

Тызенгаўза № 1 — Адзін з будынкаў былой акружной лячэбніцы, аддзяленне мастацтва ГрДзУ. Пабудаваны ў 1895–1912 гг.

Тызенгаўза № 1а — Адзін з будынкаў былой акружной лячэбніцы, корпус ГрДзУ. Пабудаваны ў 1895–1912 гг.

Тызенгаўза № 2/2 — Дом адміністратара, Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР. Пабудаваны ў 1780 г. па праекце архітэктара Дж. Сака. Рэстаўраваны ў 1992 г. Помнік архітэктуры пераходнага перыяду ад барока да класіцызму. Уваходзіць у архітэктурны ансамбль Гарадніцы.

Тызенгаўза № 3 — Дом Бацюшкава, дом Наталлі Кажэўнікавай. Год пабудовы — 1893 г. Рэстаўраваны ў 1996 г.

Тызенгаўза № 3а — Пабудаваны ў 1898 г. як «двухпавярховы хлеў». У 1920-я гады перароблены ў даходны жылы дом. Рэстаўраваны ў 1996 г.

Тызенгаўза № 4 — Музычны флігель, музычная школа, «Крывая афіцына», тэатральная афіцына, Komenda Policji. Пабудавана ў 1780 г. па праекце Дж. Сака. У другой палове XIX ст. будынак належаў Х. Стральцу, які надбудаваў трэці паверх. Рэстаўраваны ў 1989 г.

Тызенгаўза № 4б — Дом лясной адміністрацыі; гродзенская беларуская школа. Пабудаваны ў 1770 г. па праекце І. Мёзера. У 1899–1915 гг. уваходзіў у комплекс акружной бальніцы. Прыклад архітэктуры барока.

Тызенгаўза № 5 — Казарма для кадэтаў. Пабудаваны ў 1765–1785 гг. Архітэктары І. Мёзер і Дж. Сака. Перабудаваны ў другой палове XIX ст. для Кантрольнай палаты. Рэстаўраваны ў 1989 г. па праекце В. Барсукова.

Тызенгаўза № 7 — Адзін з будынкаў былой акружной лячэбніцы, Навукова-даследчы цэнтр праблемаў рэсурсазбераж эння. Пабудаваны ў 1895–1912 гг.

Урыцкага // Златарская, Zlota, Палатская, Skarbowa, Zygmunta Wróbliewskiego, Gumbinner-Str. — Сфармавалася на пачатку XVI ст.

Урыцкага № 5 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Урыцкага № 8 — Год пабудовы — 1900. Эклектыка.

Урыцкага № 9 — **Малітоўная школа Кадыш.** Год пабудовы — 1885. Эклектыка.

Урыцкага № 10 — Год пабудовы — 1910. Эклектыка.

Урыцкага № 12 — Год пабудовы — 1911. Эклектыка.

Урыцкага № 13 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Урыцкага № 14 — Год пабудовы — 1910. Эклектыка.

Урыцкага № 14а — Год пабудовы — 1910. Эклектыка.

Урыцкага № 17 — Год пабудовы — 1910. Эклектыка.

Урыцкага № 17а — Год пабудовы — 1910. Эклектыка.

Урыцкага № 18 — Год пабудовы — 1892.

Урыцкага № 19 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Урыцкага № 20 — Год пабудовы — 1900.

Урыцкага № 21 — Год пабудовы — 1885. Эклектыка.

Урыцкага № 22 — Год пабудовы — 1923. Эклектыка.

Урыцкага № 23 — Год пабудовы — 1890. Эклектыка.

Урыцкага № 24 — Год пабудовы — 1923. Эклектыка.

Урыцкага № 25 — Год пабудовы — 1901.

Урыцкага № 26 — Год пабудовы — 1863. У 1920-х гадах перабудаваны ў гарадскі шпіталь.

Цагляная // На месцы былога маёнтка Заверскіх.

Цагляная № 10 — Драўляны. Высокамастацкі прыклад канструктывізму.

Цагляны завулак

Цагляны завулак № 3 — Драўляны. Высокамастацкі прыклад канструктывізму.

Цагляны завулак № 8 — Драўляны канструктывізм.

Цагляны завулак № 9 — Тыпавая віла 1930-х гадоў.

Церашковай

Церашковай № 29 — Маёнтак Станіславова, саўгас Станіславова, аграрны універсітэт. Пабудаваны ў 1760–1770-я гады архітэктарам Дж. Сака як загарадная рэзідэнцыя караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Ансамбль уключаў сядзібны дом, два флігелі, гаспадарчыя пабудовы, парк. У планіроўцы ансамбля захаваліся элементы рэгулярнасці. Уласнасць генерала Рубана, князёў Друцкіх-Любецкіх.

Помнік Івану Уладзіміравічу Мічурыну (1855–1935) — Устаноўлены перад уваходам у палац.

Ціміразева // Станіславова — У 1886 г. пры будаўнічых працах каля вул. Станіславоўскай быў знойдзены зуб маманта.

Ціміразева № 11 — Гарадскі заапарк. Узнікненне заалагічнага парку ў Гродне звязана з імем выкладчыка гімназіі імя А. Міцкевіча Яна Каханоўскага. Пры дапамозе Таварыства аматараў прыроды гарадская рада ў верасні 1929 г. перадала пад заапарк велатрэк па вуліцы Станіслаўскай. У 1937 г. за 13 тысяч злотых гарадская рада набыла для заапарку наступныя паўгектара зямлі з уладанняў князёў Друцкіх-Любецкіх. У гады фашыстоўскай акупацыі заапарк быў разбураны, а лепшыя экземпляры жывёлаў немцы вывезлі ў Кёнігсберг. Аднавіў сваю працу згодна з пастановай гродзенскага аблвыканкама ад 12 снежня 1944 г. У 1953 г. кандыдат батанічных навук Н. Іофэ запрапанаваў заапарку дэманстраваць марскіх рыб, прыстасаваных да жыцця ў прэсных водах, а ўжо праз два гады ў гродзенскім заапарку з'явіўся слон, які заняў вальеры, прыстасаваныя раней для малпаў. На 2003 г. у заапарку утрымлівалася каля 3,5 тысячы жывёлаў больш за 300 розных пород. У 2004–2007 гг. да заапарку была далучана частка былой пусткі, на якой размясціліся новыя карпусы. У выніку рэканструкцыі, аднак, была знішчана закладзеная яшчэ ў 1920-я гады алея Любові, якая аддзяляла старую і новую часткі заапарку, а сам заапарк перапланаваны.

Чкалава // Zwirki, Sudstr. III-Sudstr. IV — Узнікла на месцы былых цагельных кар'ераў. У 1920–1930-я гады тут знаходзілася гэтак званая «настаўніцкая калонія».

Чкалава № 5 — Драўляны. Стыльны прыклад канструктывізму.

Чкалава № 6 — Драўляны. Стыльны прыклад канструктывізму.

Чкалава № 7 — Мураваны.

Чкалава № 8 — Драўляны. Стыльны прыклад канструктывізму.

Чкалава № 11 — Драўляны. Стыльны прыклад канструктывізму.

Чкалава № 13 — Драўляны.

Чырвонаармейская // Пецярбургская, Kolejowa, Narbutta, Kanoneweg, Красноармейская

Чырвонаармейская № 3 — Санітарная станцыя, Stacja sanitarna, зубапратэзная майстэрня, відэасалон. Пабудавана пры мясным — старым Скідальскім рынку на пачатку XX ст. «Рэканструявана» ў 2005 г. новым уласнікам са зносам арыгінальнай будоўлі.

Чырвонаармейская № 7 — Былы скідальскі рынак. Аўтавакзал. Год пабудовы — 1962. Паводле А. Госцева, рынак побач з аўтавакзалам заставаўся да 1972 г.

Чырвонаармейская № 11/11 — Вайсковыя казармы 102-га пяхотнага Вяцкага палка, Вяцкія казармы. Пабудаваны у 1886 г. Складаліся з 9 карпусоў. Будова казармаў абышлася ў 650 000 руб. У часы нямецкай акупацыі ў 1941–1944 гг. знаходзіўся лагер смерці.

Чырвонаармейская № 92 — Станіславоўскія кафельныя майстэрні. У канцы XIX — першай палове XX ст. тут выраблялася высокай якасці кафля з распрацаваным па тагачаснай модзе дэкорам і складанымі дэталямі для шыкоўных печаў. Некалькі ўзораў станіславоўскай кафлі і да сённяшняга дня ўпрыгоўжваюць фасад былой майстэрні.

Чырвонапартызанская // Лабенская, Навадворская, Мельничная, Mlynarska, Gartenstr.

Чырвонапартызанская № 1 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Тыповы прыклад местачковай забудовы.

Чырвонапартызанская № 5 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Тыповы прыклад местачковай забудовы.

Чырвонапартызанская № 8 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Тыповы прыклад местачковай забудовы.

Чырвонапартызанская № 11 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Тыповы прыклад местачковай забудовы.

Чырвонапартызанская № 12 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Тыповы прыклад местачковай забудовы.

Чырвонапартызанская № 26 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Тыповы прыклад местачковай яўрэйскай крамкі. У стадыі разбурэння.

Чырвонапартызанская № 35 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Тыповы прыклад местачковай забудовы.

Чырвонапартызанская № 37 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Тыповы прыклад местачковай забудовы.

Чырвонапартызанская № 43 — Пабудаваны ў пачатку XX ст. Тыповы прыклад местачковай забудовы.

Шчаснага

Месца гібелі Міхаіла Курбатава — Удзельнік баёў за Гродна ў ліпені 1944 г. У 1965 г. на месцы яго гібелі ўсталявана мемарыяльная дошка.

Шчаснага № 6 — Год пабудовы — 1925. Цагляная эклектыка з прыгожым фасадам.

Навуковае выданне

Лялевіч Янка,
Трусаў Ігар,
Чарнякевіч Андрэй

Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна


гісторыка-архітэктурны
энцыклапедычны даведнік

Рэдактар *Аляксандр Гарусаў*
Карэктар *Лідзія Карамазава*

Падпісана ў друк з арыгінала-макета заказчыка 17.03.2008. Фармат 60х84 1/16.
Папера афсетная. Афсетны друк. Гарнітура Times New Roman.
Ум. друк. арк. 5,75. Ул.-выд. арк. 4,5. Наклад 300 асоб.

Выдавецтва ТАА «Лімарыус». 220030, г. Мінск, вул. Стралковая, 14.
ЛВ № 02330/0056933 ад 30.04.2004 г.

Надрукавана УП «Дызапрэс-студыё». 220034, г. Мінск, вул. Платонава, 10-8.
ЛП № 02330/0056879 ад 30.04.2004 г.



ISBN 978-985-6740-80-3